Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый
Кафедра тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры
____________В.А.Касап
___ ____________2017 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта
______________М.А.Яцэвіч
___ ____________2017 г.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# БІБЛІЯТЭЧНА-БІБЛІЯГРАФІЧНАЕ КРАЯЗНАЎСТВА

для спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная
дзейнасць (па напрамках)

Складальнікі:
І.М. Стрыжонак, дацэнт
В.І. Саітава, кандыдат педагагічных навук, дацэнт

Разгледжана і рэкамендавана на пасяджэнні Савета ўніверсітэта
19.09.2017 г.
пратакол № 1

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Складальнікі**

*І. М. Стрыжонак,* дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"
*В. І. Саітава,* прафесар кафедры тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**Рэцэнзенты:**

*Вучоны савет* Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі
*В. М. Бігеза,* дацэнт кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"

**Разгледжаны і рэкамендаваны да зацвярджэння:**

*кафедрай* тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол ад 23 чэрвеня 2017 № 11);
*Саветам* факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"
(пратакол ад 29 чэрвеня 2017 № 10 )

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ

1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА 4
2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ 5
3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ 110
3.1 Тэматыка семінарскіх, практычных і лабараторных заняткаў 110
3.2 Метадычныя парады да семінараў 110
3.3 Метадычныя парады для выканання курсавой работы 111
4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ 113
4.1 Пералік пытанняў па тэмах семінарскіх, практычных і лабараторных заняткаў 113
4.2 Заданні для кантралюемай самастойнай работы 137
4.3 Графік кантролю за самастойнай работай студэнтаў 150
4.4 Умовы выкарыстання рэйтынгавай сістэмы 152
4.5 Пералік тэарэтычных пытанняў па вучэбнай дысцыпліне “Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства” да экзамену 153
4.6 Тэмы курсавых работ 156
4.7 Тэмы дыпломных і магістарскіх работ 156
4.8 Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў 157
5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ 159
5.1 Вучэбная праграма 159
5.2 Вучэбна-метадычная карта дысцыпліны для студэнтаў ФІДК 166
5.3 Вучэбна-метадычная карта вучэбнай дысцыпліны для ФЗН-4 169
5.4 Вучэбна-метадычная карта вучэбнай дысцыпліны для ФЗН-5 170
5.5 Раздзел І. “Бібліятэчнае краязнаўства”. Асноўная літаратура 171
5.6 Дадатковая літаратура 172
5.7 Раздзел ІІ. “Бібліяграфічнае краязнаўства”. Асноўная літаратура 175
5.8 Дадатковая літаратура 175
5.9 Электронныя адукацыйныя рэсурсы 178

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Актуальнасць вывучэння дысцыпліны “Бібліятэчна-бібліяграфічнае краяз7наўства” абумоўлена неабходнасцю засваення студэнтамі прафесійных ведаў, уменняў і навыкаў па краязнаўчай дзейнасці, якую вядуць бібліятэкі ўсіх тыпаў і відаў. Вучэбная дысцыпліна з'яўляецца абавязковай для падрыхтоўкі бібліятэкараў-бібліёграфаў вышэйшай кваліфікацыі. Яна распрацавана ў адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках).

Мэтай вучэбнай дысцыпліны “Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства” з'яўляецца вывучэнне студэнтамі тэарэтыка-метадалагічных, арганізацыйных, метадычных і тэхналагічных пытанняў краязнаўчай дзейнасці бібліятэк; фарміраванне уменняў і навыкаў па стварэнні і выкарыстанні краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў; засваенне бібліятэчна-бібліяграфічных формаў давядзення краязнаўчых ведаў да карыстальнікаў.

Мэтавая накіраванасць дысцыпліны абумоўлівае вырашэнне кола задач:

– засваенне тэрмінасістэмы бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства;

– асэнсаванне арганізацыйных асаблівасцей краязнаўчай дзейнасці бібліятэк;

– авалоданне тэхналогіяй і методыкай формаў і працэсаў краязнаўчай дзейнасці бібліятэкі.

У склад ЭВМК па вучэбнай дысцыпліне ўключаны тэксты лекцый. У папяровым УМК, які знаходзіцца на кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці, тэксты лекцый адсутнічаюць. У ім змешчаны па пералікі практычных (лабараторных) работ і семінарскіх заняткаў, іх метадычныя распрацоўкі. Асаблівасцю значнай часткі практычных (лабараторных) работ з’яўляецца правядзенне іх ва ўмовах камп’ютарных класаў і магчымасць індывідуалізацыі заданняў. Пытанні да экзамену прапарцыянальна адлюстроўваюць матэрыялы па бібліятэчных і бібліяграфічных працэсах краязнаўчай дзейнасці. Паспяхова засвоіць змест, логіку і паслядоўнасць матэрыялу студэнтам дапамогуць вучэбная праграма і спісы асноўнай і дадатковай літаратуры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

СТРЫЖОНАК ІРЫНА МІХАЙЛАЎНА, САІТАВА ВАЛЯНЦІНА ІВАНАЎНА. **БІБЛІЯТЭЧНА-БІБЛІЯГРАФІЧНАЕ КРАЯЗНАЎСТВА.** Тэксты лекцый для студэнтаў ФІДК і ФЗН. Доступ праз БД “Труды преподавателей сотрудников, аспирантов, магистрантов и студентов БГУКИ”).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Складальнікі**

*І. М. Стрыжонак,* дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
*В. І. Саітава,* прафесар кафедры тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**Рэцэнзенты:**

*Вучоны савет* Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі
*В. М. Бігеза,* дацэнт кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

**Разгледжаны і рэкамендаваны да зацвярджэння:**
*кафедрай* тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол ад 23 чэрвеня 2017 № 11);
*Саветам* факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
(пратакол ад 29 чэрвеня 2017 № 10 )

# 1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Актуальнасць вывучэння дысцыпліны “Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства” абумоўлена неабходнасцю засваення студэнтамі прафесійных ведаў, уменняў і навыкаў па краязнаўчай дзейнасці, якую вядуць бібліятэкі ўсіх тыпаў і відаў. Вучэбная дысцыпліна з'яўляецца абавязковай для падрыхтоўкі бібліятэкараў-бібліёграфаў вышэйшай кваліфікацыі. Яна распрацавана ў адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках).

Мэтай вучэбнай дысцыпліны “Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства” з'яўляецца вывучэнне студэнтамі тэарэтыка-метадалагічных, арганізацыйных, метадычных і тэхналагічных пытанняў краязнаўчай дзейнасці бібліятэк; фарміраванне уменняў і навыкаў па стварэнні і выкарыстанні краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў; засваенне бібліятэчна-бібліяграфічных формаў давядзення краязнаўчых ведаў да карыстальнікаў.

Мэтавая накіраванасць дысцыпліны абумоўлівае вырашэнне кола задач:

– засваенне тэрмінасістэмы бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства;

– асэнсаванне арганізацыйных асаблівасцей краязнаўчай дзейнасці бібліятэк;

– авалоданне тэхналогіяй і методыкай формаў і працэсаў краязнаўчай дзейнасці бібліятэкі.

У складзе ЭВМК па вучэбнай дысцыпліне змешчаны тэксты лекцый, пералікі практычных (лабараторных) работ і семінарскіх заняткаў, іх метадычныя распрацоўкі. Асаблівасцю значнай часткі практычных (лабараторных) работ з’яўляецца правядзенне іх ва ўмовах камп’ютарных класаў і магчымасць індывідуалізацыі заданняў. Пытанні да экзамену прапарцыянальна адлюстроўваюць матэрыялы па бібліятэчных і бібліяграфічных працэсах краязнаўчай дзейнасці. Паспяхова засвоіць змест, логіку і паслядоўнасць матэрыялу студэнтам дапамогуць вучэбная праграма і спісы асноўнай і дадатковай літаратуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

СТРЫЖОНАК ІРЫНА МІХАЙЛАЎНА, дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый

САІТАВА ВАЛЯНЦІНА ІВАНАЎНА, прафесар кафедры тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый, дацэнт, кандыдат педагагічных навук, дацэнт

# БІБЛІЯТЭЧНА-БІБЛІЯГРАФІЧНАЕ КРАЯЗНАЎСТВА

Тэксты лекцый для студэнтаў ФІДК і ФЗН

ЗМЕСТ

Лекцыя 1. Сутнасць і структура краязнаўчай дзейнасці бібліятэк 8
Лекцыя 2. Арганізацыя краязнаўчай дзейнасці бібліятэк 17
Лекцыя 3. Спецыфіка краязнаўчага фонду бібліятэк 25
Лекцыя 4. Фарміраванне краязнаўчага фонду бібліятэк розных тыпаў і відаў 32
Лекцыя 5. Карыстальнік бібліятэкі як аб'ект і суб'ект краязнаўчай дзейнасці 44
Лекцыя 6. Арганізацыя абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэкі па краязнаўстве 52
Лекцыя 7. Тэарэтычныя пытанні бібліяграфічнага краязнаўства 58
Лекцыя 8. Краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны апарат бібліятэкі 70
Лекцыя 9. Агульныя асаблівасці методыкі бібліяграфавання краязнаўчых дакументаў 84
Лекцыя 10. Краязнаўчыя бібліяграфічныя і фактаграфічныя выданні 93

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Лекцыя 1. **СУТНАСЦЬ І СТРУКТУРА КРАЯЗНАЎЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ БІБЛІЯТЭК**

**<u>Пытанні:</u>**

**1. Краязнаўства. Аб’ект, прадмет, формы арганізацыі.**

**2. Бібліятэчнае краязнаўства — самастойная галіна бібліятэчнай дзейнасці і комплексная тэарэтыка-прыкладная дысцыпліна.**

**3. Краязнаўчае бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства — тэарэтычнае ядро бібліятэчнага краязнаўства.**

**4. Краязнаўчая дзейнасць бібліятэкі як базавая падсістэма бібліятэчнага кразнаўства.**

<u>Мэта:</u> вывучэнне студэнтамі тэарэтыка-метадалагічных пытанняў бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства.

## Пытанне 1. Краязнаўства. Аб’ект, прадмет, формы арганізацыі

Сёння краязнаўства знаходзіцца на ўздыме, які абумоўлены адраджэннем беларускай гісторыі, культуры, мовы, узрастаннем цікавасці да мінулага, сваіх каранёў, да пазнання "малой Радзімы". Уздым нацыянальнай самастойнасці, узнікненне шматлікіх краязнаўчых таварыстваў, стварэнне новых этнаграфічных, краязнаўчых, мемарыяльных музеяў і актывізацыя тых, што ўжо існуюць, пашырэнне кола клубаў, гасцёўняў, гурткоў — усе гэта стварае ўмовы для актывізацыі краязнаўства на Беларусі. Грамадскія патрэбы ў краязнаўчай інфармацыі задавальняюць не толькі архівы і музеі, але і бібліятэкі — найбольш даступныя сацыяльныя інстытуты. Дзейнасць бібліятэкі цесна звязана з усімі формамі і кірункамі краязнаўства, а ўвесь комплекс работ бібліятэк у галіне краязнаўства параўнальна нядаўна атрымаў у прафесійнай лексіцы такі тэрмін як бібліятэчнае краязнаўства.

У тэорыі і практыцы краязнаўчай сферы бібліятэчнай дзейнасці прыярытэтнае развіццё атрымалі бібліяграфічныя аспекты. Расійскія бібліяграфазнаўцы Н.В. Здобнаў, А.В. Мамантаў, Н.Н. Шчэрба, А.І. Коган, А.М.Маслава, І.І.Міхліна і іншыя вывучалі відавыя і метадычныя асаблівасці краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі, краязнаўчага даведачна-бібліяграфічнага апарату (КДБА) бібліятэк, бібліяграфічнага абслугоўвання па краязнаўстве і інш. Але пытанні тэорыі, методыкі і арганізацыі бібліятэчнага краязнаўства, вызначэнне яго сутнасна-функцыянальнай структуры на сённяшні дзень з’яўляюцца найбольш слаба тэарэтычна і метадычна распрацаванымі. Пытанні бібліятэчнага краязнаўства разглядаюцца ў працах такіх аўтарытэтных спецыялістаў як Н.В. Здобнаў, О.І. Талалакіна, А.В. Мамантаў, Н.Н. Шчэрба, Н.Н. Кушнарэнка, Н.Ф. Гарбачэўская, А.І. Коган, Т.М. Сомавай, С.М. Крывароценка, Т.А. Няверавай і іншых. Але гэта, у асноўным, аналіз асобных з’яў, праблем, кірункаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліятэчнага краязнаўства. Канцэптуальна абгрунтаваных работ па гісторыі, тэорыі, методыцы або арганізацыі бібліятэчнага краязнаўства пакуль што няма. У лекцыі разглядаецца шэраг пытанняў бібліятэчнага краязнаўства як часткі агульнага краязнаўства і як сістэмнага ўтварэння, структура якога складаецца з базавай (практычнай) падсістэмы і вытворных ад яе інфраструктурных відаў дзейнасці.

Краязнаўства — гэта вывучэнне насельніцтвам на навуковай аснове гістарычных, палітычных, сацыяльна-эканамічных, геаграфічных, культурных, прыродных і шэрагу іншых фактараў, якія характарызуюць у комплексе фарміраванне і развіццё якой-небудзь пэўнай тэрыторыі краіны (сяла, горада, раёна, вобласці). [1] Тэрмін "краязнаўства" разглядаецца як комплекс навуковых дысцыплін і ўсебаковае вывучэнне краю мясцовымі жыхарамі, а таксама і як грамадскі рух, які аб'ядноўвае мясцовае насельніцтва. Прадметам пазнання ў краязнаўстве з'яўляецца тэрыторыя, мясцовасць, што вызначаецца паняццем "родны край". Памеры паняцця "край" залежаць ад тыпа, віда, задач, профіля бібліятэкі, краязнаўчых запытаў яе карыстальнікаў, штату бібліятэчных супрацоўнікаў, матэрыяльна-тэхнічнай базы, магчымасцей каардынаванага фарміравання і ўзаемавыкарыстання краязнаўчых рэсурсаў бібліятэк края. Кожная бібліятэка акрэслівае тэрытарыяльныя межы свайго краю. Для абласной бібліятэкі краем з'яўляецца тэрыторыя вобласці, для раённай – раёна, для гарадской – свой горад, для сельскай – сяло, у межах якіх ажыццяўляецца іх дзейнасць. Але пры неабходнасці тэрытарыяльныя рамкі (межы края) краязнаўчай дзейнасці бібліятэк могуць быць пашыраны з улікам прыродных, экалагічных, гістарычных і іншых асаблівасцей. Такім чынам, край – канкрэтная частка дзяржавы, якая звычайна супадае з адзінкай сучаснага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення (вобласць, раён, горад) і вызначаецца з улікам змяненняў гістарычных межаў, а таксама фізіка-геаграфічных, прыродна-кліматычных, геалагічных, эканамічных і іншых крытэрыяў раяніравання.[2] У практыцы бібліятэкі ўдакладняюць межы края для бібліятэчнага краязнаўчага фонда, каталога, бібліяграфічнага дапаможніка, выставы і г.д. – з ўлікам мэт кожнага віда і формы дзейнасці. І ў кожным выпадку, вызначаючы межы края, бібліятэка фіксуе прынятае рашэнне ў картатэку метадычных рашэнняў або ў іншых дакументах, каб пазбегнуць памылак і забяспечыць пераемнасць рашэнняў.

[1] Историческое краеведение Белоруссии. – Мінск, 1980. – С.3.
[2] Палажэнне аб краязнаўчай рабоце бібліятэк Рэспублікі Беларусь. – Мінск, 1993. – С.1.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Краязнаўства набыло выразны сацыяльны характар; традыцыйна выконвае выхаваўчыя, рекрэацыйныя, асветніцкія функцыі і актыўна садзейнічае навуковай і вытворчай дзейнасці.

Аб’ектам вывучэння краязнаўства з’яўляецца прырода, насельніцтва, гаспадарка, гістарычнае мінулае, мастацтва, культура і інш. Усе гэтыя аб’екты вывучаюцца рознымі навукамі, пры гэтым выкарыстоўваюцца розныя метады даследаванняў. Ва ўсіх напрамках краязнаўчай дзейнасці мае месца агульны **прадмет** вывучэння – **край.** <u>Напрамкі вывучэння края:</u>

1. Усебаковае вывучэнне прыроды і прыродных каштоўнасцей (зямныя, недры, рэльеф, глеба, клімат, расліны), экалагічных умоў.
2. Вывучэнне народнай гаспадаркі, выяўленне новых крыніц сыравіны і дадатковых рэсурсаў для эканомікі той або іншай мясцовасці.
3. Вывучэнне гістарычнага мінулага края (мясцовых радаводаў, ваенных падзей і інш.)
4. Вывучэнне нацыянальных, этнаграфічных асаблівасцей, а таксама антрапалагічнага, этнічнага, канфесійнага складу мясцовага насельніцтва.
5. Улік і абарона помнікаў архітэктуры і культуры, вывучэнне вуснай народнай творчасці, дыялектаў, мастацкіх промыслаў края.

Існуюць наступныя **формы арганізацыі краязнаўства**: дзяржаўная, грамадская, школьная, каапературыўна-камерцыйная, асобна-ініцыятыўная.

**Дзяржаўнае** краязнаўства гэта: вывучэнне края мясцовымі гаспадарнымі органамі (яны маюць дакументальныя і статыстычныя матэрыялы па эканоміцы і культуры вобласці, раёна, горада…); вывучэнне края дзяржаўнымі ўстановамі: навукова-даследчыя інстытуты, адзяленне і філіялы АН РБ, вопытныя сельскагаспадарчыя станцыі; дзейнасць краязнаўчых музеяў ("Рэчавая энцыклапедыя края"). Іх функцыі: збіраць, вывучаць і папулярызаваць гістарычныя помнікі, творы мастацтва; ствараць экспазіцыі, якія прысвечаны прыродным каштоўнасцям і эканоміцы края; ствараць каталогі, даведнікі, пуцевадзіцелі, тэматычныя зборнікі навуковых прац. Мясцовыя выдавецтвы, абласныя кнігагандлі і кніжныя магазіны спрыяюць распаўсюджванню і папулярызацыі краязнаўчай літаратуры.

**Грамадскае** краязнаўства развіваецца па ініцыятыве аматараў краязнаўства. На сучасным этапе ствараецца многа краязнаўчых грамадскіх арганізацый, якія зарэгістраваны ў розных установах (музеях, бібліятэках, дамах культуры і інш.)

У межах **школьнага** краязнаўства вучні розных класаў вывучаюць свой край у час вучэбных заняткаў, у гуртках і школьных музеях, на экскурсіях, у турысцкіх паходах. Сустракаюцца з мясцовымі краязнаўцамі, удзельнічаюць у вечарынах, конкурсах, алімпіядах па краязнаўстве. Акрамя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

таго, краязнаўчы матэрыял займае асаблівае месца ў выкладанні шэрагу дысцыплін: гісторыі, геаграфіі, літаратуры.

### 2. Бібліятэчнае краязнаўства — самастойная галіна бібліятэчнай дзейнасці і комплексная тэарэтыка-прыкладная дысцыпліна

**Бібліятэчнае краязнаўства** ўзнікла на падставе бібліятэчнай і краязнаўчай дзейнасці ў межах бібліятэчнага сацыяльнага інстытута. Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства – адносна самастойная вобласць бібліятэчнай дзейнасці, накіраваная на задавальненне краязнаўчых патрэб грамадства сродкамі бібліятэк. "Бібліятэчнае краязнаўства" выкарыстоўваецца як абагульняючы тэрмін:

1) для азначэння ўсёй краязнаўчай сферы бібліятэчнай дзейнасці (у гэтым сэнсе бібліятэчнае краязнаўства — гэта вобласць бібліятэчнай дзейнасці, накіраваная на задавальненне краязнаўчых патрэб сродкамі бібліятэк);

2) бібліятэчнае краязнаўства разумеецца як міждысцыплінарны навуковы кірунак у структуры бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства. Гэта комплексная тэарэтыка-прыкладная дысцыпліна, якая ўзнікла і развіваецца на стыку краязнаўчай бібліятэчнай і бібліяграфічнай дзейнасці.

Бібліятэчнае краязнаўства ўзнікла, калі з’явілася патрэба грамадства, сацыяльных груп, асоб у ведах, інфармацыі, дакументах аб вызначаным краі (або мясцовасці). Яго станаўленне і развіццё ажыццяўляецца ў межах бібліятэчнага сацыяльнага інстытута і адлюстроўвае ўнутраную структуру бібліятэчнай справы як базавай галіны і ўключае сферу практыкі, навукі, адукацыі, кіравання і друку. Такім чынам, бібліятэчнае краязнаўства ўяўляе сабой сістэмнае ўтварэнне, якое мае сваю <u>сутнасна-функцыянальную структуру</u>, у якую ўваходзяць базавая (практычная) падсістэма – краязнаўчая дзейнасць бібліятэкі і вытворныя ад яе інфраструктурныя віды дзейнасці: навукова-даследчая, вучэбна-выхаваўчая і арганізацыйна-кіруючая. Вось гэтыя інфраструктурныя падсістэмы "выходзяць" за межы бібліятэк, асноўнага звяна, цэнтра бібліятэчнага краязнаўства і лакалізуюцца, акрамя бібліятэк, у вышэйшых навучальных установах, вучылішчах, міністэрствах, упраўленнях культуры і г.д. На бібліятэчнае краязнаўства, як комплексную сферу бібліятэчнай справы, уплывае ўзровень развіцця яе тэорыі, гісторыі, методыкі і арганізацыі, бібліятэчнае краязнаўства выкарыстоўвае яе найбольш аптымальныя сродкі і формы дзейнасці. У межах бібліятэчнага інстытута сфарміраваліся аб’ект і суб’ект бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства. <u>Аб’ект</u> бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства — бібліятэка, яе дакументныя і бібліяграфічныя краязнаўчыя рэсурсы, кадры, матэрыяльна-тэхнічная база, органы кіравання. <u>Суб’ектам</u> бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства выступае <u>мясцовая публічная бібліятэка</u> (абласная, раённая, гарадская,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сельская), якая знаходзіцца на тэрыторыі вызначанага края і выконвае адносна яго краязнаўчую функцыю.

Такая публічная бібліятэка выконвае краязнаўчую функцыю з улікам асаблівасцей гісторыі, эканомікі, прыроды, навукі, эканомікі, культуры, сацыяльнага жыцця края; ажыццяўляе збор, захаванне і шырокі доступ насельніцтва да краязнаўчых дакументаў і інфармацыі аб іх.

Краязнаўчая дзейнасць уваходзіць ва ўсе напрамкі і віды дзейнасці мясцовай публічнай бібліятэкі незалежна ад яе арганізацыйнай структуры. Публічная бібліятэка можа быць і аб’ектам краязнаўчай дзейнасці, краязнаўства вывучае ўсю сістэму бібліятэк края, а таксама асобную бібліятэку як духоўны і матэрыяльны аб’ект мясцовай культуры. Бібліятэчнае краязнаўства ўваходзіць у метасістэму "краязнаўства" як яе частка, таму краязнаўства "дэлегіруе" бібліятэчнаму краязнаўству свой краязнаўчы змест, структуру галіны, фарміруе краязнаўчыя патрэбнасці грамадства, якія бібліятэка дакументальна і інфармацыйна забяспечвае, фарміруе краязнаўчыя фонды, стварае бібліяграфічныя і фактаграфічныя базы даных аб краі, ажыццяўляе бібліятэчна-бібліяграфічныя і небібліятэчныя паслугі па краязнаўстве.

На бібліятэчнае краязнаўства ўплываюць наступныя асаблівасці краязнаўства:

1. Краязнаўчая дзейнасць уваходзіць у розныя галіны ведаў, прафесіі, установы, арганізацыі, у дзейнасць спецыялістаў розных профіляў — усё гэта ўплывае на комплексны характар бібліятэчнага краязнаўства.

2. Узаемазвязаныя прыметы краязнаўства (прасторавы і змястоўны) патрабуюць дакладнага азначэння змястоўна-тэрытарыяльных меж "свайго" краю ў краязнаўчай сферы бібліятэчнай дзейнасці.

3. Краязнаўства мае няпоўную сутнасна-функцыянальную структуру, у якой лепш сфарміраваліся падсістэмы навукі і практыкі, падструктуры адукацыі і кіравання яшчэ дакладна не вызначаны. Усё гэта ўплывае на бібліятэчнае краязнаўства, з аднаго боку, гэта выклікае незапатрабаванасць асобных напрамкаў бібліятэчнага краязнаўства; з другога боку — вядзе да пашырэння "поля" краязнаўчага ўздзеяння бібліятэк у дзяржаўным і грамадскім сектары краязнаўства, на тэрыторыі края наогул.

4. Ідзе працэс фарміравання патока краязнаўчых дакументаў не толькі ў краі, але і за яго межамі, што ўскладняе дзейнасць бібліятэкі па выяўленні, набыцці і фарміраванні краязнаўчага фонда. Пры адсутнасці гэтых дакументаў ці бібліяграфічных звестак аб іх зніжаецца якасць бібліятэчнага абслугоўвання і прэстыж мясцовай публічнай бібліятэкі як цэнтра бібліятэчнага краязнаўства.

5. Краязнаўчыя патрабаванні канцэнтруюцца ў гэтым краі, а не ў іншых рэгіёнах краіны, што прымушае мясцовыя публічныя бібліятэкі з асобай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адказнасцю адносіцца да забеспячэння паўнаты збора і якасці адбора, захавання і прадстаўлення краязнаўчых дакументаў, а таксама інфармацыі аб іх.

Асноўныя задачы бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства:

1. Стварэнне банка даных краязнаўчых і мясцовых дакументаў. Выяўленне, устанаўленне месцазнаходжання, набыццё і забеспячэнне бібліяграфічнага апісання дакументаў, стварэнне базы даных бібліяграфічнай і фактаграфічнай краязнаўчай інфармацыі.

2. Бібліяграфічнае раскрыццё зместу краязнаўчых дакументаў незалежна ад месца іх захоўвання: арганізацыя даведачна-бібліяграфічнага апарату, стварэнне крыніц бібліяграфічнай інфармацыі.

3. Давядзенне да карыстальнікаў краязнаўчых і мясцовых дакументаў і інфармацыі аб іх з дапамогай бібліятэчна-бібліяграфічных сродкаў.

4. Распаўсюджванне інфармацыі аб краязнаўчых і мясцовых дакументах і краязнаўчых ведаў сярод насельніцтва, а таксама рэкламіраванне краязнаўчых збораў і інфармацыйных магчымасцяў сваіх бібліятэк.

Пералічаныя задачы даюць падставы для вызначэння краязнаўчай функцыі мясцовых публічных бібліятэк (абласной, раённай, гарадской, сельскай), якія ў агульнадзяржаўнай бібліятэчнай сістэме маюць асаблівую сферу адказнасці, — краязнаўчую дзейнасць.

Краязнаўчая работа ажыццяўляецца бібліятэкай і ў бібліятэцы, што вызначае **два кірункі** ў бібліятэчным краязнаўстве:

I. Дзейнасць бібліятэк па такіх напрамках: выяўленне, набыццё ў фонд дакументаў, якія па зместу звязаны з краем, іх захаванне і папулярызацыя; стварэнне сістэмы каталогаў, картатэк, бібліяграфічных паказальнікаў на краязнаўчы фонд; краязнаўчае бібліятэчна-бібліяграфічнае абслугоўванне; метадычнае забеспячэнне іншых бібліятэк і інш. У межах гэтага кірунку бібліятэка ўсе свае намаганні накіроўвае на тое, каб знайсці і прадставіць чытачу краязнаўчы матэрыял, стварыць яму камфортныя ўмовы.

II. Вывучэнне роднага краю, пошук новых матэрыялаў аб’яднаннямі краязнаўцаў, якія існуюць пры бібліятэцы. Бібліятэка ў гэтым выпадку з’яўляецца спонсарам, які прапанаваў сваё памяшканне і ажыццяўляе інфармацыйнае, бібліяграфічнае, метадычнае забеспячэнне пытанняў, якія распрацоўваюцца асабіста або калектыўна. Разам з тым усё больш бібліятэкараў вядуць даследчую работу па краязнаўстве, вынікам якой з'яўляюцца публікацыі, выступленні на навуковых канферэнцыях і інш. Гэты кірунак бібліятэчнага краязнаўства арыентаваны на атрыманне новых ведаў, першасных дакументаў, артыкулаў, тэзісаў, дакладаў і г.д.

## Пытанне 3. Краязнаўчае бібліятэказнаўства — тэарэтычнае ядро бібліятэчнага краязнаўства

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Зараз ідзе працэс актыўнага назапашвання навуковых ведаў аб краязнаўчай сферы бібліятэчнай дзейнасці, якія фарміруюцца ў комплексную тэарэтыка-прыкладную дысцыпліну — бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства.

Прадметам гэтай навуковай дысцыпліны выступае краязнаўчая бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць як спецыфічная сістэма.

Структура бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства складаецца з такіх навуковых дысцыплін: тэорыя, гісторыя, методыка і арганізацыя бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства; галіновае бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства (экалагічнае, літаратурнае, эканамічнае і інш.) Але структура гэтая прыкладная, ідзе працэс фарміравання ўнутранай структуры і знешніх контураў бібліятэчна-бібліяграфічага краязнаўства. Друкаваныя матэрыялы вынікаў даследаванняў бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства можна знайсці на старонках часопісаў базісных дысцыплін.

Яшчэ толькі пачаўся працэс назапашвання спецыяльных ведаў па бібліятэчным краязнаўстве; рыхтуюцца кадры для новай навукі.

**Тэарэтычным ядром** бібліятэчнага краязнаўства вызначаны: краязнаўчае бібліятэказнаўства і краязнаўчае бібліяграфазнаўства. Яны ствараюць сістэматызаваныя веды аб законах і заканамернасцях шматграннай практычнай дзейнасці бібліятэк з першаснымі і другаснымі краязнаўчымі і мясцовымі дакументамі.

Краязнаўчае бібліятэказнаўства, як тэарэтычнае ядро бібліятэчнага краязнаўства, прадстаўляе сабой сістэму ведаў аб мясцовай публічнай бібліятэцы, аб прынцыпах, законах і законамернасцях практычнай краязнаўчай дзейнасці бібліятэк, накіраванай на збор, захаванне і прадстаўленне ў грамадскае карыстанне краязнаўчых дакументаў, а таксама інфармацыі аб іх. Прадмет краязнаўчага бібліятэказнаўства – бібліятэка як суб’ект і аб’ект краязнаўчай дзейнасці.

Краязнаўчае бібліяграфазнаўства адна са складаючых бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства. Прадметам гэтай навукі з'яўляецца краязнаўчая бібліяграфія як від, яе функцыянальныя, тэарэтычныя, арганізацыйныя і метадычныя асаблівасці. У межах бібліятэчнага сацыяльнага інстытута краязнаўчая бібліяграфічная дзейнасць непарыўна звязана з задачамі, функцыямі, кірункамі дзейнасці бібліятэк і спрыяе іх эфектыўнай рэалізацыі. Бібліяграфічнымі сродкамі ў бібліятэках ствараюцца інфармацыйна-пошукавыя сістэмы па краязнаўстве, якія забяспечваюць карыстальнікам зручны доступ да краязнаўчых дакументаў і ведаў. Краязнаўчыя бібліяграфічныя рэсурсы бібліятэкі і метады, са свайго боку, актыўна ўплываюць на бібліятэчныя формы краязнаўчай работы і спажыўцоў інфармацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Бібліятэчнае краязнаўства як навуковая дысцыпліна цесна звязана з такімі навукамі як бібліяграфія, бібліятэчная педагогіка, бібліятэчная статыстыка.

Бібліятэчнае краязнаўства паступова пачынае распрацоўваць уласныя прынцыпы і правілы і становіцца прыярытэтнай вобласцю дзейнасці бібліятэк рэгіянальнага ўзроўню.

Узнікае патрэбнасць у абагульненні практычнага вопыту, распрацоўцы яго тэарэтычных асноў, гісторыі, методыкі, арганізацыі, падрыхтоўцы кадраў для сферы краязнаўства, арганізацыі кіравання, развіцця прафесійнага друку. Бібліятэчнае краязнаўства яшчэ не стала цэласнай сістэмай, канчаткова не сфарміравалася яго сутнасна-функцыянальная структура, у якой найбольшае развіццё атрымала практычная падсістэма – краязнаўчая дзейнасць бібліятэк (КДБ), а падструктуры навукі, адукацыі, кіравання і друку яшчэ знаходзяцца ў стадыі самавызначэння.

## 4. Краязнаўчая дзейнасць бібліятэкі як базавая падсістэма бібліятэчнага кразнаўства

Краязнаўчая дзейнасць – гэта **базавая** (практычная) падсістэма бібліятэчнага краязнаўства.

Краязнаўчая бібліятэчная практыка валодае якасцямі даследчай працы, таму яе можна кваліфіцыраваць як вобласць не толькі практычнай, а і навукова-практычнай дзейнасці. У гэтым выпадку краязнаўчая дзейнасць бібліятэкі вызначаецца як вобласць навукова-практычнай дзейнасці бібліятэкі па збору, захаванню і прадстаўленню ў грамадскае карыстанне краязнаўчых дакументаў, а таксама інфармацыі аб іх. Краязнаўчую дзейнасць ажыццяўляюць практычна ўсе бібліятэкі рэгіянальнага ўзроўню, але ўзровень і кірункі гэтай дзейнасці розныя.

Галоўная звяном бібліятэчнага краязнаўства з’яўляюцца мясцовыя публічныя бібліятэкі (МПБ) – агульнадаступныя дзяржаўныя універсальныя навуковыя і масавыя бібліятэкі (абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія).

Тыпалагічным прыметам мясцовай публічнай бібліятэкі лічыцца тое, што яна збірае, захоўвае і выдае краязнаўчыя і мясцовыя дакументы і інфармуе аб іх. Краязнаўчая функцыя рэалізуецца ў тым, што МПБ надаюць прыярытэтнае значэнне фондастварэнню, бібліяграфічнаму інфармаванню і абслугованню абанентаў краязнаўчымі і мясцовымі дакументамі.

Праз краязнаўчую функцыю, з дапамогай разнастайных відаў і напрамкаў краязнаўчай дзейнасці МПБ рэалізуе сваё краязнаўчае прызначэнне па задавальненні краязнаўчых патрэбнасцей насельніцтва, абслугоўванню краязнаўства як вобласці навуковай і практычнай дзейнасці, стварэнню дакументнага і інфармацыйнага банка даных аб вызначаным краі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– "рэгіянальнай памяці", забеспячэнню гарантаванага доступа да іх карыстальнікаў.

Як сацыяльныя інстытуты, якія задавальняюць краязнаўчыя патрэбнасці грамадства, бібліятэкі маюць перавагу перад архівамі і музеямі, якія таксама ўваходзяць у сістэму дакументных камунікацый краязнаўства.

Асноўныя пераважаючыя моманты:

1. Паўната краязнаўчага фонда, універсальнасць яго складу і разнастайнасць тыпаў і відаў камплектуемых краязнаўчых дакументаў.
2. Прапанова насельніцтву разнастайнай бібліяграфічнай інфармацыі і паслуг па краязнаўстве.
3. Агульнадаступнасць мясцовых публічных бібліятэк.
4. Бібліятэка прапануе краязнаўчыя дакументы праз адкрыты доступ да фондаў, шляхам выдачы дакументаў на дом, стварэння краязнаўчага даведачна-бібліяграфічнага апарата і бібліяграфічных дапаможнікаў і інш.

Эфектыўнасць "краязнаўчай дзейнасці" бібліятэкі вызначаецца яе структурай. Краязнаўчая дзейнасць бібліятэк – гэта сукупнасць наступных **відаў** дзейнасці:

1. Фарміраванне краязнаўчага фонда.
2. Вядзенне краязнаўчых каталогаў і картатэк.
3. Стварэнне сістэмы краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў і баз даных.
4. Абслугоўванне карыстальнікаў краязнаўчымі і мясцовымі дакументамі.
5. Даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне і бібліяграфічнае інфармаванне.
6. Папулярызацыя краязнаўчых дакументаў.
7. Навукова-метадычная і навукова-даследчая работа ў галіне бібліятэчнага краязнаўства.
8. Арганізацыя і кіраванне гэтай дзейнасцю як у самой бібліятэцы, так у межах края і па-за яго межамі.

Сукупнасць гэтых відаў дзейнасці дазваляе разглядаць краязнаўчую дзейнасць як сістэму.

На сучасным этапе бібліятэкі выходзяць за межы самой бібліятэчнай дзейнасці і ўключаюцца ў сферу дзейнасці краязнаўчых суполак, аб’яднанняў, архіваў, музеяў, выдавецтваў і пачынаюць займацца краязнаўчай даследчай дзейнасцю.

Разнастайныя віды і формы дзейнасці бібліятэкі ў галіне краязнаўства можна выкарыстоўваць, калі яны садзейнічаюць выкананню бібліятэкай галоўнага бібліятэчнага віда дзейнасці, які мы класіфіцыравалі як

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

збор, захаванне і выдача ў грамадскае карыстанне краязнаўчых дакументаў шырокага сацыяльнага прызначэння, забеспячэнне інфармацыйна-бібліяграфічнага доступа да іх.

Такім чынам, краязнаўчая дзейнасць бібліятэкі (КДБ) мае комплексны характар, валодае дакладна вызначаным наборам відаў дзейнасці, мае ўнутранаю структуру і сувязь асноўных кампанентаў і падсістэм.

Краязнаўства як самастойная галіна бібліятэчнай дзейнасці патрабуе глыбокіх тэарэтычных, арганізацыйных і метадычных даследаванняў. Краязнаўчая арыентацыя ў дзейнасці публічных бібліятэк стала прыярытэтнай, што абумоўлена ростам грамадскай цікавасці да мясцовых праблем, працэсам гуманізацыі і гуманітарызацыі бібліятэчнай сферы, агульнанацыянальным значэннем дзейнасці бібліятэк рэгіянальнага ўзроўню па стварэнні дакументальных і інфармацыйных банкаў даных аб краі.

**Вывады:**

1. Краязнаўства мае выразны сацыяльны характар, выконвае шэраг функцый, мае аб'ект і прадмет вывучэння. Формы арганізацыі краязнаўства: дзяржаўная, грамадская, школьная, кааператыўна-камерцыйная, асобна-ініцыятыўная.

2. Бібліятэчнае краязнаўства ўзнікла на падставе бібліятэчнай і краязнаўчай дзейнасці ў межах бібліятэчнага сацыяльнага інстытута і з'яўляецца адносна самастойнай вобласцю бібліятэчнай дзейнасці, мае сваю сутнасна-функцыянальную структуру; аб'ект, суб'ект, задачы.

3. Тэарэтычным ядром бібліятэчнага краязнаўства з'яўляецца краязнаўчае бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства, якія прадстаўляюць сабой сістэму ведаў аб мясцовай публічнай бібліятэцы, аб прынцыпах, законах і заканамернасцях практычнай краязнаўчай дзейнасці бібліятэк; мае свой прадмет вывучэння, звязана з шэрагам навуковых дысцыплін.

4. Краязнаўчая дзейнасць бібліятэк мае комплексны характар, валодае дакладна вызначаным наборам відаў дзейнасці, мае ўнутраную структуру і сувязь асноўных кампанентаў і падсістэм.

## Лекцыя 2. **АРГАНІЗАЦЫЯ КРАЯЗНАЎЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ БІБЛІЯТЭК**

**Пытанні:**

**1. Арганізацыя краязнаўчай работы універсальных абласных бібліятэк і ЦБС. Штат краязнаўчага аддзела, функцыянальныя абавязкі супрацоўнікаў аддзела.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**2. Асаблівасці дзейнасці асноўных структурных падраздзяленняў універсальных абласных бібліятэк і ЦБС у галіне краязнаўства.**

**3. Удзел НББ у краязнаўчай дзейнасці бібліятэк.**

Мэта: вывучэнне асаблівасцей арганізацыі кразнаўчай дзейнасці ўніверсальных абласных бібліятэк і ЦБС.

**Пытанне 1. Арганізацыя краязнаўчай работы універсальных абласных бібліятэк і ЦБС.**

У бібліятэках распрацоўваюцца дакументы, у якіх адлюстроўваюцца краязнаўчыя абавязкі:

уставы і палажэнні аб бібліятэках;

палажэнні аб аддзеле, або сектары ці групе краязнаўства;

палажэнні аб сектары краязнаўчых бібліяграфічных рэсурсаў пры інфармацыйна-бібліяграфічным аддзеле;

палажэнні аб сектары дэпазітарнага захавання краязнаўчых дакументаў і мясцовых выданняў;

палажэнне аб фондзе краязнаўчага аддзела і г.д.

Універсальныя абласныя бібліятэкі распрацоўваюць “Палажэнні аб аддзеле краязнаўства” з улікам мясцовых умоў і практыкі сваёй краязнаўчай работы, або іншых бібліятэк. Структурна Палажэнне складаецца з трох частак:

I. Агульныя палажэнні (дзе вызначаецца месца аддзела ў арганізацыйнай структуры бібліятэкі; задачы, кірункі ўзаемадзеяння з іншымі бібліятэкамі і ўстановамі, якія займаюцца краязнаўчай дзейнасцю).

II. Функцыі аддзела (выдзяляюцца асноўныя напрамкі дзейнасці):

- стварэнне падсобнага краязнаўчага фонда аддзела;
- абслугоўвання абанентаў краязнаўчымі дакументамі са свайго падсобнага фонда і фонда асноўнага захавання бібліятэкі;
- папулярызацыя краязнаўчых дакументаў, правядзенне масавых краязнаўчых мерапрыемстваў;
- арганізацыя і вядзенне зводнага краязнаўчага каталога і зводнага каталога мясцовых выданняў, картатэк;
- падрыхтоўка краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў, баз даных;
- бібліяграфічнае абслугоўванне па краязнаўстве;
- навукова-метадычнае забеспячэнне і навукова-даследчая дзейнасць у галіне бібліятэчнага краязнаўства;
- складанне планаў і справаздач аб рабоце і г.д.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

III. Упраўленне аддзелам (звесткі аб структуры аддзела, наяўнасці сектароў, груп, штата, абавязкі супрацоўнікаў аддзела суадносна са службовымі інструкцыямі). Палажэнне зацвярджаецца Саветам пры дырэктары абласной бібліятэкі.

Распрацоўваюцца службовыя інструкцыі з мэтай рацыянальнага раздзялення працы і спецыялізацыі.

У гэтых інструкцыях фіксуюцца абавязкі супрацоўнікаў краязнаўчага аддзела ўніверсальнай абласной бібліятэкі, які налічвае ад трох да пяці чалавек.

Пры штаце ў 5 чалавек вылучаюцца пасады: загадчыка аддзела, вядучага (галоўнага) бібліятэкара, метадыста, бібліёграфа, бібліятэкара.

У суадносінах са службовымі абавязкамі, загадчык аддзела, як правіла, выконвае наступныя абавязкі:

ажыццяўляе арганізацыйнае і навуковае кіраўніцтва аддзелам;

кіруе работай па арганізацыі краязнаўчай дзейнасці ў самой абласной бібліятэцы і ў межах вобласці;

стварае планы і справаздачы аб КДБ;

прымае непасрэдны удзел у фарміраванні краязнаўчага фонда і забяспечвае паступленне мясцовага абавязковага экземпляра твораў друку;

каардынуе краязнаўчую работу іншых аддзелаў бібліятэкі;

налажвае сувязі аддзела з іншымі бібліятэкамі вобласці, а таксама ўстановамі і арганізацыямі, якія працуюць у галіне краязнаўства;

арганізуе навукова-даследчую работу па пытаннях бібліятэчнага краязнаўства;

прымае ўдзел у падрыхтоўцы і рэдагаванні краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў;

забяспечвае рэкламу дзейнасці аддзела, удзельнічае ва ўсіх накірунках дзейнасці аддзела.

Вядучы (галоўны) бібліятэкар у суадносінах са сваімі службовымі абавязкамі:

арганізуе выкананне планавых заданняў аддзела, дыферэнцыраванае абслугоўванне абанентаў і правядзенне інфармацыйных мерапрыемстваў;

фарміруе краязнаўчы фонд, стварае краязнаўчы ДБА;

ажыццяўляе прагляд мясцовых перыядычных выданняў з мэтай вядзення краязнаўчых каталогаў, картатэк і БД;

прымае ўдзел у падрыхтоўцы краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў;

арганізуе пастаянна дзейнічаючыя выставы;

прымае ўдзел у правядзенні масавых мерапрыемстваў, ажыццяўляе бібліяграфічнае абслугоўванне па краязнаўству;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вывучае вопыт краязнаўчай работы бібліятэк вобласці і аказвае ім неабходную метадычную дапамогу.

Метадыст краязнаўчага аддзела абласной бібліятэкі:

- аказвае ўсебаковую метадычную і практычную дапамогу супрацоўнікам абласной бібліятэкі;
- забяспечвае ўкараненне ў практыку работы бібліятэк вобласці передавога вопыту;
- распрацоўвае метадычныя матэрыялы і дае кансультацыі па асноўных напрамках КДБ;
- аналізуе краязнаўчую работу ЦБС і іншых бібліятэк вобласці;
- вывучае краязнаўчыя патрэбнасці і запыты карыстальнікаў;
- вядзе картатэку метадычных матэрыялаў па бібліятэчным краязнаўстве і інш.

Бібліёграф адказвае за бібліяграфічны кірунак краязнаўчай дзейнасці абласной бібліятэкі і бібліятэк края; складае бібліяграфічныя дапаможнікі; вядзе зводны краязнаўчы каталог, ажыццяўляе даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне па краязнаўстве; вядзе работу па бібліяграфічнаму інфармаванню, у т.л. у рэжыме выбарачнага распаўсюджання інфармацыі і інш.

Бібліятэкар краязнаўчага аддзела ў суадносінах са сваімі службовымі абавязкамі непасрэдна ўдзельнічае ў абслугоўванні абанентаў краязнаўчымі дакументамі; вядзе даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне; прымае ўдзел у арганізацыі краязнаўчага ДБА; арганізуе адкрыты доступ да краязнаўчага фонду; адказвае за яго расстаноўку і захаванасць; праводзіць масавыя мерапрыемства па краязнаўству і інш. Сучасны бібліятэкар-бібліёграф павінен ствараць інфармацыйныя матэрыялы для онлайн-рэсурсаў і загружаць аўдыё і відэападкасты ў інтэрнет, апрацоўваць і загружаць фатаграфіі, выкарыстоўваць разнастайныя камп’ютарныя праграмы, аператыўна перадаваць інфармацыю на сайт, адбіраць якасныя факты і даныя.

Для забеспячэння паслядоўнасці і пераемнасці выканання краязнаўчай работы распрацоўваюцца тэхналагічныя і і ншыя палажэнні і інструкцыі: зводны профіль краязнаўчых фондаў бібліятэк края; інструкцыя аб парадку адбора і перадачы краязнаўчых і мясцовых выданняў на дэпазітарнае захоўванне; шлях краязнаўчага дакумента ў працэсе фарміравання краязнаўчых фондаў; палажэнне аб зводным краязнаўчым каталозе і інш.

Краязнаўчая работа ажыццяўляецца практычна ўсімі структурнымі падраздзяленнямі мясцовай публічнай бібліятэкі, таму паказчыкі КДБ адлюстроўваюцца ў комплексных планах работы: перспектыўных,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

унутрыбібліятэчных, рэгіянальных аддзелаў, сектароў, асобных супрацоўнікаў.

Самастойнае планаванне і справаздача КДБ вядуцца тады, калі ў бібліятэцы створана спецыяльнае краязнаўчае падраздзяленне (аддзел, сектар, група), або калі бібліятэка ўдзельнічае ў рэалізацыі дзяржаўнай або рэгіянальнай краязнаўчай праграмы.

Усе аддзелы мясцовай публічнай бібліятэкі займаюцца краязнаўчай работай, але кожны па свайму профілю, кожны супрацоўнік бібліятэкі ўдзельнічае ў КДБ незалежна ад пасады і ўчастка работы.

Сістэмная цэласнасць КДБ не столькі арганізацыйна-афармленага, колькі сутнасна-функцыянальнага парадку. Стварэнне ва ўсіх цэнтрах бібліятэчнага краязнаўства цэласнай сістэмы КДБ не павінна звязвацца толькі са стварэннем структурнага подраздзялення па краязнаўстве.

У той жа час краязнаўчая сфера не выключае наяўнасці асобнага краязнаўчага падраздзялення і паглыбленную спецыялізацыю супрацоўнікаў публічных бібліятэк па краязнаўстве. У абласных бібліятэках Беларусі, дзе створаны комплексныя краязнаўчыя аддзелы, або ў ЦГБ, ЦРБ — дзе ў структуры маюцца сектары, групы па краязнаўству — КДБ развіваецца комплексна, а яе узровень і маштабы значна вышэй, чым у бібліятэках, дзе не выдзелены спецыяльныя структурныя адзінкі па краязнаўству.

Некаторыя спецыялісты лічаць, што наяўнасць краязнаўчага аддзела вядзе да "самаізаляцыі" і адасобленнасці КДБ. Але гэта не падцвярджаецца ні гісторыкамі, ні сучаснай практыкай КДБ. Напрыклад: шматгадовая практыка публічных бібліятэк Вялікабрытаніі, Аўстрыі, Італіі і іншых краін, якія маюць багатыя краязнаўчыя традыцыі і асобныя краязнаўчыя аддзелы, сведчыць, што гэтыя аддзелы рэалізуюць дакладныя задачы і кірункі дзейнасці, што дазваляе сфакусіраваць намаганні і забяспечыць найлепшыя ўмовы для комплекснага і якаснага ажыццяўлення КДБ пры удзеле ўсіх астатніх структурных падраздзяленняў бібліятэкі.

Шматгадовы вопыт арганізацыйнага выдзялення КДБ у бібліятэках Беларусі характаразуецца шматлікімі арганізацыйнымі формамі: кабінет краязнаўства, краязнаўчы аддзел, сектар, група, сектар краязнаўчай бібліяграфіі, сектар дэпазітарнага захавання краязнаўчых і мясцовых выданняў, чытальная зала краязнаўчай літаратуры.

Арганізацыю краязнаўчай работы і яе каардынацыю ажыццяўляе: у ЦБС — сектар або група краязнаўства, які ўзначальвае бібліёграф-краязнавец; у абласных бібліятэках — можа існаваць адна з чатырох арганізацыйных формаў КДБ: комплексны аддзел краязнаўства; сектар краязнаўчай бібліяграфіі пры інфармацыйна-бібліяграфічным аддзеле; сектар краязнаўства, які арганізуецца ў структуры гэтага ж аддзела (але ён вядзе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

краязнаўчую работу па ўсіх напрамках); супрацоўнік, які адказвае за краязнаўчую дзейнасць. Аптымальны варыянт — выдзяленне комплекснага аддзела краязнаўства, што дазваляе забяспечыць работу па ўсіх напрамках КДБ, а таксама дазваляе кіраваць і каардынаваць работу па краязнаўстве ў рэгіёнах. У абласных бібліятэках Беларусі функцыянуюць комплексныя аддзелы і сектары краязнаўчай літаратуры і гэта сведчыць аб аптымальнай арганізацыі краязнаўчай дзейнасці. Сектары краязнаўства дзейнічаюць і ў шэрагу ЦБ буйных сістэм публічных бібліятэк.

**Пытанне 2. Асаблівасці дзейнасці асноўных структурных падраздзяленняў універсальных абласных бібліятэк і ЦБС у галіне краязнаўства**

Астатнія структурныя адзінкі не маюць магчымасці забяспечыць сістэмнае ўтварэнне КДБ, аб'яднаць намаганні ўсіх структурных падраздзяленняў бібліятэкі і бібліятэк края ў сферы краязнаўства.

У практычнай краязнаўчай дзейнасці існуе наступнае размеркаванне абавязкаў у ЦБС і УНАБ:

1. Аддзел камплектавання па дамоўленнасці з іншымі аддзеламі бібліатэкі і, незалежна ад таго, ёсць ці не аддзел краязнаўства — займаецца мадэліраваннем, камплектаваннем і размеркаваннем краязнаўчых і мясцовых дакументаў па структурных падраздзяленнях бібліатэкі.

2. Аддзел апрацоўкі ажыццяўляе першасную аналітэка-сінтэтычную апрацоўку дакументаў; супрацоўнікі аддзела адлюстроўваюць звесткі аб краязнаўчых і мясцовых дакументах у агульнай сістэме каталогаў і картатэк (службовых і чытацкіх); прадстаўляе неабходную колькасць картак у краязнаўчы аддзел для адлюстравання іх у краязнаўчых каталогах і картатэках. Аддзел апрацоўкі, як правіла, займаецца апрацоўкай і арганізацыяй каталогаў айчынных краязнаўчых кніг. Іншыя віды краязнаўчых мясцовых дакументаў нотныя, выяўленчыя выданні, кінафота-фонадакументы, спецвіды тэхнічнай літаратуры і дакументацыі, рэдкія і рукапісныя выданні, а таксама дакументы на замежных мовах — апрацоўваюцца ў аддзеле апрацоўкі, або ў адпаведных аддзелах абласной бібліятэкі згодна іх профілю.

3. Аддзел арганізацыі і выкарыстання фондаў ЦБС; аддзел захавання асноўнага фонда УНАБ — маюць асноўную частку краязнаўчых і мясцовых дакументаў (ажыццяўляюць гарантаванае захоўванне дакументаў); даюць на пастаяннае або часовае захаванне гэтыя дакументы ў падсобныя фонды аддзелаў бібліятэкі, або часовае карыстанне абанентам непасрэдна; даюць ў часовае карыстанне абанентам бібліятэкі праз МБА і іншым бібліятэкам; вывучаюць выкарыстанне краязнаўчых і мясцовых дакументаў і перадаюць ў аддзел камплектавання прапановы па дакамплектаванні фонда і інш. У

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

структуры асноўнага фонда (фондасховішча), як правіла, вылучаецца дэпазітарны фонд.

4. Аддзел абслугования:

— абслугоўвае абанементаў дакументамі з падсобнага фонду;

— арганізуе часовыя або пастаянныя выставы гэтых дакументаў, праводзіць масавыя мерапрыемствы, арганізуе адкрыты доступ да фондаў і г.д.

5. Інфармацыйна-бібліяграфічны аддзел ЦБС (калі адсутнічае краязнаўчы сектар) — стварае сістэму краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў, падсобны даведачна-бібліяграфічны фонд; вядзе сістэму краязнаўчых каталогаў і картатэк; ажыццяўляе даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне абанентаў па краязнаўстве; каардынуе краязнаўчую бібліяграфічную дзейнасць у бібліятэцы і за яе межамі.

6. Навукова метадычны аддзел — гэта цэнтр метадычнай і навуковай работы у галіне краязнаўства; арганізуе краязнаўчую дзейнасць па ўсіх напрамках; аказвае метадычную дапамогу супрацоўнікам бібліятэкі края па ўсіх напрамках акрамя бібліяграфічнага; распрацоўвае метадычныя матэрыялы у дапамогу КДБ; ажыццяўляе навукова-даследчую работу ў галіне бібліятэчнага краязнаўства; арганізуе вывучэнне і абагульненне передавога візіта; робіць штогод абзоры КДБ края; ажыццяўляе перападрыхтоўку бібліятэчных спецыялістаў у галіне бібліятэчнага краязнаўства, праводзіць семінары, канферэнцыі і г.д.

7. Аддзелы бібліятэчнага маркетынгу. Іх супрацоўнікі вызначаюць кірункі інавацыйных працэсаў па краязнаўстве, ствараюць інавацыйныя прадукты (краязнаўчыя бібліяграфічныя дапаможнікі, зборнікі матэрыялаў краязнаўчых даследаванняў, сабраных бібліятэкарамі ЦБС, зборнікаў твораў мясцовых паэтаў, сцэнарыяў краязнаўчых мерапрыемстваў.)

8. Спецыялізаваныя аддзелы (аддзел абслугования працоўнікаў сельскай гаспадаркі; аддзел тэхнічнай літаратуры, літаратуры па мастацтву, па замежных мовах) працуюць з краязнаўчымі і мясцовымі дакументамі па свайму профілю (абслугоўваюць абанентаў, шукаюць прабелы "лакуны" у фондзе, удзельнічаюць у аналітычным роспісу краязнаўчых мясцовых дакументаў па сваёй тэматыцы і г.д.).

Гэта ідэальны варыянт арганізацыі КДБ ва універсальных абласных бібліятэках. Такім чынам, пры наяўнасці асобнага комплекснага краязнаўчага аддзела, іншыя структурныя падраздзяленні бібліятэкі удзельнічаюць у краязнаўчай рабоце суадносна свайму профілю, у цесным узаемадзеянні друг з другам, а таксама з іншымі бібліятэкамі края згодна свайму профілю.

У некаторых ЦБС ствараюць спецыяльныя групы краязнаўства, куды уваходзяць прадстаўнікі розных аддзелаў для правядзення КДБ пастаяннай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аснове або часова. Можна выдзеліць і пасаду менеджера па краязнаўству, які павінен вывучаць краязнаўчы “рынак”, каардзініраваць краязнаўчую дзейнасць як у самой бібліятэцы, так і за яе межамі.

ноства арганізацыйных форм забяспечвае гібкасць, прыярытэтнасць і сістэмнае развіццё ўсіх напрамкаў КДБ. Характар КДБ абумовіў лакалізацыю асноўнага кіруючага звяна ў універсальных абласных бібліятэках рэспублікі, арганізуючая і каардзініруючая роля якіх будзе ў перспектыве ўзрастаць.

пецыфіка КДБ у тым, што выбар арганізацыйнага рашэння залежыць ад статута і асаблівасцей дзейнасці бібліятэкі у гэтым крае. Краязнаўчая дзейнасць дазваляе набыць мясцовым публічным бібліятэкам самабытнасць, рэгіянальную спецыфіку і мясцовы каларыт. Комплексны характар КДБ прадугледжвае шматварыянтнасць яе арганізацыі з улікам рэальных умоў канкрэтнай бібліятэкі.

## Пытанне 3. Удзел НББ у кразнаўчай дзейнасці бібліятэк

НББ актыўна ўдзельнічае ў развіцці краязнаўчай дзейнасці бібліятэк краіны. Яе асноўная функцыя – навукова-метадычная дапамога бібліятэкам і навукова-даследчая работа ў галіне бібліятэчнага краязнаўства.

У функцыянальныя напрамкі навукова-даследчага аддзела НББ уваходзіць навукова-метадычная дапамогі бібліятэкам па стварэнні краязнаўчых інфармацыйных, у т.л. бібліяграфічных рэсурсаў. Навукова-метадычную дапамогу аказваюць і іншыя структурныя падраздзяленні НББ.

Супрацоўнікамі бібліятэкі актыўна праводзяцца даследаванні па краязнаўстве, адлюстраваныя ў шматлікіх публікацыях. Усебакова праблемы краязнаўчай дзейнасці былі абмеркаваны на міжнароднай канферэнцыі “Бібліятэчнае краязнаўства : прастора вялікіх магчымасцей і перспектыў” (2012 г.).

## <u>Вывады:</u>

1. Упарадкаванню краязнаўчай дзейнасці бібліятэк спрыяе шэраг дакументаў: палажэнні аб краязнаўчай рабоце бібліятэк, палажэнні аб аддзеле, сектары, групе краязнаўства, тэхналагічныя інструкцыі і г.д.
2. У штат краязнаўчых аддзелаў уваходзяць 3 – 5 чалавек (загадчык аддзела, вядучы бібліятэкар, метадыст, бібліёграф, бібліятэкар), якія выконваюць суадносныя службовыя абавязкі.
3. У ЦБС і ўніверсальных абласных бібліятэках існуюць разнастайныя арганізацыйныя формы КДБ.
4. Краязнаўчая работа ажыццяўляецца практычна ўсімі структурнымі падраздзяленнямі бібліятэкі і паміж імі існуе дакладнае размеркаванне абавязкаў у галіне краязнаўства. НББ з’яўляецца ініцыятарам і арганізатарам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навукова-метадычнай і навукова-даследчай дзейнасці ў галіне бібліятэчнага краязнаўства.

Лекцыя 3. **СПЕЦЫФІКА КРАЯЗНАЎЧАГА ФОНДА БІБЛІЯТЭК**

**Пытанні:**

1. Вызначэнне паняццяў "краязнаўчы дакумент", "мясцовы дакумент", "краязнаўчы фонд", "фонд мясцовых дакументаў", "падфонд краязнаўчых дакументаў".
2. Структура, асаблівасці, уласцівасці краязнаўчага фонда бібліятэкі.
3. Спецыфіка краязнаўчых фондаў бібліятэк розных тыпаў і відаў.
4. Сукупны краязнаўчы фонд. Умовы фарміравання.

Мэта: знаёмства з элементамі тэрмінасістэмы бібліятэчнага краязнаўства; вывучэнне спецыфікі краязнаўчых фондаў бібліятэк розных тыпаў і відаў.

**Пытанне 1. Вызначэнне паняццяў "краязнаўчы дакумент", "мясцовы дакумент", "краязнаўчы фонд", "фонд мясцовых дакументаў", "падфонд краязнаўчых дакументаў"**

Фарміраванне краязнаўчага фонда (КФ) з'яўляецца галоўным сродкам рэалізацыі краязнаўчага прызначэння бібліятэкі, бо краязнаўчы фонд выступае асновай усёй краязнаўчай дзейнасці бібліятэкі (КДБ), дакументнай базай "рэгіянальнай памяці".

Складаецца краязнаўчы фонд у асноўным з краязнаўчых і мясцовых дакументаў.

У "Палажэнні аб краязнаўчай рабоце бібліятэк РБ" (1993) даны наступныя азначэнні гэтых паняццяў:

— Паняцце "**краязнаўчы дакумент**" аб'ядноўвае ўсе выданні, неапублікаваныя і аўдыёвізуальныя матэрыялы, машыначытальныя носьбіты інфармацыі, якія прысвечаны краю, незалежна ад тыражу, мовы і месца выдання.

— Паняцце **"мясцовы дакумент"** аб'ядноўвае ўсе выданні, неапублікаваныя і аўдыёвізуальныя матэрыялы, машыначытальныя носбіты інфармацыі, створаныя на тэрыторыі края.

Неабходна ўдакладніць аб'ём і змест паняцця "краязнаўчы дакумент", бо яно выкарыстоўваецца ў бібліятэчным краязнаўстве ў якасці зборнага і раздзяляльнага тэрміна.

Як зборнае паняцце "краязнаўчы дакумент" — гэта дакумент, які зместам або формай звязаны з краем. Пры гэтым пад зместам краязнаўчага

дакумента разумееецца адлюстраваная ў ім інфармацыя аб краі, а пад формай – інфармацыя аб месцы выдання, аўтарскай прыналежнасці і прыналежнасці да краю іншых асоб, якія ўдзельнічалі ў стварэнні дакумента. Такое азначэнне паняцця дае магчымасць з вычарпальнай паўнатой аб'яднаць усе дакументы, якія нейкім чынам звязаны з краем, усе крыніцы краязнаўства, якія з'яўляюцца аб'ектамі краязнаўчай дзейнасці.

Як раздзяляльнае паняцце "краязнаўчы дакумент" — гэта дакумент, звязаны з краем сваім зместам і які разглядаецца ў якасці асноўнага аб'екта краязнаўчай дзейнасці бібліятэкі.

У сістэме краязнаўчай дзейнасці бібліятэкі работа з дакументамі, звязанымі з краем зместам (краязнаўчымі дакументамі), і работа з дакументамі, звязанымі з краем паходжаннем (мясцовыя дакументы) ажыццяўляецца ў межах двух асноўных узаемазвязаных кірункаў, але прыярытэтнасць надаецца рабоце з краязнаўчымі дакументамі.

Такім чынам, паняцце "краязнаўчы дакумент" у практычнай сферы дыферэнцыруецца ў залежнасці ад тыпа, віда, профіля бібліятэкі, яе традыцый і мясцовых умоў; яно ўдакладняецца ў залежнасці ад мэт, відаў і формаў краязнаўчай дзейнасці.

Пры вядомай агульнасці прымет, паняцце "краязнаўчы дакумент" можа мяняцца пры фарміраванні краязнаўчага фонда, арганізацыі краязнаўчага даведачна-бібліяграфічнага апарата, стварэнні сістэмы краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў. Гэта звязана з тым, што ніводная, нават самая буйная бібліятэка, не мае магчымасці набыць у свой фонд усе без выключэння дакументы, якія фармальнымі прыметамі звязаны з краем. Мэтазгодна мець даныя аб наяўнасці і месцазнаходжанні гэтых дакументаў у мэтах міжбібліятэчнага выкарыстання.

Часцей за ўсё бібліятэкі працуюць з краязнаўчымі і мясцовымі дакументамі наступных відаў:

1. кнігі і брашуры;
2. выяўленчыя матэрыялы (рэпрадукцыі, эстампы, альбомы, плакаты, лістоўкі, праспекты, каталогі музеяў);
3. кінафотафонадакументы (дыяпазітывы, грампласцінкі, магнітныя ленты, кампактдыскі, кінафільмы);
4. нотныя выданні;
5. картаграфічныя выданні;
6. неапублікаваныя дакументы (рукапісы, машынапісныя);
7. прамысловыя каталогі на мясцовую прадукцыю;
8. апісанне вынаходніцтваў мясцовых вынаходнікаў;
9. афішы, тэатральныя праграммы, рэцэнзіі на спектаклі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

10. дакументы на замежных мовах, якія цалкам прысвечаны вызначанаму краю, або маюць значныя (па аб’ему і каштоўнасці) звесткі аб гэтым краі;

11. дакументы, надрукаваныя (створаныя) на тэрыторыі гэтага края.

Асноўнымі тыпамі выданняў з’яўляюцца:

а) па зместу: універсальныя, комплексныя, галіновыя, тэматычныя, біяграфічныя выданні;

б) па мэтавым і чытацкім прызначэнні: афіцыйныя, навуковыя, вучэбныя, вытворчыя, навукова-папулярныя, даведачныя, інфармацыйныя, літаратурна-мастацкія, выданні для дзяцей і юнацтва, для службовага карыстання і інш.

Існуюць розныя тэрміны, якія ўжываюцца пры азначэнні фонда літаратуры аб краі. Каб упарадкаваць ужыванне гэтых тэрмінаў — падзелім выкарыстоўваемыя паняцці на **збіральныя, абагульняючыя і раздзяляльныя**:

— Тэрмін "краязнаўчы фонд" *(збіральны тэрмін)* — гэта сукупнасць дакументаў, якія зместам або формай звязаны з краем. Гэта дазваляе аб’яднаць у адзіную сістэму:

- фонд краязнаўчых дакументаў;
- калекцыю мясцовых дакументаў;
- дакументы па тэарэтычных, метадычных, арганізацыйных пытаннях краязнаўства.

Паняцце КФ можа аб’яднаць і сукупнасць краязнаўчых дакументаў асобнай бібліятэкі, бібліятэк края, краіны цалкам.

Тэрмін "фонд краязнаўчых дакументаў" *(абагульняючае паняцце)* — аб’ядноўвае сукупнасць розных тыпаў і відаў краязнаўчых дакументаў (кнігі, карты, кінафотафонадакументы, мікрафільмы, рукапісы і г.д.).

Такім чынам, фонд краязнаўчых дакументаў — гэта ўпарадкаванае мноства краязнаўчых дакументаў, якія па зместу звязаны з краем.

*Раздзяляльныя паняцці:*

- "фонд краязнаўчых выданняў";
- "фонд кінафотафонадакументаў краязнаўчага зместа";
- "фонд краязнаўчых рукапісаў";
- "фонд мясцовых дакументаў" (гэта сукупнасць дакументаў, звязаных з краем паходжаннем).

Гэтыя паняцці дазваляюць размежаваць, аддзяліць адзін ад аднаго сукупнасці краязнаўчых дакументаў розных тыпаў і відаў.

Тэрмін "краязнаўчы фонд бібліятэкі" — мэтазгодна ўжываць, калі фонд выдзелен з асноўнага дакументнага збору бібліятэкі і яму забяспечваецца адасобленае захаванне, а тэрмін "падфонд краязнаўчых дакументаў" — (гэта

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

частка фонда асобнай бібліятэкі, бібліятэк края, або краіны) выкарыстоўваць калі КФ захоўваецца разам з іншымі дакументамі.

Але практыкі і тэарэтыкі бібліятэчнага краязнаўства ўжываюць у асноўным тэрмін "краязнаўчы фонд бібліятэкі" і калі фонд выдзелен фізічна, і калі ён арганізаван і функцыянуе ў структуры агульнага фонда бібліятэкі.

**Пытанне 2. Структура, асаблівасці, уласцівасці краязнаўчага фонда бібліятэкі**

Краязнаўчыя дакументы захоўваюцца ў розных установах дакументных камунікацый краязнаўства: бібліятэках, архівах, музеях, органах НТІ, кніжных магазінах і г.д. <u>Асаблівасці КФ бібліятэк</u> у тым, што:

- у іх збіраюцца краязнаўчыя дакументы рознай тэматыкі, тыпаў, відаў, храналагічнай глыбіні, якія карыстаюцца шырокім грамадскім попытам;
- фарміраванне складу КФ бібліятэк ажыццяўляецца з улікам гістарычных, эканамічных, прыродных, культурных і сацыяльных асаблівасцей края, тыпа, віда і задач бібліятэкі па задавальненню краязнаўчых патрэбнасцей карыстальнікаў;
- састаў і структура КФ бібліятэк розных тыпаў і відаў адрозніваюцца. Гэта ўмова каардынаванага фарміравання сукупнага КФ бібліятэк края і яго ўзаемавыкарыстання.

Улік гэтых агульнафондавых палажэнняў дазваляе кожнай бібліятэкі рэгіянальнага ўзроўня сфарміраваць у структуры свайго фонда профільную, або мясцовую частку фонда.

Спецыфічныя адрозненні ў саставе і структуры краязнаўчых фондаў бібліятэк розных тыпаў і відаў ствараюць умовы для задавальнення разнастайных краязнаўчых патрэбнасцей карыстальнікаў, забяспечваюць умовы для каардынаванага фарміравання сукупнага КФ бібліятэк края і яго ўзаемавыкарыстання. КФ асобнай бібліятэкі прадстаўляе сабой самастойную сістэму, у тый жа час КФ з’яўляецца падсістэмай агульнага бібліятэчнага фонда бібліятэкі, кампанентам КФ бібліятэк раёна, вобласці, рэспублікі.

У краязнаўчым фондзе, як цэласным утварэнні, умоўна выдзяляюцца 4 <u>асноўныя групы дакументаў</u>, якія абумоўліваюць яго спецыфіку:

1. Падфонд краязнаўчых дакументаў, якія па зместу звязаны з краем.
2. Падфонд мясцовых дакументаў, якія звязаны з краем сваім паходжаннем.
3. Падфонд дакументаў, прысвечаных вядомым дзеячам края і ўраджэнцам.
4. Падфонд дакументаў, якія прысвечаны тэорыі, методыцы і арганізацыі краязнаўства, як вобласці навуковай і практычнай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спецыфікай краязнаўчага фонда (або яго ўласцівасцямі) з’яўляецца тое, што:

- тэматычны, тыпалагічны, відавы, храналагічны і моўны састаў КФ супадае з гэтымі параметрамі бібліятэчнага фонда наогул;
- краязнаўчыя дакументы маюць пастаянную высокую каштоўнасць — інтарэс да іх стабільны;
- абнаўленне КФ адбываецца больш павольна, чым усяго фонда, бо краязнаўчых дакументаў выдаецца не вельмі многа, захоўваюцца яны пастаянна (іх не спісваюць як састарэлыя па зместу!);
- для КФ характэрна стабільнасць складу;
- галоўнай характарыстыкай КФ з’яўляецца яго паўната, а не велічыня;
- велічыня КФ залежыць ад аб’ема выходзячых дакументаў; ад абанентаў залежыць экземплярнасць набываемых выданняў;
- у самастойны КФ не ўваходзяць матэрыялы аб краі, якія змешчаны ў выглядзе асобных глаў, абзацаў і г.д., акрамя тых выпадкаў, калі гэтыя выпіскі (у відзе тэматычных папак, копій артыкулаў) афармляюцца ў самастойныя адзінкі захавання.

Пералічаныя ўласцівасці сведчаць аб тым, што краязнаўчы фонд мае ўсе прыметы ядзернай часткі бібліятэчнага фонда, адначасова ў ім можна выдзеліць ядро — гэта найбольш каштоўныя краязнаўчыя дакументы.

По складу КФ дзеляцца на:

а) універсальныя КФ (універсальныя абласныя бібліятэкі; публічныя (масавыя) бібліятэкі для дарослых і дзяцей; бібліятэкі краязнаўчых музеяў);

б) шматгаліновыя (бібліятэкі універсітэтаў; сістэмы Нацыянальнай акадэміі навук РБ);

в) галіновыя (НТБ прадпрыемстваў; медыцынскія, сельскагаспадарчыя бібліятэкі і інш.)

Па тэматыцы ў КФ збіраюцца дакументы, якія комплексна характэрызуюць край або асвятляюць асобныя праблемы яго развіцця. Шырокі відавы, тыпалагічны, моўны, храналагічны склад КФ бібліятэк.

## Пытанне 3. Спецыфіка краязнаўчых фондаў бібліятэк розных тыпаў і відаў.

Спецыфіка краязнаўчых фондаў бібліятэк розных відаў. Найбольш шырокія па саставу і глыбокія па паўнаце краязнаўчыя фонды збіраюць **універсальныя навуковыя абласныя бібліятэкі** (УНАБ) Беларусі, якія з’яўляюцца цэнтрамі бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства ў рэгіёнах рэспублікі. Аб’ём КФ абласных бібліятэк РБ 15-20 тысяч экземпляраў, пры гэтым краязнаўчыя дакументы ў іх аб’ёме складаюць да 20%, астатнія 80% — мясцовыя дакументы. УНАБ атрымліваюць мясцовы абавязковы экземпляр

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

твораў друку, што дазваляе ім выконваць функцыю дэпазітарыяў краязнаўчых і мясцовых дакументаў. КФ абласных бібліятэк фарміруюцца з улікам сукупнага профіля вобласці і разлічаны на задавальненне запытаў карыстальнікаў на краязнаўчыя дакументы навуковага, міжгаліновага і комплекснага характара.

Універсальныя абласныя бібліятэкі прыкладаюць шмат намаганняў па збору краязнаўчых дакументаў у максімальна поўным аб’ёме, арганізуюць іх гарантаванае захаванне і агульнадаступнае выкарыстанне.

Універсальнымі па складу краязнаўчымі фондамі валодаюць **публічныя (масавыя) бібліятэкі** рэспублікі – цэнтры бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства нізавога рэгіянальнага ўзроўня. Яны вырашаюць задачу якаснага адбора краязнаўчых дакументаў і прадстаўленне іх для актыўнага выкарыстання абанентамі. КФ публічных бібліятэк не носяць дэпазітарнага характара, але выключэнне краязнаўчых дакументаў з фонда абмежавана. Састаў КФ арыентаваны на профіль абслугоўваемай тэрыторыі і на задавальненне агульнакультурных краязнаўчых патрэбнасцей абанентаў.

У абласных цэнтрах рэспублікі вузкапрафесійныя краязнаўчыя патрэбы абанентаў задавальняюцца фондамі ўніверсальных абласных бібліятэк, а ЦБС гэтых гарадоў, як правіла, спецыялістаў і вучоных не абслугоўваюць, бо фонды бібліятэк ЦБС арыентаваны на набыцце масавых краязнаўчых выданняў.

Спецыфіка камплектавання КФ ЦБС сярэдніх і малых гарадоў іншая: публічныя бібліятэкі набываюць у фонд масавыя і спецыяльныя краязнаўчыя выданні. Мэтазгодна наступная каардынацыя: у фондзе ЦБ ЦБС канцэнтруюцца спецыяльныя краязнаўчыя выданні, а масавыя краязнаўчыя выданні як у філіялах, так і ў ЦБ ЦБС. Улічваючы спецыфіку мясцовых умоў, краязнаўчыя фонды ЦБС арыентаваны на задавальненне не толькі агульнакультурных, пазнавальных, але і навуковых, вучэбных, вузкапрофільных патрэб абанентаў у галіне краязнаўства.

Дзіцячыя і школьныя бібліятэкі арыентуюцца на далучэнне юных грамадзян да пазнання роднага края, на фарміраванне патрэбнасцей абанентаў у краязнаўчых дакументах. Краязнаўчыя фонды гэтых бібліятэк, універсальныя па зместу, фарміруюцца з улікам узросту абанентаў і разлічаны на задавальненне агульнакультурных і вучэбных краязнаўчых патрэб карыстальнікаў. У КФ значную частку займае мастацкая літаратура, творы мясцовых пісьменнікаў, паэтаў, даведнікі.

Спецыфіка КФ універсітэцкіх бібліятэк і бібліятэк ВНУ у тым, што яны разлічаны на задавальненне навукова-даследчых, вучэбных краязнаўчых патрэбнасцей. Па свайму саставу КФ гэтых бібліятэк

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з'яўляюцца шматгаліновымі або галіновымі. Састаў фонда вызначаецца профілем ВНУ. Акрамя уласна краязнаўчых дакументаў (апублікаваных і неапублікаваных) збіраюцца ўсе выданні, надрукаваныя ў тыпаграфіі або выдавецтве ВНУ, работы студэнтаў, выкладчыкаў, супрацоўнікаў, а таксама дакументы, якія маюць звесткі аб гэтым ВНУ, жыцці і творчасці яго супрацоўнікаў.

Спецыфічнай рысай КФ спецыяльных бібліятэк з'яўляецца ўзровень яго паўнаты па профілю бібліятэкі, абслугоўваемай галіны, прадпрыемства, установы, накіраванасць на задавальненне навукова-даследчых, вытворчых, прафесійных краязнаўчых патрэбнасцей карыстальнікаў. Спецыяльныя бібліятэкі павінны збіраць дакументы, прысвечаныя ўстанове, прадпрыемству, яго супрацоўнікам, а таксама іх публікацыі. Асаблівасцю КФ спецыяльных бібліятэк з'яўляецца наяўнасць у іх саставе спецвідаў краязнаўчых дакументаў: прамысловых каталогаў на мясцовую прадукцыю, апісанне вынаходстваў мясцовых рацыяналізатараў, справаздачы аб НДР і інш.

**Пытанне 4. Сукупны краязнаўчы фонд краю. Умовы фарміравання.**

Сёння перспектыўным і рацыянальным з'яўляецца варыянт фарміравання **сукупнага краязнаўчага фонда края**.

Для дасягнення гэтай мэты бібліятэкам края неабходна наладзіць:

- каардынаванае камплектаванне;
- сістэму дэпазітарнага захавання;
- узаемную інфармацыю аб складзе, месцазнаходжанні і новых паступленнях краязнаўчых дакументаў;
- іх узаемавыкарыстанне на тэрыторыі края;
- сістэму мясцовага абавязковага экземпляра твораў друку;
- стварыць зводны краязнаўчы каталог (друкаваны або электронны);
- распрацаваць зводны профіль фарміравання сукупнага КФ, што садзейнічае рацыянальнаму размеркаванню паміж бібліятэкамі ўсіх ведамстваў краязнаўчых дакументаў.

Камплектаванне сукупнага КФ прадугледжвае размеркаванне ўсіх наяўных і паступаючых краязнаўчых дакументаў на 3 групы:

— краязнаўчыя дакументы, якія патрэбны ўсім без выключэння бібліятэкам;

— краязнаўчыя дакументы, неабходныя асобным катэгорыям бібліятэк;

— краязнаўчыя дакументы, неабходныя некаторым або асобным, канкрэтным бібліятэкам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, існуе пэўная спецыфіка фарміравання краязнаўчых фондаў бібліятэк розных тыпаў і відаў, што з’яўляецца ўмовай стварэння сукупнага краязнаўчага фонду рэгіёна.

**Вывады:**

1. Паняцці "краязнаўчы дакумент", "мясцовы дакумент" выкарыстоўваюцца ў бібліятэчным краязнаўстве ў якасці зборнага і раздзяляльнага тэрмінаў.

2. Тэрміны, якія ўжываюцца пры азначэнні фонда літаратуры аб краі дзеляцца на збіральныя, абагульняючыя і раздзяляльныя.

3. Краязнаўчы фонд бібліятэкі мае сваю структуру, асаблівасці і ўласцівасці.

4. Існуе пэўная спецыфіка фарміравання краязнаўчых фондаў універсальных абласных бібліятэк, публічных, дзіцячых, школьных бібліятэк, бібліятэк ВНУ і спецыяльных бібліятэк.

5. Адным з шляхоў удасканалення фарміравання і выкарыстання краязнаўчых рэсурсаў з’яўляецца стварэнне сукупнага краязнаўчага фонда края.

## Лекцыя 4. **ФАРМІРАВАННЕ КРАЯЗНАЎЧАГА ФОНДУ БІБЛІЯТЭК РОЗНЫХ ТЫПАЎ І ВІДАЎ**

**Пытанні:**

**1. Мадэліраванне краязнаўчага фонда. Віды мадэляў.**

**2. Віды камплектавання краязнаўчага фонда.**

**3. Агульныя і дапаможныя прыметы вызначэння краязнаўчай каштоўнасці дакумента. Крыніцы напаўнення фондаў краязнаўчых і мясцовых дакументаў.**

**4. Улік і апрацоўка краязнаўчых дакументаў.**

**5. Размяшчэнне і захаванне краязнаўчага фонда.**

**6. Падыходы да фарміравання электронных краязнаўчых бібліятэк.**

Мэта: вывучэнне студэнтамі асаблівасцей тэхналагічных этапаў фарміравання краязнаўчага фонда: мадэліравання, камплектавання, арганізацыі.

### Пытанне 1. Мадэліраванне краязнаўчага фонда. Віды мадэляў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Краязнаўчы фонд з’яўляецца структурнай адзінкай агульнага фонда бібліятэкі. Таму фарміраванне КФ ажыццяўляецца на аснове агульнафондавых прынцыпаў і агульнапрынятай тэхналогіі.

Фарміруючы краязнаўчы фонд, камплектатар павінен вывучыць асаблівасці сацыяльна-эканамічнага, гістарычнага, культурнага, гаспадарчага профіля рэгіёна; краязнаўчых патрэбнасцей, інтарэсаў і запытаў абанентаў. Разам з тым, фарміраванне краязнаўчых фондаў мае свае асаблівасці, якія абумоўлены рассейваннем краязнаўчай інфармацыі па дакументах некраязнаўчага зместу; асаблівай каштоўнасцю краязнаўчых дакументаў сёння і ў будучым; задачамі гарантаванага захавання і эфектыўнага выкарыстання абанентамі.

Фарміраванне бібліятэчнага фонда — сукупнасць працэсаў і аперацый, звязаных з яго камплектаваннем і арганізацыяй, а таксама з кіраваннем фондам. Фарміраванне бібліятэчнага фонда складаецца з 4 асноўных этапаў:

1. **Мадэліраванне фонда** (гэта вызначэнне з дапамогай мадэляў якасцей і іншых характарыстык бібліятэчнага фонда для іх даследавання і прагназавання развіцця).

2**. Камплектаванне фонда** ўключае:

— першасны адбор (адбор і планамернае набыццё бібліятэчных дакументаў для стварэння і папаўнення фонда);

— другасны адбор (аналіз выкарыстання бібліятэчнага фонда, выключэнне невыкарыстоўваемай літаратуры, якая не карыстаецца запытам чытачоў, не суадносіцца з тыпам (відам) бібліятэкі).

3. Арганізацыя бібліятэчнага фонда **ўключае:**

а) улік бібліятэчнага фонда;

б) бібліятэчную апрацоўку (навуковую і тэхналагічную);

в) размяшчэнне і расстаноўку бібліятэчнага фонда;

г) захаванне бібліятэчнага фонда;

д) праверку бібліятэчнага фонда.

4. **Кіраванне бібліятэчным фондам**.

Фарміраванне краязнаўчага фонда як часткі агульнага бібліятэчнага фонда ажыццяўляецца па такой жа тэхналогіі як і ўсяго фонда, але мае свае асаблівасці.

Мадэліраванне краязнаўчага фонда.

Якія мадэлі краязнаўчага фонда (КФ) будуць распрацоўвацца, залежыць ад тыпа бібліятэкі, склада і аб’ёма КФ.

**Віды мадэляў:**

*Апісальная (вербальная) мадэль КФ.* Як самастойны дакумент яна складаецца, калі КФ выдзяляецца для адасобленага захавання ў краязнаўчым

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аддзеле або сектары дэпазітарнага захавання, калі КФ не выдзяляецца. Апісальная мадэль уваходзіць састаўной часткай у агульную мадэль фонда. Але і ў адным і ў другім выпадку яна дае агульныя напрамкі фарміравання КФ. У апісальную мадэль уваходзяць: кароткая гісторыя стварэння КФ; склад, структура, аб’ём, крыніцы і спосабы набыцця дакументаў; прынятая схема расстаноўкі і размяшчэння фонду; рэжым захавання і выкарыстання КФ; магчымасці каардынацыі камплектавання і выкарыстоўвання ў межах края; фіксуецца прынятае рашэнне па абмежаванні "свайго" края, змястоўна-тэрытарыяльных меж КФ, прыарытэтныя краязнаўчыя тэмы, храналагічная глыбіня фонда; прынцыпы адлюстравання ў краязнаўчым даведачна-бібліяграфічным апараце і г.д.

У *матэматычнай мадэлі КФ* фіксуюцца асноўныя паказчыкі па КФ: аб’ём, склад КФ, кнігавыдача, абарачальнасць фонда, чытальнасць, дакументазабяспечанасць, аб’ём паступленняў і выбыцця краязнаўчых дакументаў. Пры разліку асноўных паказчыкаў матэматычнай мадэлі КФ выкарыстоўваюць як агульныя, так і прыватныя метады: каэфіцыент укамплектаванасці галіновага падфонда; каэфіцыент выкарыстання гэтага падфонда, каэфіцыент адпаведнасці; вызначэнне аптымальнага аб’ёму краязнаўчага фонда і г.д.

Найбольш распаўсюджана ў практыцы КДБ *структурная (тэматыка-тыпалагічная) мадэль КФ*. Яна рэгламентуе тэматычныя, тыпалагічныя, відавыя, моўныя параметры КФ; экземплярнасць набываемых дакументаў; размеркаванне па структурнымх адзінках бібліятэкі. У публічных масавых бібліятэках краязнаўчая частка бібліятэчнага фонда ўваходзіць састаўной часткай у агульную структурную мадэль фонда, у якой выдзяляецца спецыяльная рубрыка “Краязнаўства”. Яна звязана сістэмай адсылак да іншых рубрык мадэлі, якая адлюстроўвае звесткі краязнаўчых дакументаў комплекснага характара. Ва універсальных абласных бібліятэках, калі КФ адасоблен ад агульнага фонда, ствараецца самастойная структурная мадэль краязнаўчага падфонда. Ствараюцца і зводныя профілі камплектавання краязнаўчага фонда. Для дэталізацыі краязнаўчых тэм выкарыстоўваюць табліцы ББК для краязнаўчых каталогаў. У структурнай мадэлі фіксуюцца краязнаўчыя дакументы, якія цалкам прысвечаны краю або дакументы, комплексныя па зместу.

Дакументы, якія адносяцца да края па фармальных прыметах, (аўтарства, месца выдання і г.д.) у структурнай мадэлі не фіксуюцца. Вырашаецца гэта праблема 2 шляхамі: рашэнне адлюстроўваецца ў тлумачальнай запісцы, або ў картатэцы метадычных рашэнняў.

Ствараюцца дадаткі да структурнай мадэлі: картатэка мясцовых перыядычных выданняў і выданняў, якія прадаўжаюцца; картатэка мясцовых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзеячоў і ўраджэнцаў края з кароткімі біяграфічнымі звесткамі і пералікам асноўных работ; паказальнік назваў тэрыторый, якія ўваходзяць у склад азначанага края; спіс юрыдычных асоб края; пералік асноўных бібліяграфічных дапаможнікаў для камплектавання краязнаўчага фонда; картатэка крыніц папаўнення КФ; картатэка бібліятэк – удзельніц стварэння сукупнага КФ края, зводнага краязнаўчага каталога і інш.

Ствараецца і *бібліяграфічная мадэль КФ*, якая ўключае пералік найбольш каштоўных і рэдкіх краязнаўчых дакументаў. Мадэль рэалізуецца ў форме: бібліяграфічнага паказальніка, спіса ядра КФ, паказальніка мясцовых перыядычных выданняў і інш. Так, рэальнай бібліяграфічнай мадэллю КФ, якая наближана да яго існуючай структуры, з’яўляецца зводны краязнаўчы каталог.

У сукупнасці пералічаныя мадэлі садзейнічаюць аб’яднанню асобных краязнаўчых дакументаў у сістэму **“Краязнаўчы фонд”,** бо яны ўзнаўляюць рэальную і прагнозную структуру фонда.

Пытанне 2. Віды камплектавання краязнаўчага фонда

Камплектаванне краязнаўчага фонда ажыццяўляецца ў суадносінах з агульнай методыкай аналіза патока дакументаў, выяўлення, адбора і заказа краязнаўчых дакументаў з улікам крытэрыя краязнаўчай каштоўнасці дакумента. Калі ўлічваць мэты камплектавання — трэба выдзеліць 4 віда камплектавання:

— *пачатковае камплектаванне* (калі ствараецца новая бібліятэка, а адпаведна і пачатковы фонд бібліятэкі. Пачынаюць з фарміравання ядра фонда);

— *бягучае камплектаванне* (гэта папаўненне фонда дакументамі, якія былі выдадзены на працягу двух апошніх гадоў). Разнавіднасцю бягучага камплектавання з’яўляецца дакамплектаванне (гэта папаўненне фонда дакументамі, якіх не хапае чытачам — мала экземпляраў, або наогул не набылі ў фонд);

— *рэтраспектыўнае камплектаванне* (папаўненне фонда выданнямі, якія адсутнічаюць, або іх нехапае колькасна, і якія былі выдадзены тры і больш гадоў таму назад);

— *рэкамплектаванне* (калі з фонда выключаюцца выданні, якія згубілі сваю каштоўнасць для фонда гэтай бібліятэкі і невыкарыстоўваюцца абанентамі).

Камплектаванне краязнаўчага фонда ажыццяўляецца ў суадносінах з агульнай методыкай камплектавання фонда бібліятэкі. Бягучае камплектаванне краязнаўчымі дакументамі ажыццяўляецца праз бібліятэчны калектар і мясцовы абавязковы экземпляр твораў друку. Супрацоўнік, які адказвае за краязнаўчую работы, знаёміцца з інфармацыйнымі матэрыяламі:

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

планамі мясцовых і цэнтральных рэспубліканскіх (дзяржаўных і камерцыйных) выдавецтваў, кнігагандлёвых арганізацый, паліграфічных прадпрыемстваў, іншых арганізацый, навучальных устаноў, музеяў, якія выдаюць краязнаўчыя дакументы. Для кантроля за бягучым камплектаваннем трэба знаёміцца:

— з дапаможнікамі дзяржаўнай бібліяграфіі, якія забяспечваюць рэгістрацыю выданняў: “Кніжны летапіс”, “Картаграфічны летапіс”, “Летапіс перыядычных выданняў і выданняў, якія прадаўжаюцца”, “Летапіс нот”, “Летапіс выяўленчых выданняў”, “Беларусь у сусветным друку”;

— штогоднікамі: "Кнігі Беларусі", "Паказальнік бібліяграфічных дапаможнікаў Беларусі";

— з бібліяграфічнай інфармацыяй на старонках газет, часопісаў, з рэкламнымі плакатамі, лістоўкамі, закладкамі.

Мэтазгодна выкарыстоўваць паказальнікі бягучай літаратуры, якія складаюцца рэспубліканскімі і абласнымі бібліятэкамі. Рассейванне інфармацыі аб выданні краязнаўчых дакументаў робіць дзейнасць камплектатара па выяўленні краязнаўчых дакументаў даволі складанай.

Дакамплектаванне КФ ажыцяўляецца шляхамі выкарыстання: абменна-рэзервовых фондаў бібліятэк; букіністычных магазінаў; аукцыёнаў; знаёмства з прыватнымі зборамі краязнаўцаў і кнігалюбаў; архівамі навуковых і навукова-даследчых устаноў і арганізацый, навучальных устаноў, прадпрыемстваў і г.д.

Краязнаўчыя фонды дапаўняюцца копіямі краязнаўчых дакументаў на розных носьбітах: ксеракопіі, мікрафільмы. Рэтраспектыўнага камплектавання патрабуюць фонды мясцовых перыядычных выданняў (асноўны сродак — рэпрадуцыраванне).

Кантроль за паступленнем краязнаўчых дакументаў у фонд бібліятэкі ажыццяўляецца з дапамогай: картатэкі бягучага камплектавання, картатэкі рэтраспектыўнага камплектавання.

Асобныя картатэкі па КФ не ствараюць, а ў агульных картатэках (на ўвесь фонд бібліятэкі) выдзяляюць раздзел “Краязнаўства”. КФ універсальных абласных бібліятэк фарміруецца па прынцыпу максімальна магчымай паўнаты ў разліку на шматгадовае (вечнае) захаванне. Акрамя таго, УНАБ выконваюць функцыю дэпазітарнага захавання краязнаўчых і мясцовых дакументаў і таму атрымліваюць ад іншых бібліятэк края краязнаўчыя і мясцовыя дакументы. Мясцовыя публічныя бібліятэкі максімальна поўна камплектуюцца і садейнічаюць выкарыстанню краязнаўчага фонда сваёй зоны абслугоўвання, але яна абмежавана, таму бібліятэкі, пры неабходнасці выключаюць краязнаўчыя дакументы і перадаюць іх у дэпазітарны фонд УНАБ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пытанне 3. Агульныя і дапаможныя прыметы вызначэння краязнаўчай каштоўнасці дакумента. Крыніцы папаўнення фондаў краязнаўчых і мясцовых дакументаў

Каб набыць краязнаўчыя дакументы ў фонд, трэба зрабіць экспертызу краязнаўчай каштоўнасці дакумента.

**Краязнаўчая каштоўнасць дакумента** — сукупнасць зместавых і фармальных характарыстык, якія дазваляюць бібліятэкару аддаць перавагу таму або іншаму краязнаўчаму дакументу, ажыццявіць яго асэнсаваны выбар як аб'екта фарміравання краязнаўчага фонда. Камплектатар пры аналізе каштоўнасці краязнаўчага дакумента (КД) грунтуецца на агульныя прыметы (або крытэрыі) і дапаможныя прыметы (або крытэрыі). Агульныя прыметы дазваляюць вызначыць каштоўнасць КД для яго захавання:

— змястоўная сувязь з азначаным краем;
— узровень суадносін задачам, тыпу або віду, профілю бібліятэкі;
— наколькі КД адпавядае краязнаўчым патрэбнасцям абанентаў бібліятэкі;
— актуальнасць, навізна;
— навуковая або мастацкая каштоўнасць.

Каб вызначыць прыярытэт аднаго КД перад іншым у мэтах яго набыцця ў краязнаўчы фонд бібліятэкі, каб была магчымасць адрозніць каштоўны КД ад малакаштоўнага (у краязнаўчым сэнсе), трэба ўлічваць дапаможныя прыметы (крытэрыі) краязнаўчай каштоўнасці дакумента:

— шырокае сацыяльнае прызначэнне дакумента;
— функцыянальнае прызначэнне для пазнання края;
— мясцовае паходжанне і выданне дакумента;
— комплексны характар яго зместа;
— гуманітарны сэнс інфармацыі, якая прысутнічае ў дакуменце;
— аб'ём краязнаўчай інфармацыі;
— аўтарства;
— мова дакумента;
— час стварэння і выдання дакумента.

Такім чынам, ідэальны (эталонна) каштоўны краязнаўчы дакумент валодае сукупнасцю краязнаўчых якасцей: ён звязаны зместам з краем; шырокага сацыяльнага прызначэння; функцыянальна прызначан для вывучэння края; створан і выдадзен у краі; напісаны мясцовым аўтарам; комплекснага характару; гуманітарнага зместу; цалкам прысвечан краю; выдадзены на дзяржаўнай мове або мове карэннага насельніцтва; супадае па часу стварэння, выдання і апісання мясцовых падзей. Камплектатар грунтуецца на прыметы ідэяльна каштоўнага КД, параўноўвае з ім новы КД і толькі тады прымае рашэнне аб набыцці яго ў фонд бібліятэкі, вызначае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

колькасць экземпляраў, месца захавання, спосаб выкарыстання, вырашае і пытанне аб адлюстраванні КД у краязнаўчым даведачна-бібліяграфічным апараце, у бібліяграфічным дапаможніку, на выставе і інш. Краязнаўчая каштоўнасць дакумента — гэта інтэгральны крытэрый, які дазваляе адрозніць больш каштоўны ў краязнаўчым сэнсе дакумент ад менш каштоўнага.

Найбольш каштоўныя краязнаўчыя дакументы складаюць **ядро КФ.** Спецыяліст улічвае ўсе характарыстыкі дакумента і прымае рашэнне:

— набыць КД у: фонд дэпазітарнага захавання, фонд аператыўнага абслугоўвання ў краязнаўчым аддзеле, для іншых структурных падраздзяленняў бібліятэкі;

— выдаваць на: дом, па МБА, кнігаабмену;

— адлюстраваць: у краязнаўчым даведачна-бібліяграфічным апараце, у бібліяграфічных паказальніках, на выставе;

— вызначаецца экземплярнасць КД УНАБ: мінімальная экземплярнасць КД – 2-3 экземпляры, мясцовых выданняў – 1-2 экземпляры; максімальная экземплярнасць – кожная бібліятэка вызначае сама. Пры гэтым улічвае абставіны: час стварэння КД, цяжкасці набыцця страчаных экземпляраў, кошт дакамплектавання фонда КД, улік мясцовых умоў, структуры бібліятэкі, неабходнасць забеспячэння КД іншых бібліятэк края і г.д.

**Асноўныя крыніцы** папаўнення фондаў краязнаўчымі і мясцовымі дакументамі:

— бібліятэчныя калектары;
— кніжныя магазіны;
— органы па распаўсюджванні перыядычных выданняў;
— бібліятэкі, якія маюць абменныя фонды;
— аукцыёны;
— установы, арганізацыі, НДІ, вучэбныя ўстановы, якія ствараюць і распаўсюджваюць КД;
— прыватныя асобы, якія перадаюць КД у бібліятэкі за плату або бясплатна і г.д.

Асноўныя спосабы папаўнення КФ краязнаўчымі і мясцовымі дакументамі:

— пакупка;
— атрыманне абавязковага экземпляра;
— падпіска;
— атрыманне дакументаў у дар;
— па дагаварам з мясцовымі ўстановамі, якія выдаюць КД;
— кнігаабмен;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

— аднаўленне выданняў, якіх нехапае або яны наогул адсутнічаюць у КФ сродкамі капіравальна-множнай тэхнікі.

**Пытанне 4. Улік і апрацоўка краязнаўчых дакументаў**

Улік і апрацоўка падфонда краязнаўчых дакументаў. Як і з усімі дакументамі, якія паступаюць або выбываюць з фонда бібліятэкі, з краязнаўчымі дакументамі ажыццяўляюць: інтэграваны або сумарны ўлік – партыі кніг; дыферанцыраваны або індывідуальны ўлік. Тэхнічная і навуковая апрацоўка ажыццяўляецца ў тым парадку, які ўстанавіў аддзел камплектавання і апрацоўкі бібліятэкі.

**Сумарны ўлік.** У большасці бібліятэк сумарны ўлік КД не ажыццяўляецца: гэтыя бібліятэкі не маюць магчымасцей улічваць велічыню фонда, яго састаў, паступленне і выбыццё КД, а гэта значыць, у гэтых бібліятэках немагчыма навукова кіраваць фарміраваннем і выкарыстаннем фонда. Іншыя бібліятэкі (УНАБ і ЦБС) у кнізе сумарнага ўліку у свабодных графах выдзяляюць КД, што дазваляе ведаць агульны аб’ём КФ, колькасць паступленняў і выбыццё КД. У аддзелах (сектарах) краязнаўства або сектары дэпазітарнага захоўвання вядуцца спецыяльныя кнігі **сумарнага ўліка краязнаўчых і мясцовых выданняў**, дзе адбываецца рэгістрацыя дакументаў па прыметах: зместу, відаў, мове выдання, крыніцы паступлення, месцазнаходжання ў бібліятэцы. Адасобленым сумарным улікам ахоплена толькі нейкая частка КФ (якая ў аддзеле, або сектары).

**Індывідуальны ўлік** КД ажыццяўляецца ў агульных для ўсяго фонда бібліятэкі формах індывідуальнага (дэферэнцыраванага) уліка, але гэта не выключае вядзенне аддзеламі краязнаўства асабістых улікавых форм. Парадак **тэхнічнай апрацоўкі КД** той жа, што і іншых дакументаў, якія складаюць агульны фонд бібліятэкі.

**Навуковая апрацоўка КД**. У адных універсальных бібліятэках аналітыка-сінтэтычную апрацоўку КД ажыццяўляюць толькі ў аддзеле апрацоўкі; у іншых УНАБ, аддзелы краязнаўства робяць аналітыка-сінтэтычную "даапрацоўку". Гэта робіцца, каб у розных аспектах адлюстраваць змест КД у краязнаўчым даведачна-бібліяграфічным апараце бібліятэкі.

Зараз у УНАБ выкарыстоўваюць 3 асноўных спосабы выдзялення КД:

1. Да індэксу аддзела далучаецца тэрытарыяльнае тыпавое дзяленне ў суадносінах з табліцамі ББК для краязнаўчага каталога бібліятэк.

2. На дакументах, якія нельга камплексіраваць па тэрытарыяльнай прыкмеце, перад індэксам аддзела ставіцца ўмоўнае азначэнне "К", якім вызначаецца КД.

3. Дакументы, якія толькі часткова прысвечаны краю (бо звесткі аб краі прысутнічаюць у відзе глаў, або абзацаў) замест "К" перад індэксам ставяць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

"ДП" (дэпазітарнае захоўванне), а прыналежнасць да краязнаўства вызначаецца праз "плюс" на тытульным лісце выдання.

Для нагляднага выдзялення КД выкарыстоўваюць каляровыя ярлыкі.

**Пытанне 5. Размяшчэнне і захаванне краязнаўчага фонда**

Размяшчэнне і захаванне краязнаўчага фонда. Вынікам рацыянальнага размяшчэння КФ з’яўляецца ўзровень яго выкарыстання і захавання. Праблема размяшчэння КФ, у тэарэтычным плане, не выражана, не распрацавана, бо адсутнічаюць абгрунтаваныя метадычныя рэкамендацыі і арганізацыйна-тэхналагічныя прыёмы. У практыцы назіраецца: шматварыянтнасць арганізацыйнай структуры КФ; мноства спосабаў размяшчэння і расстаноўкі КД; працэс драблення КФ.

Бібліятэкі па рознаму вырашаюць пытанне **структуравання КФ:**

а) кніжны збор (краязнаўчы) — асобна захоўваецца ў краязнаўчым аддзеле;

б) КФ не выдзяляецца, але ў інфармацыйна-бібліяграфічным аддзеле збіраецца падсобны КФ і даведачны апарат;

в) КФ не выдзяляецца з агульнага фонда, большая яго частка (да 70%) размяшчаецца ў фондасховішчы, у структуры якога арганізуецца дэпазітарны фонд КФ і калекцыя мясцовых выданняў.

Іншыя дакументы размяркоўваюцца па аддзелах абслугоўвання фонда па іх профілю.

Такім чынам, пад **арганізацыйнай структурай** КФ разумеюць фонд: аддзела (сектара) краязнаўства, сектара або групы дэпазітарнага захоўвання, групу выдзеленых па сцелажах краязнаўчых дакументаў.

Вызначыць аптымальную структуру КФ вельмі складана, бо фізічна немагчыма сканцэнтраваць у адным месцы ўсе КД (у кожным аддзеле ёсць па свайму профілю КД). Таму неабходна мець комплекс прыёмаў і сродкаў забеспячэння ўзаемасувязі розных частак КФ, якія змешчаны ў розных аддзелах бібліятэкі.

КФ па функцыянальным прызначэнні дзеліцца на дейнічаючы фонд і запасны, чытацкі і службовы, аператыўны і дэпазітарны, асноўны і дапаможны.

Універсальныя навуковыя абласныя бібліятэкі.

1. КФ аддзела краязнаўства абласных бібліятэк — дзейнічаючы фонд, які выкарыстоўваюць абаненты.

— Каб захаваць унікальную, рэдкую частку дзейнічаючага фонда, ствараюць запасны фонд (рэзервовы, страхавы).

— Дзейнічаючыя фонды дзеляцца на: чытацкія фонды (фонд аддзела краязнаўства, аддзела абслугоўвання), службовыя – бібліятэкары кожны дзень звяртаюцца да іх (падсобны фонд сектара краязнаўчай бібліяграфіі).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

— Чытацкі КФ дзеліцца на: аператыўны (фонд аддзела краязнаўства), дэпазітарны (дэпазітарны фонд КД у структуры фонда асноўнага захавання).

— Аператыўныя фонды дзеляцца: *асноўныя фонды*, яны прызначаны для забеспячэння пастаяннага (доўгага па часу) захоўвання КД. Аператыўнасць дасягаецца шляхам фарміравання падсобных фондаў чытальных залаў краязнаўчай літаратуры. *Дапаможныя фонды* ствараюць для аператыўнага фізічнага і інтэлектуальнага доступа да дакументнай інфармацыі, якая прысутнічае ў асноўных фондах (інтэлектуальны доступ шляхам стварэння даведачна-бібліяграфічнага фонда ў сектары краязнаўчай бібліяграфіі).

Такім чынам, КФ уяўляе сабой складаную структурную з'яву, якая дазваляе захоўваць і выкарыстоўваць КД.

2. У падсобным фондзе сектара краязнаўчай бібліяграфіі інфармацыйна-бібліяграфічнага аддзела абласной бібліятэкі збіраюць: статыстычныя даведнікі; штогоднікі, бібліяграфічныя дапаможнікі; манаграфічныя выданні (аб'ём 100-300 экземпляраў). Карыстаюцца супрацоўнікі і часткова абаненты бібліятэкі.

3. Дэпазітарны фонд (ДФ) УНАБ захоўвае КД і мясцовыя выданні, якія паступілі незалежна з якіх крыніц. У ДФ КД пастаянна захоўваюцца ў 2-4 экземплярах, мясцовыя выданні — 1-2 экземплярах. ДФ з'яўляецца састаўной часткай фонда асноўнага захоўвання і выдзяляецца на асобных сцелажах. КД, якія ўключаюцца ў фонды і іншых аддзелаў бібліятэкі, згодна іх профіля, з'яўляюцца, у асноўным, дублетнымі і прызначаны для выкарыстання абанентамі ў гэтых аддзелах.

4. Спецвіды тэхнічнай дакументацыі, нотныя выданні, выяўленчыя выданні, кінафотафонадакументы, выданні на замежных мовах, неапублікаваныя дакументы, рэдкія, рукапісныя матэрыялы размяшчаюцца ў фондах суадносных аддзелаў УНАБ.

5. Мясцовыя перыядычныя выданні захоўваюцца па-рознаму: у аддзеле краязнаўства (апошніх год выдання); у аддзеле асноўнага захоўвання (за мінулыя гады); а можна незалежна ад года выдання ў адным з гэтых аддзелаў сканцэнтраваць падфонд перыядычных выданняў.

КФ знаходзіцца ў розных аддзелах бібліятэкі, таму для яго выкарыстання і папулярызацыі трэба стварыць краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны апарат, і перш за ўсё, зводны краязнаўчы каталог: ён аб'ядноўвае КД; забяспечвае прадметную сувязь краязнаўчых выданняў, указвае месцазнаходжанне КД.

Цэнтральныя бібліятэчныя сістэмы публічных бібліятэк.

У ЦБС КФ у найбольш поўным складзе фарміруецца ў **ЦБ**: у чытальнай зале збіраюцца каштоўныя КД, якія карыстаюцца попытам; у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

галіновыя і спецыялізаваныя аддзелы ідуць дублетныя экземпляры краязнаўчых галіновых выданняў; на абанеменце збіраюцца КД, якіх у бібліятэцы ў дастатковай колькасці. КД размяшчаюцца на асобных паліцах, выставах "Наш горад (сяло)".

Бібліятэкі-філіялы збіраюць агульныя выданні аб вобласці, горадзе, раёне; выданні, прысвечаныя сваёй зоне абслугоўвання (сяло, мікрараён горада). У ЦБС ствараюць тэматычныя альбомы, папкі выразак з газет, летапісы краю. З мэтай выдзялення КД бібліятэкі выкарыстоўваюць "малыя" лакальныя формы арганізацыі КФ: кніжныя выставы; тэматычныя папкі газетных выразак; калекцыі КД, якія былі падараны мясцовым краязнаўцам; падборкі краязнаўчых дакументаў па вызначанай тэме; набор фатаграфій мясцовых славутасцей; камплекты слайдаў, створаных карыстальнікамі бібліятэкі і інш.

Размеркаванне КФ на адносна самастойныя структурныя часткі дае магчымасць свабодна манеўрыраваць зборамі КД для прадстаўлення іх абанентам і гарантаванага захавання.

КД расстаўляюцца па паліцах згодна спосабу расстаноўкі ўсяго фонда бібліятэкі: сістэматычная расстаноўка, тэматычная, прадметная, у прыватнасці, па табліцах ББК. У памяшканнях, дзе захоўваецца КФ, падтрымліваецца аптымальная тэмпература, вільготнасць паветра, суадносны санітарна-гігіенічны рэжым, забяспечваюцца проціпажарныя і сацыяльныя мерапрыемствы аховы КД. Краязнаўчыя матэрыялы рэдка перавыдаюцца і лепшыя з іх хутка фізічна зношваюцца, таму ў бібліятэках пераводзяць краязнаўчыя дакументы з бумажных на іншыя формы носьбітаў, ствараюць і страхавы КФ на мікра і электронных носьбітах.

Аптымальнае фарміраванне краязнаўчага фонда дазволіць арганізаваць навукова абгрунтаванае кіраванне гэтым фондам і забяспечыць максімальна поўнае задавальненне рэальных і патэнцыяльных запытаў карыстальнікаў.

**Пытанне 6. Падыходы да фарміравання электронных краязнаўчых бібліятэк.**

На сучасным этапе у бібліятэках інтэнсіўна вядзецца работа па алічбоўцы каштоўных краязнаўчых дакументаў. Сярод іх кнігі, часопісы, газеты, ноты, карты, мульцімедыйныя выданні і інш.Алічбоўваюцца такія выданні, як спісы населеных месцаў рэгіёнаў, статыстычныя зборнікі, адрасныя календары і памятныя кніжкі, дарэвалюцыйныя і даваенныя перыядычныя выданні і інш. Храналагічныя і моўныя межы для дакументаў, уключаемых у ЭБ, як правіла, не ўстанаўліваюцца.

Акрамя алічбоўкі ўласных фондаў, фарміраванне ЭІР вядзецца шляхам карпаратыўнага ўзаемадзеяння ў рамках розных праектаў. (як “Региональные

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

своды книжных памятников” Ніжагародскай АУНБ і інш. у межах праграмы “Культура Расіі”).

Фарміраванне электронных бібліятэк вядзецца ў асноўным па калекцыйнаму прынцыпу, што дазваляе адлюстроўваць пэўныя віды дакументаў і адлюстроўваць сацыяльна значны змест. ЭБ фарміруецца на аснове існуючых калекцый выданняў: кніг, карт, перыёдыкі пэўнага часу, а таксама шляхам фарміравання новых электронных калекцый: тэматычных, прадметных, а таксама па прымеце каштоўнасці. У ЭБ уключаюцца электронныя калекцыі, ствараемыя для інфармацыйнага забеспячэння буйных комплексных праграм/праектаў, актуальных праблем развіцця рэгіёнаў, уключаючы электронныя калекцыі для падтрымкі канкрэтных даследаванняў і распрацовак, напрыклад, междысцыплінарных. Пры фарміраванні ЭБ бібліятэка ўзаемадзейнічае з іншымі партнерамі: бібліятэкамі ,архівамі, музеямі, навуковымі інстытутамі, адукацыйнымі ўстановамі і інш.

ЭБ з’яўляецца інтэграванай інфармацыйнай сістэмай і ўключае:

- электронны фонд, прызначаны для захавання электронных дакументаў. Электронныя дакументы захоўваюцца ў файлавай сістэме, якая вядзецца сродкамі аперацыйнай сістэмы;
- каталог электроннай бібліятэкі, які захоўвае бібліяграфічныя запісы ў пэўным фармаце і забяспечвае пошук інфармацыі па палям, імпарт/экспарт бібліяграфічных запісаў, вядзенне і захаванне уліковых формаў;
- веб-інтэрфэйс карыстальніка, які забяспечвае фарміраванне пошукавага запыта(як па палях бібліяграфічнага запісу, так і па тэксту дакумента), прагляд дакумента, навігацыю па раздзелах і калецыях электроннай бібліятэкі і інш.
- сістэму адміністравання, якая забяспечвае падключэнне каталога да пошукавага мехнізма электроннай бібліятэкі, настройку параметраў электроннай бібліятэкі, кантроль функцыянавання сістэмы, збор статыстычных даных і інш.

Асноўнымі крыніцамі камплектавання поўных тэкстаў дакументаў для ЭБ з’яўляюцца:

- скініраванне тэкстаў з фонда бібліятэкі;
- атрыманне электронных дакументаў са знешніх крыніц (перадача поўных тэкстаў дакументаў у машыначытальнай форме аўтарамі/праваўладальнікамі);
- стварэнне супрацоўнікамі бібліятэкі ўнікальных краязнаўчых электронных дакументаў, якія не маюць папяровых аналагаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пошук і прагляд дакументаў ЭБ з’яўляецца бясплатным для ўсіх карыстальнікаў. Абмежаванні для прагляду асобных калекцый і дакументаў уводзяцца для забеспячэння праў праваўладальнікаў. У сувязі з гэтым не ўсе дакументы даступны для ўдленых карыстальнікаў. Калі доступ да патрэбнага дакумента закрыт, то дакумент магчыма поўнасцю прагледзець толькі ў аддзелах бібліятэкі.

**Вывады:**

1. Узровень стварэння розных відаў мадэляў на краязнаўчы фонд (вербальнай, структурнай, матэматычнай, бібліяграфічнай) залежыць ад тыпа і віда бібліятэкі, складу і аб’ёму краязнаўчага фонда.
2. Свае асаблівасці маюць этапы і віды камплектавання краязнаўчага фонда, адпрацавана і сістэма дакументазабеспячэння краязнаўчых фондаў універсальных абласных бібліятэк і ЦБС.
3. Для правядзення экспертызы краязнаўчай каштоўнасці дакумента, неабходна ўлічваць агульныя і дапаможныя прыметы вызначэння краязнаўчай каштоўнасці, што дазваляе аптымізаваць камплектаванне КФ.
4. Пэўныя асаблівасці мае ўлік, апрацоўка краязнаўчых дакументаў, а таксама размяшчэнне і захаванасць КФ.
5. Для сучаснага перыяду характэрна фарміраванне электронных краязнаўчых бібліятэк.

## Лекцыя 5. КАРЫСТАЛЬНІК БІБЛІЯТЭКІ ЯК АБ’ЕКТ І СУБ’ЕКТ КРАЯЗНАЎЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

**Пытанні:**

**1. Індывідуальныя, групавыя і калектыўныя карыстальнікі краязнаўчых фондаў і паслуг бібліятэк па краязнаўстве.**

**2. Віды краязнаўчых патрэбнасцей абанентаў.**

**3. Формы ўдзела мясцовага насельніцтва ў рэалізацыі мэт краязнаўчай дзейнасці бібліятэк.**

Мэта: вывучэнне тыпалогіі абанентаў-карыстальнікаў краязнаўчых фондаў і паслуг бібліятэк па краязнаўстве, структуры іх патрэбнасцей, а таксама форм удзелу масцовага насельніцтва ў рэалізацыі мэт краязнаўчай дзейнасці бібліятэк.

### Пытанне 1. Індывідуальныя, групавыя і калектыўныя карыстальнікі краязнаўчых фондаў і паслуг бібліятэк па краязнаўстве

Кантынгент публічных бібліятэк рознага рэгіянальнага ўзроўня (ад універсальных абласных да сельскіх бібліятэк-філіялаў) з’яўляецца **аб’ектам** іх краязнаўчай дзейнасці. Бібліятэкі рэалізуюць краязнаўчую функцыю ў мэтах фарміравання, задавальнення і развіцця краязнаўчых патрэбнасцей,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інтарэсаў і запытаў сваіх карыстальнікаў. Краязнаўчыя патрэбы прымушаюць бібліятэкі наладзіць краязнаўчую работу, стварыць краязнаўчыя дакументныя, бібліяграфічныя і фактаграфічныя рэсурсы, арганізаваць абслугоўванне ў галіне краязнаўства.

Карыстальнік бібліятэкі з'яўляецца актыўным **суб'ектам** краязнаўчай дзейнасці: ён выкарыстоўвае вынікі гэтай дзейнасці, непасрэдна ўдзельнічае ў правядзенні краязнаўчых мерапрыемстваў, у папулярызацыі вынікаў краязнаўчай дзейнасці бібліятэк (КДБ), у фінансавым і матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні КДБ.

Асаблівасць КДБ у тым, што яна разлічана на ўвесь кантынгент абанентаў, на ўсё мясцовае насельніцтва, а таксама і на ўдаленых карыстальнікаў (даследчыкаў края, ураджэнцаў, якія пражываюць за яго межамі). Разам з тым, бібліятэка павінна ажыццяўляць дыферэнцыраваны падыход да абслугоўвання абанентаў, а для гэтага трэба вывучаць **патрэбнасці** абанентаў.

На **краязнаўчыя патрэбнасці карыстальнікаў** уплывае шэраг параметраў асобы:

1. сацыяльна-дэмаграфічныя характэрыстыкі;
2. сацыяльны статут;
3. псіхалагічныя асаблівасці;
4. сістэма каштоўнасных арыентацый;
5. жыццёвы вопыт;
6. як доўга карыстальнік пражывае ў гэтай мясцовасці;
7. прыналежнасць да ўзроставай, нацыянальнай, прафесіянальнай і адукацыйнай групы;
8. мэты, матывы, узровень начытанасці, накіраванасці краязнаўчых інтарэсаў;
9. узровень бібліятэчнай арыентацыі.

Кожны з параметраў уплывае на выбар карыстальнікам краязнаўчых дакументаў (КД), відаў і форм КДБ, паслуг бібліятэкі па краязнаўстве.

Яшчэ не распрацаваны прынцыповыя падыходы да класіфікацыі катэгорый карыстальнікаў краязнаўчых дакументаў, што перашкаджае практычнай рэалізацыі дыференцыраваннага абслугоўвання карыстальнікаў.

Але вопыт бібліятэк сведчыць, што **карыстальнікі** краязнаўчых фондаў (КФ) і паслуг бібліятэк па краязнаўстве па **ўзроўні сацыяльнай арганізацыі** выступаюць як:

індывідуальныя;
групавыя;
калектыўныя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мясцовая публічная бібліятэка, перш за ўсё арыентавана на задавальненне краязнаўчых патрэб індывідуальных карыстальнікаў.

Дыферэнцыраваць бібліятэчнае абслугоўванне па краязнаўстве можна, калі ў аснову **тыпалогіі абанентаў** – карыстальнікаў КФ і паслуг бібліятэкі пакласці **віды дзейнасці** абанентаў, звязаныя з краем:

1. дзейнасць чалавека ў краі (кіруючая, навуковая, вучэбная, грамадская, папулярызатарская);
2. краязнаўчая дзейнасць чалавека па даследаванні края;
3. дзейнасць асоб па арганічнаму "ўключэнню" ў прыроднае, сацыяльнае, культурнае, гістарычнае асяродзе края.

Зыходзячы з такога падыходу, у **структуры краязнаўчых патрэбнасцей** карыстальнікаў выдзяляюць:

- ➢ дзелавыя патрэбнасці;
- ➢ аматарскія патрэбнасці;
- ➢ сацыякультурныя патрэбнасці.

Адсюль выдзяляюць і віды чытання краязнаўчай літаратуры:

- ➢ спецыяльнае (дзелавое) чытанне краязнаўчай літаратуры;
- ➢ свабоднае (агульнаадукацыйнае) чытанне краязнаўчай літаратуры.

**Катэгорыі абанентаў** – карыстальнікаў КФ і паслуг бібліятэк па краязнаўстве (*індывідуальныя абаненты*):

1. Карыстальнікі, якія маюць дзелавыя (прафесіянальныя) краязнаўчыя патрэбнасці, змест якіх звязан з іх прафесіянальнай дзейнасцю:

- ➢ супрацоўнікі мясцовых органаў дзяржаўнай улады;
- ➢ дэпутаты мясцовых Саветаў народных дэпутатаў;
- ➢ спецыялісты профільных для края галін і сфер дзейнасці;
- ➢ педагагічныя работнікі (настаўнікі сярэдніх школ, выкладчыкі гуманітарных вучылішч, каледжаў, інстытутаў, універсітэтаў);
- ➢ супрацоўнікі архіваў, музеяў, бібліятэк, органаў НТІ;
- ➢ работнікі экскурсійна-турыстскіх бюро;
- ➢ супрацоўнікі мясцовых выдавецтваў, рэдакцый мясцовых газет і часопісаў, мясцовага радыё і тэлебачання, кніжных магазінаў;
- ➢ творчая інтэлігенцыя (мастакі, кампазітары, музыканты, пісьменнікі, паэты, драматургі);
- ➢ студэнты і вучні (яны звяртаюцца да КД і паслуг бібліятэк з вучэбнымі мэтамі).

Гэтыя абаненты павінны валодаць даволі поўнымі ведамі аб краі, што патрабуе іх прафесіянальная (або вучэбная) дзейнаць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. **Самастойную** катэгорыю абанентаў – карыстальнікаў КФ і паслуг бібліятэк па краязнаўстве складаюць краязнаўцы-даследчыкі, члены мясцовых таварыстваў краязнаўцаў.

Краязнавец — гэта спецыяліст па краязнаўстве. Краязнаўцы вывучаюць свой край па сваёй ініцыятыве, самастойна і ўсё жыццё, хаця гэта можа і не быць звязана з іх прафесійнай дзейнасцю. Яны маюць глыбокія веды аб гісторыі, прыродзе, культуры края, пры гэтым дзелавое чытанне спалучаецца ў іх з самаадукацыйным. Такім абанентам біліятэка павінна спрыяць у атрыманні новых краязнаўчых ведаў, прадстаўляць інфармацыю аб новых КД па тэмах, якія цікавяць краяведаў.

3. Самую вялікую групу складаюць карыстальнікі – носьбіты сацыякультурнай краязнаўчайпатрэбнасці, звязанай з неабходнасцю пазнання края з мэтай свабоднай арыентацыі ў ім, з мэтай адаптацыі новага пакалення, мігрантаў, перасяленцаў у гэты край.

Задавальняючы агульнакультурныя краязнаўчыя патрэбнасці, бібліятэка ўлічвае ўзрост абанента, як доўга жыве ў гэтым краі і ўзровень пазнання ім края.

Выдзяляюцца наступныя ўзроўні пазнання края карыстальнікамі:

1. нулявы ўзровень (напрыклад мігранты – не маюць ні эмпірычных, ні тэарэтычных ведаў аб краі);

2. эмпірычны ўзровень (напрыклад, дзеці – маюць рэальнае, эмпірычнае веданне края);

3. тэарэтычны ўзровень (вучоныя, які ствараюць новыя тэарэтычныя краязнаўчыя веды);

4. тэарэтыка-эмпірычны ўзровень (супрацоўнікі краязнаўчых музеяў, мясцовыя краязнаўцы, старажылы).

З улікам пералічаных узроўняў пазнання края карыстальнікамі, а таксама наяўнасці і ўстойлівасці краязнаўчых патрэбнасцей, супрацоўнікі мясцовай публічнай бібліятэкі:

- ажыццяўляюць індывідуальны падыход да абанентаў,
- удасканальваюць сродкі і метады КДБ, якія накіраваны на фарміраванне, задавальненне і развіццё сацыякультурных краязнаўчых патрэб карыстальнікаў.

Мясцовыя публічныя бібліятэкі спрыяюць **кансалідацыі жыхароў** края:

- з дапамогай краязнаўчых бібліятэчна-бібліяграфічных рэсурсаў і сродкаў;
- шляхам выхавання ў насельніцтва пачуцця сапраўдных гаспадароў свайго сяла, горада, раёна, вобласці;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

➢ шляхам адраджэння і захавання нацыянальных этнічных, прыродна-геаграфічных, культурна-гістарычных, моўных традыцый края;

➢ бібліятэкі спрыяюць старажылам і мігрантам у паглыбленні і пашырэнні ведаў аб сваёй нацыянальна-тэрытарыяльнай культуры;

➢ спрыяюць фарміраванню культуры міжнацыянальных зносін;

➢ выхоўваюць цярпімасць і павагу да гісторыі, традыцый, культуры, мовы нацыі і народнасцей, якія пражываюць у межах або за межамі сваіх нацыянальна-тэрытарыяльных стварэнняў;

➢ некарэннаму насельніцтву забяспечваецца магчымасць хутчэй прыстасавацца да мясцовых умоў, атрымаць прадстаўленне аб краі цалкам, або яго асобных аб'ектах, людзях;

➢ бібліятэкі павінны збіраць матэрыял аб выдатных людзях не толькі карэннай, але і іншых нацыянальнасцей гэтага краю і інш.

Прыярытэт у абслугоўванні па краязнаўстве належыць індывідуальным абанентам (аб іх і шла гаворка), але бібліятэкі абслугоўваюць і калектыўных абанентаў.

*Калектыўныя абаненты* УНАБ і ЦБС:

➢ органы дзяржаўнай улады ў гэтым краі;

➢ мясцовыя Саветы народных дэпутатаў;

➢ прадпрыемствы і ўстановы, дзейнасць якіх звязана з профільнымі для края галінамі, або непасрэдна з краязнаўствам;

➢ вучэбныя ўстановы (школы, гімназіі, вучылішчы, тэхнікумы, каледжы, інстытуты, універсітэты);

➢ архівы, музеі, выдавецтвы, рэдакцыі мясцовых газет, мясцовыя тэлерадыёкампаніі, клубы, органы НТІ, кніжныя магазіны.

Гэтыя калектыўныя спажыўцы інфармацыі выкарыстоўваюць краязнаўчыя веды ў навукова-даследчых, вучэбных, вытворчых і іншых мэтах.

Мясцовыя публічныя бібліятэкі, абслугоўваючы калектыўных абанентаў:

➢ інфармуюць іх аб новай літаратуры;

➢ выконваюць краязнаўчыя даведкі;

➢ праводзяць масавыя мерапрыемствы;

➢ каардынуюць сваю дзейнасць са спецыяльнымі бібліятэкамі гэтых устаноў (абмен інфармацыяй і ўзаемавыкарыстанне краязнаўчых фондаў).

Калектыўнае інфармаванне ў галіне краязнаўства не заўсёды мэтанакіравана. Значна зніжае эфектыўнасць бібліятэчных паслуг:

➢ безадраснасць краязнаўчага інфармавання пры абслугоўванні калектыўных абанентаў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- незацікаўленасць у ім асобных мясцовых устаноў і арганізацый, якія не арыентаваны на рэгіянальныя прабемы.

Праяўляецца гэта ў тым, што большасць абанентаў, якія атрымліваюць краязнаўчую інфармацыю на калектыў, не з’яўляюцца чытачамі універсальнай абласной бібліятэкі або ЦБС.

У той жа час, удакладненне профіля даследчых, вучэбных і вытворчых праграм мясцовых устаноў і арганізацый дазваляе публічнай бібліятэцы канкрэтызаваць сваю краязнаўчую работу, больш абгрунтавана весці каардынацыю дзейнасці са спецыяльнамі бібліятэкамі, функцыяніруючымі ў структуры гэтых устаноў, ажыццяўляць абмен інфармацыяй і ўзаемавыкарыстанне краязнаўчых фондаў. Асабліва гэта неабходна ў тым выпадку, калі ўстанова або арганізацыя не мае сваёй бібліятэкі і абслугоўвае яе калектыў мясцовая публічная бібліятэка.

Узровень бібліятэчнага абслугоўвання калектыўных абанентаў не можа канкурыраваць з узроўнем забяспечаннасці індывідуальных абанентаў, якія звяртаюцца ў мясцовую публічную бібліятэку за краязнаўчымі дакументамі і інфармацыяй краязнаўчага зместу.

*Групавыя абаненты* бібліятэк — гэта грамадскія арганізацыі, даследчыя групы, удзельнікі краязнаўчых канферэнцый, экспедыцый. Сярод іх:

- члены абласных, гарадскіх і іншых краязнаўчых арганізацый;
- удзельнікі нефармальных аб’яднанняў і прафесійных таварыстваў (асацыяцый), якія вядуць даследаванні і папулярызацыю гісторыі, прыроды, навукі, культуры края;
- члены аб’яднанняў па ахове помнікаў гісторыі і культуры;
- члены фонда культуры, кнігалюбаў і іншых арганізацый, якія займаюцца вывучэннем края;
- земляцтвы, творчыя калектывы, нацыянальна-культурныя суполкі і інш.

Бібліятэкі задавальняюць прафесійныя і непрафесійныя краязнаўчыя патрэбнасці групавых карыстальнікаў, дакументна і інфармацыйна забяспечваюць мясцовыя краязнаўчыя праграмы шляхам прадстаўлення краязнаўчых фондаў і краязнаўчай бібліяграфічнай інфармацыі. Удзел у рэалізацыі краязнаўчых праграм — шлях павышэння сацыянальнага прэстыжу масавых публічных бібліятэк.

**Пытанне 2. Віды краязнаўчых патрэбнасцей спажыўцоў інфармацыі**

Бібліятэка не толькі фарміруе, задавальняе і развівае дзелавыя, аматарскія, сацыякультурныя краязнаўчыя патрэбнасці абанентаў, але павінна ўлічваць інтарэсы і патрэбнасці патэнцыяльных спажыўцоў інфармацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Краязнаўчыя патрэбнасці** абанентаў падзяляюцца на выяўленыя і нявыяўленыя.

**Выяўленая** краязнаўчая патрэбнасць адлюстроўваецца ў статыстыцы выдачы, (некаторыя бібліятэкі вядуць улік выданых КД); фіксуюцца запыты абанентаў, улічваюцца пажаданні чытачоў — гэтыя патрэбы вызначаюцца супрацоўнікамі бібліятэкі.

Нявыяўленая краязнаўчая патрэба — звесткі аб ёй атрымліваюць

- шляхам спецыяльных даследаванняў: назіранне, інтэрв'ю, апытанне абанентаў,
- на падставе вывучэння профілю края, складу і структуры яго насельніцтва.

Усё гэта вызначае круг патэнцыяльных карыстальнікаў КФ, дае магчымасць параўнаць краязнаўчыя рэсурсы і вынікі вывучэння краязнаўчых патрэбнасцей, вызначыць прыярытэтныя кірункі работы, ажыццявіць апярэджваючае абслугоўванне па краязнаўству, удакладняць тэрытарыяльныя межы края, далучыць індывідуальных, групавых і калектыўных абанентаў да карыстання КД і інш. Супрацоўнікі краязнаўчага аддзела (сектара) павінны бесперапынна паглыбляць веданне края.

Звесткі аб краі, якія неабходны бібліятэчным работнікам, канцэнтруюцца у:

1. адраснай картатэкі;
2. картатэкі эканамічнага і культурнага профіля горада, сяла;
3. картатэкі чытацкага профіля;
4. плане (схеме, карце) раёна, горада, сяла (вывешваецца ля ўваходу у бібліятэку) — там адзначаны прадпрыемствы, установы, паркі, вуліцы, філіялы ЦБС і г.д.

Спецыфіка КДБ патрабуе выдзялення ў штаце супрацоўнікаў аддзела краязнаўства пасады менеджера, або стварэння маркетынгавай службы, якая:

- вывучае "краязнаўчы рынак" або склад і стуктуру краязнаўчых патрэбнасцей, інтарэсаў і запытаў абанентаў;
- вывучаюцца абаненты бібліятэкі, а таксама жыхары края, якія не карыстаюцца паслугамі бібліятэк, што дазваляе вылучыць рэальных і патэнцыяльных карыстальнікаў КФ і паслуг бібліятэкі па краязнаўстве.

Краязнаўчая дзейнасць бібліятэкі — гэта шлях уключэння публічнай бібліятэкі ў жыццё мясцовага згуртавання. Калі бібліятэка ўсведамляе сябе як частку края, тады яна находзіць сабе мноства сяброў, партнёраў у розных слаях насельніцтва.

## 3. Формы ўдзелу мясцовага насельніцтва ў рэалізацыі мэт краязнаўчай дзейнасці бібліятэк

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Удзел мясцовага насельніцтва ў рэалізацыі мэт КДБ можа быць:

а) рэсурсным (дакументным, фінансавым, матэрыяльна-тэхнічным);

б) дзейнасным (удзел у правядзенні краязнаўчых мерапрыемстваў, папулярызацыя вынікаў КДБ).

Існуюць 2 формы дакументнага забеспячэння КДБ з боку абанентаў:

1. перадача ў дар мясцовай публічнай бібліятэцы:

а) прыватных калекцый КД і мясцовых выданняў (кніг, мясцовых газет і часопісаў, карт, нот і фотаальбомаў, рэпрадукцый, эстампаў, плакатаў, лістовак, праспектаў, грампластынак, марак, паштовак);

б) папкі выразак з газет і часопісаў і г.д.

2. перадача ў фонд бібліятэкі сваіх краязнаўчых прац (кніг, артыкулаў, тэзісаў дакладаў), а таксама альбомаў фатаграфій, запісаў успамінаў старажылаў, мясцовага фальклору, аматарскіх кінафільмаў і відэазапісаў.

Дакументныя паслугі чытачоў — важная крыніца бягучага і рэтраспектыўнага камплектавання краязнаўчага фонда.

**Рэсурсная** дапамога абанентаў можа заключацца ў фінансіраванні і матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні КДБ.

Яна рэалізуецца ў форме індывідуальна-ініцыатыўнага, кааператыўна-камерцыйнага, грамадскага, або рэгіянальна-дзяржаўнага субсідзіравання КДБ.

**Дзейнасны** кірунак удзелу абанентаў у КДБ мае 2 формы:

1. саўдзел у папулярызацыі краязнаўчых ведаў, правядзенні краязнўчых мерапрыемстваў і стварэнні паслуг бібліятэкі па краязнаўстве;

2. папулярызацыя вынікаў КДБ па радыё, телебачанню, у друку і г.д.

Абаненты актыўна ўдзельнічаюць у краязнаўчых мерапрыемствах:

— у арганізацыі і правядзенні прэзентацый;
— абмеркаванні краязначай кнігі або мясцовага выдання;
— у дыспуце;
— вечары-сустрэчы з прадстаўнікамі мясцовай улады, мясцовымі дзеячамі, пісьменнікамі, краяведамі;
— удзел у прэсканферэнцыях;
— аукцыёне-вектарыне;
— конкурсе на лепшага знаўца края або краязнаўчай літаратуры;
— гульні-падарожжы па роднаму краю;
— чытацкай канферэнцыі;
— краязнаўчых чытаннях;
— дні краязнаўцы;
— у правядзенні свята горада, сяла, вуліцы, установы, прадпрыемства, навучальнай установы і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мясцовая публічная бібліятэка — практычна адзіная агульнадаступная ўстанова, якая задавальняе дзелавыя, аматарскія і агульнаадукацыйныя краязнаўчыя патрэбнасці абанентаў бібліятэкі і ўсіх жыхароў края.

З часам будзе расці роля гэтых бібліятэк як маркетынгавага пасрэдніка па краязнаўстве для індывідуальных карыстальнікаў, выдаведстваў, рэдакцый мясцовых газет, сродкаў масавай інфармацыі, мясцовых устаноў і арганізацый.

Вялікі краязнаўчы патэнцыял мясцовых публічных бібліятэк дазваляе хутка рэагаваць на змены краязнаўчых запытаў, пашыраць спектр паслуг, удасканальваць арганізацыю абслугоўвання па краязнаўстве.

**<u>Вывады:</u>**

1. Карыстальнікі краязнаўчых фондаў і паслуг бібліятэк па краязнаўстве на ўзроўні сацыяльнай арганізацыі класіфіцыруюцца на індывідуальныя, групавыя і калектыўныя.

2. Краязнаўчыя патрэбнасці абанентаў дзеляцца на выяўленыя і нявыяўленыя, на іх фарміраванне ўплывае шэраг параметраў асобы.

3. Удзел мясцовага насельніцтва ў рэалізацыі мэт краязнаўчай дзейнасці бібліятэк можа быць рэсурсным (дакументным, фінансавым, матэрыяльна-тэхнічным) або дзейнасным (удзел у правядзенні краязнаўчых мерапрыемстваў, папулярызацыі вынікаў КДБ).

## Лекцыя 6. **АРГАНІЗАЦЫЯ АБСЛУГОЎВАННЯ КАРЫСТАЛЬНІКАЎ БІБЛІЯТЭКІ ПА КРАЯЗНАЎСТВЕ**

**<u>Пытанні:</u>**

**1. Сістэма бібліятэчнага абслугоўвання па краязнаўстве: сastaўныя часткі.**

**2. Асаблівасці арганізацыі абслугоўвання па краязнаўстве ва універсальных абласных, публічных і спецыяльных бібліятэках.**

**3. Фактары, якія ўплываюць на ўзровень бібліятэчнага абслугоўвання па краязнаўстве.**

<u>Мэта:</u> вывучэнне студэнтамі сістэмы бібліятэчнага абслугоўвання па краязнаўстве і яе асаблівасцей у бібліятэках розных відаў.

### Пытанне 1. Сістэма бібліятэчнага абслугоўвання па краязнаўстве: састаўныя часткі

Бібліятэчнае абслугоўванне ў краязнаўчай галіне ажыццяўляецца ў межах агульнай структуры абслугоўвання, яно грунтуецца на агульнабібліятэчных крыніцах, тэхналогіі, методыцы і арганізацыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абслугоўвання на ўзроўні асобнай бібліятэкі, сістэмы бібліятэк рэгіёна або рэспублікі цалкам.

Сістэма бібліятэчнага абслугоўвання па краязнаўстве — сукупнасць узаемазвязаных і дапаўняючых адзін аднаго відаў дзейнасці і паслуг бібліятэк па задавальненні і развіцці краязнаўчых патрэб абанентаў бібліятэкі і, наогул, жыхароў края.

Развіццё бібліятэчнага абслугоўвання ідзе па шляху прадстаўлення роўных магчымасцей усім абанентам, якія карыстаюцца краязнаўчымі фондамі і паслугамі бібліятэк з улікам дынамікі іх краязнаўчых патрэб, інтарэсаў і запытаў.

Сёння неабходна шматмерная і дыферэнцыраваная сістэма бібліятэчнага абслугоўвання па краязнаўстве.

Сістэма бібліятэчна-бібліяграфічнага абслугоўвання ўключае наступныя асноўныя састаўныя часткі або падсістэмы:

- дзейнасць па папулярызацыі і выдачы краязнаўчых дакументаў і іх копій;
- дапамога абанентам у выбары краязнаўчых дакументаў і іх выкарыстанні;
- прадстаўленне краязнаўчага фонда;
- шматаспектнае раскрыццё яго складу і структуры;
- даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне;
- бібліятэчнае інфармаванне і інш.

Асаблівасць бібліятэчнага абслугоўвання па краязнаўстве заключаецца ў наборы арганізацыйных мерапрыемстваў і канкрэтных паслуг бібліятэкі па краязнаўстве.

**Пытанне 2. Асаблівасці арганізацыі абслугоўвання па краязнаўстве ва універсальных абласных, публічных і спецыяльных бібліятэках**

Найбольш высокі ўзровень арганізацыі абслугоўвання па краязнаўстве ёсць ва універсальных абласных бібліятэках рэспублікі, дзе створаны спецыялізаваныя краязнаўчыя структуры: комплексныя краязнаўчыя аддзелы (сектары). У такіх адзінках краязнаўчы фонд выкарыстоўваецца больш актыўна: абарачальнасць КФ — 5-7 (пры агульнай абарачальнасці фонда бібліятэкі — 1-2); склаўся пастаянны кантынгент абанентаў да 4-7 тысяч чалавек.

Комплексныя краязнаўчыя аддзелы (сектары) абласных бібліятэк імкнуцца арыентавацца на ўсё кола абанентаў абласной бібліятэкі, сярод іх карыстальнікаў – краязнаўцы вучоныя і спецыялісты, журналісты СМІ, якія спецыялізуюцца на данай тэматыцы, але таксама вучні школ, гімназій, музеяў, каледжаў, ПТВ, тэхнікумаў, студэнты вышэйшых навучальных устаноў. Вучоныя і спецыялісты абслугоўваюцца краязнаўчымі дакументамі і

ў спецыяльных аддзелах сельскай гаспадаркі, тэхнічнай літаратуры, літаратуры па мастацтве і інш.

У краязнаўчых структурных падраздзяленнях УАНБ для карыстальнікаў ствараюцца аптымальныя ўмовы для поўнага задавальнення прафесійных і агульнакультурных патрэбнасцей у краязнаўчай бібліяграфічнай інфармацыі і першасных дакументах. Але карыстальнікі адзначаюць, што ў абласных бібліятэках сёння неабходна ўдасканальваць методыку папулярызацыі краязнаўчых ведаў; яшчэ недастаткова выкарыстоўваюцца комплексныя метады; бібліятэкі абмяжоўваюцца вузкім колам паслуг. У такіх умовах рэальныя абаненты бібліятэкі не маюць магчымасці выкарыстаць увесь спектр бібліятэчна-бібліяграфічных паслуг у галіне краязнаўства, поўна і эфектыўна выкарыстоўваць краязнаўчы фонд бібліятэкі.

Галоўная задача мясцовых публічных бібліятэк — стварыць неабмежаваныя магчымасці для сваіх карыстальннікаў у выбары і выкарыстанні краязнаўчых дакументаў, сабраных у іх фондах, прадаставіць бібліяграфічную інфармацыю аб існуючых краязнаўчых дакументах (незалежна ад іх наяўнасці ў данай бібліятэцы).

На забеспячэнне даступнасці краязнаўчых фондаў павінна быць накіравана ўся краязнаўчая дзейнасць бібліятэкі: гэта стварэнне сістэмы краязнаўчых каталогаў і картатэк, бібліяграфічных дапаможнікаў, выстаў, правядзенне лекцый, кансультацый, канференцый і г.д.

Адпрацаваная сістэма форм і метадаў папулярызацыі і рэкламы, наяўнасць кадравых і матэрыяльных рэсурсаў дазволіць бібліятэкам з большай паўнатой раскрыць перад сваімі чытачамі каштоўныя краязнаўчыя калекцыі.

Забяспечыць аптымальнае (поўнае і аператыўнае) задавальненне краязнаўчых патрэбнасцей насельніцтва магчыма толькі праз узаемасувязь, каардынацыю дзейнасці абласных бібліятэк з бібліятэкамі края і іншымі ўстановамі, якія фарміруюць фонд краязнаўчых дакументаў:

Спецыяльныя бібліятэкі задавальняюць прафесійныя краязнаўчыя патрэбнасці; дзелавое чытанне, звязанае з навукова-даследчымі, вучэбнымі, вытворчымі, выкладчыцкімі, папуляразатарскімі і іншымі мэтамі.

УНАБ і ЦБС павінны вырашаць шэраг іншых задач:

а) задавальненне агульнакультурных, адукацыйных краязнаўчых патрэбнацей абанентаў;

б) асветніцкая дзейнасць у галіне краязнаўства;

в) далучэнне кожнага жыхара края, усяго кантынгента абанентаў да чытання краязнаўчай літаратуры;

г) распаўсюджванне краязнаўчых ведаў у працоўнай, грамадскай, аматарскай і сямейнай сферы дзейнасці.

Публічныя бібліятэкі, як цэнтры бібліятэчнага краязнаўства, павінны стаць не толькі надзейнымі сховішчамі "рэгіянальнай памяці", але і распаўсюджваць краязнаўчыя веды праз назапашаныя ў бібліятэках краязнаўчыя дакументы; арганізоўваць свабодны доступ карыстальнікаў да краязнаўчых збораў і бібліяграфічнай інфармацыі, якія знаходзяцца ў бібліятэках і, па-магчымасці, за іх межамі.

Мясцовыя публічныя бібліятэкі павінны адыйсці ад стандартызаваных схем абслугоўвання па краязнаўстве і прадставіць карыстальнікам магчымасць выбару з мноства варыянтаў бібліятэчнага абслугоўвання найбольш суадносныя іх патрэбнасцям і запытам. Розныя ўмовы дзейнасці бібліятэк, аб’ём і склад іх рэсурсаў вызначаюць шматварыянтны працэс бібліятэчна-бібліяграфічнага абслугоўвання.

Мясцовая публічная бібліятэка прыцягвае насельніцтва тым, што збірае ў фонды разнастайныя краязнаўчыя дакументы; прадстаўляе магчымасць атрымаць інфармацыю аб іх; комплексна абслугоўвае па краязнаўстве; карыстальнік мае магчымасць удзельнічаць у краязнаўчых масавых мерапраемствах і г.д. Гэтыя абставіны актуалізіруюць праблему тэарэтыка-метадалагічнага абгрунтавання і пашырэння сродкаў, форм і відаў паслуг бібліятэкі па краязнаўстве. У межах даволі жорсткай арганізацыі бібліятэчнага абслугоўвання менавіта наменклатура паслуг здольна пашырыць магчымасці абанентаў у задавальненні сваіх краязнаўчых запытаў; пераўтварыць краязнаўчую дзейнасць бібліятэк у адзін са сродкаў рэалізацыі прынцыпа канкрэтнасці (дакладнасці) абслугоўвання карыстальнікаў.

**Пытанне 3. Фактары, якія ўплываюць на ўзровень бібліятэчнага абслугоўвання па краязнаўстве**

<u>Узровень бібліятэчнага абслугоўвання залежыць ад</u>:

становішча бібліятэчнага сервіса наогул;

размяшчэння мясцовай публічнай бібліятэкі (ці блізка яна знаходзіцца ад чытачоў, ці зручна да яе дабірацца);

палепшанага расклада яе работы;

бясплатнасці карыстання;

адкрытага доступу да фонда;

комплекснага прадстаўлення бібліяграфічнай інфармацыі і першаснага дакумента;

зручнасці памяшканняў, мэблі, абсталявання, якія забяспечваюць абанентам камфорт;

магчымасці атрымання КД на дом, або іх копій, электроннай дастаўкі дакументаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ад усяго гэтага залежыць імідж і сацыяльны прэстыж мясцовай публічнай бібліятэкі як цэнтра бібліятэчнага краязнаўства.

У той жа час эфектыўнасць КДБ залежыць ад супрацоўнікаў бібліятэкі, ад якасці і наменклатуры паслуг па краязнаўстве.

У адным выпадку якасць абслугоўвання па краязнаўстве праяўляецца ў зменах арганізацыйнай структуры бібліятэкі, калі ствараецца аддзел або сектар краязнаўства.

У другім выпадку – праз прыярытэтнае фарміраванне КФ і шматаспектнае раскрыццё яго складу і структуры з дапамогай сістэмы каталогаў, картатэк, бібліяграфічных дапаможнікаў, якія забяспечваюць магчымасці поўнага і свабоднага доступу да першасных дакументных рэсурсаў і аптымізуюць іх выбар.

У трэцім выпадку – праз актуалізацыю праблематыкі бібліятэчна-бібліяграфічнага абслугоўвання.

У чацвёртым выпадку – шляхам прадстаўлення абанентам магчымасці зносін і ўдзелу ў краязнаўчых мерапрыемствах, якія праводзяцца бібліятэкай. І нарэшце, калі інтэрьеру бібліятэкі надаецца мясцовы каларыт.

Гэта сведчыць аб шырокім спектры і наменклатуры паслуг бібліятэкі па краязнаўстве.

Перш за ўсё, мясцовая публічная бібліятэка павінна рэалізоўваць бібліятэчна-бібліяграфічныя віды паслуг па краязнаўстве, якія звязаны са зборам, захаваннем і прадстаўленнем у грамадскае карыстанне краязнаўчых дакументаў. Таму першаснай задачай з’яўляецца фарміраванне краязнаўчых фондаў у поўным аб’ёме.

Выкарыстанне краязнаўчых фондаў залежыць ад узроўня раскрыцця іх складу і структуры, давядзення да абанентаў бібліяграфічнай інфармацыі.

Гэтаму садзейнічае:

- створаны бібліятэкай краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны апарат;
- падрыхтоўка бібліяграфічных дапаможнікаў краязнаўчай тэматыкі, баз даных;
- даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне карыстальнікаў па краязнаўстве;
- дыферэнцыраванае бібліяграфічнае інфармаванне аб краязнаўчых дакументах;

Каталагізацыя краязнаўчых дакументаў, шматаспектнае раскрыццё іх зместу і месцазнаходжання ў сістэме краязнаўчых каталогаў і картатэк — адна з асноўных паслуг бібліятэкі па краязнаўстве.

Адным з галоўных сродкаў інфармацыйнага забеспячэння па краязнаўстве з'яўляюцца бібліяграфічныя дапаможнікі краязнаўчай тэматыкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(глядзі лекцыю 8). Сукупнасць бібліяграфічных дапаможнікаў дае магчымасць задаволіць асноўныя інфармацыйныя краязнаўчыя патрэбнасці насельніцтва края. Падрыхтаваныя універсальнымі абласнымі бібліятэкамі краязнаўчыя дапаможнікі можна распаўсюджваць па падпіске, або прадаваць усім жадаючым, што дазволіла б вярнуць бібліятэкам хаця б частку затрачаных на іх выданне асігнаванняў.

Прадастаўленне электронных краязнаўчых каталогаў і баз даных— сёння адзін з асноўных кірункаў бібліятэчна-бібліяграфічнага абслугоўвання па краязнаўстве.

Мясцовыя публічныя бібліятэкі ў працэсе абслугоўвання чытачоў:

- выконваюць бібліяграфічныя і фактаграфічныя даведкі краязнаўчага зместа;
- інфармуюць асобных абанентаў, сацыяльныя групы і калектывы аб новых паступленнях КД шляхам:

а) падрыхтоўкі бюлетеняў, спісаў, аглядаў;

б) арганізацыі выстаў, дзён спецыяліста-краязнаўцы і інш.

Бібліятэкі выкарыстоўваюць розныя **формы і метады нагляднай, вуснай і пісьмовай** папулярызацыі КД:

- краязнаўчыя гутаркі, краязнаўчыя дні (чацверг, аўторак), тыдні, месячнікі папулярызацыі краязнаўчай літаратуры;
- краязнаўчыя чытанні, клубы, аб’яднанні краязнаўцаў, прэзентацыі, дыспуты, віктарыны;
- сустрэчы з прадстаўнікамі мясцовай улады, выдатнымі людзьмі края, пісьменнікамі – аўтарамі краязнаўчых твораў, навукоўцамі;
- конкурсы на лепшага знатака края або краязнаўчай літаратуры;
- гульні – вандраванні па родным краі;
- удзел у арганізацыі і правядзенні масавых краязнаўчых мерапрыемстваў: дні горада, сяла, вуліцы, установы, мясцовыя радаводы.

**Спецыфіка** бібліятэчнага-бібліяграфічнага краязнаўства ў тым, што яно выходзіць за межы чыста **бібліятэчных паслуг** па краязнаўстве:

арганізацыя экскурсій па знакамітых мясцінах;

арганізацыя музея мясцовай кнігі;

пошукавая, даследчая, экспедыцыйная работа;

стварэнне летапісу края;

запісы ўспамінаў старажылаў, мясцовага фальклору, гаворак.

Усе гэтыя формы можна выкарыстоўваць, калі гэта трэба дакладнаму абаненту, групе, калектыву, або мясцоваму згутраванню цалкам.

Рэклама КДБ павінна ажыццяўляцца не толькі ў бібліятэках, але і за яе межамі: праз прэсу, радыё, тэлебачанне, на прыпынках транспарта, у мятро, магазінах і г.д.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, **папулярызацыя** краязнаўчых ведаў ажыццяўляецца:

1. праз выдачу КД, назапашаных бібліятэкай;

2. сродкамі раскрыцця КФ у сістэме каталогаў, бібліяграфічных дапаможнікаў, баз даных для забеспячэння свабоднага доступа;

3. сродкамі правядзення масавых мерапрыемстваў, лекцый, кансультацый, выкананне даведак краязнаўчага характара, ажыццяўлення інфарміравання насельніцтва края аб новых КД і тых, якія знаходзяцца ў фондзе бібліятэкі і за яе межамі;

4. сродкамі зносін карыстальнікаў і бібліятэкараў;

5. формамі павышэння інфармацыйнай культуры карыстальнікаў па краязнаўстве.

І зараз галоўнае — эфектыўна выкарыстоўваць пералічаныя формы і метады інфармацыйнага забеспячэння і папулярызацыі ведаў у краязнаўчай рабоце бібліятэк розных тыпаў і відаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**<u>Вывады:</u>**

1. Сістэма бібліятэчна-бібліяграфічнага абслугоўвання па краязнаўстве мае сваю структуру і яе спецыфіка праяўляецца ў пэўным наборы арганізацыйных мерапрыемстваў і канкрэтных паслуг па краязнаўстве.

2. Існуюць пэўныя асаблівасці арганізацыі абслугоўвання па краязнаўстве ва універсальных абласных бібліятэках, публічных масавых і спецыяльных бібліятэках.

3. Узровень бібліятэчна-бібліяграфічнага абслугоўвання і яго эфектыўнасць па краязнаўстве залежыць ад шэрагу фактараў: размяшчэння бібліятэкі, бясплатнасці карыстання, становішча бібліятэчнага сервіса і інш.

4. Бібліятэкі выкарыстоўваюць розныя формы і метады нагляднай, вуснай і пісьмовай папулярызацыі краязнаўчых дакументаў, розныя сродкі інфармацыйнага забеспячэння.

## Лекцыя 7. **ТЭАРЭТЫЧНЫЯ ПЫТАННІ БІБЛІЯГРАФІЧНАГА КРАЯЗНАЎСТВА**

**<u>Пытанні:</u>**

1. **Тэрміналагічныя пытанні бібліяграфічнага краязнаўства.**
2. **Падыходы да тлумачэння паняцця “краязнаўчая бібліяграфія”.**
3. **Паняцце “сістэма краязнаўчых бібліяграфічных прадуктаў”.**
4. **Характарыстыка мадэляў СКБД.**

<u>Мэта</u> – вывучэнне тэарэтычных пытанняў бібліяграфічнага краязнаўства: тэрміналогіі, сутнасці краязнаўчай бібліяграфіі, мадэлявання сістэмы краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў.

**Пытанне 1.Тэрміналагічныя пытанні бібліяграфічнага краязнаўства**

Краязнаўчая бібліяграфія з’яўляецца адным з важных відаў сучаснай бібліяграфіі. Краязнаўчая бібліяграфія – гэта від бібліяграфіі, у межах якога ствараецца і даводзіцца да карыстальніка бібліяграфічная інфармацыя аб дакументах, створаных на тэрыторыі пэўнага краю і /ці прысвечаных яму. Галоўнай адметнасцю гэтага віда бібліяграфіі з’яўляецца сувязь з тэрыторыямі, меншымі за дзяржаўныя межы пэўнай краіны. Напрыклад, у Беларусі гэта такія тэрыторыі, як адзінкі адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу, адзінкі фізіка-геаграфічнага раяніравання, эканамічнага раяніравання, канфесіянальнага раяніравання і інш.

У розных краінах свету, у.т.л. Беларусі, гэты від бібліяграфіі асабліва плённа функцыянуе ў перыяд XIX – пачатак XXI стст. Актыўнае развіццё гэтага віду бібліяграфіі абумоўлена:

- колькасным ростам і ўскладненнем структуры дакументных патокаў, прысвечаных рэгіёнам,
- бесперапынным ростам патрэбнасцей грамадства ў бібліяграфічнай арыентацыі ў дакументаных патоках аб тэрыторыях краіны.

Гэтыя з’явы выкліканы поспехамі краязнаўчай дзейнасці, скіраванай на вывучэнне мінулага і сучаснасці асобных тэрыторый у межах краін, а таксама дасягненнямі краязнаўчай навукі, а таксама імкненнем невялікіх тэрыторый да дынамічнага і эфектыўнага сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця, патрыятызмам. Такім чынам, існуе патрэбнасць у якасным інфармацыйным забеспячэнні як краязнаўчай дзейнасці, так эфектыўнага грамадскага развіцця. Элементамі сістэмы інфармацыйнага забеспячэння краязнаўства з'яўляюцца музеі, архівы, універсітэты, выдавецтвы, бібліятэкі, навукова-даследчыя ўстановы, грамадскія краязнаўчыя арганізацыі і інш. Такім чынам, у нашай краіне існуе шмат установ і арганізацый, якія ствараюць першасную і другасную інфармацыю – бібліяграфічную і фактаграфічную па краязнаўстве. У гэтых цэнтрах стварэннем бібліяграфічнай інфармацыі заняты бібліятэкары-бібліёграфы, музейныя і архіўныя спецыялісты, выкладчыкі ўніверсітэтаў, пісьменнікі і журналісты, краязнаўцы-аматары.

Сярод гэтых установ бібліятэкі з’яўляюцца адным з галоўных цэнтраў, што забяспечваюць існаванне краязнаўчай бібліяграфіі, як віда. У бібліятэках вядзецца краязнаўчая бібліяграфічная дзейнасць, г.зн. дзейнасць па падрыхтоўцы, назапашанні і выкарыстанні краязнаўчай бібліяграфічнай інфармацыі. На сучасным этапе буйнейшыя бібліяграфічныя рэсурсы па краязнаўстве створаны АБ, ЦБС, бібліятэкамі ВНУ, навукова-даследчых установ. У АБ і некаторых ЦБС ёсць краязнаўчыя аддзелы ці сектары.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Стварэннем краязнаўчай інфармацыйнай прадукцыі, у т.л. бібліяграфічнай шмат займаюцца аддзелы маркетынгу ў ЦБС.

У працэсе краязнаўчай бібліяграфічнай дзейнасці ствараецца і даводзіцца да карыстальнікаў краязнаўчая бібліяграфічная інфармацыя. Гэта бібліяграфічная інфармацыя, якая дапамагае ідэнтыфікаваць і выкарыстоўваць дакументы аб краі. Краязнаўчая бібліяграфічная інфармацыя рэалізуецца ў разнастайных бібліяграфічных рэсурсах: краязнаўчых каталогах, базах даных, друкаванай бібліяграфічнай прадукцыі рознага мэтавага і карыстальніцкага прызначэння. КБІ існуе ў самастойных і несамастойных формах (прыкніжных, прыартыкульных спісах і інш.). У межах краязнаўчай бібліяграфіі ствараюцца два віды бібліяграфічнай прадукцыі (дапаможнікаў):

1. Краязнаўчыя бібліяграфічныя дапаможнікі – дапаможнікі, у якіх адлюстравана інфармацыя аб дакументах, што сваім зместам прысвечаны пэўнаму краю, рэгіёну, населенаму пункту. Гэты від бібліяграфічных дапаможнікаў засноўваецца на змесце дакументаў, у азначэнні падкрэсліваецца тэрытарыяльна-змястоўны характар аб’ектаў бібліяграфавання.
2. Бібліяграфічныя дапаможнікі мясцовага друку – у якіх адлюстравана інфармацыя аб дакументах, якія сваім паходжаннем (стварэннем) звязаны з пэўным краем, рэгіёнам, населеным пунктам. Істотнае значэнне для гэтых бібліяграфічных дапаможнікаў маюць фармальныя прыметы дакументаў: іх з’яўленне ў межах данай тэрыторыі.

Сёння ў паняццяў “краязнаўчая бібліяграфія”, “КБІ”, “краязнаўчы бібліяграфічны дапаможнік ёсць канкурэнтныя паняцці “рэгіянальная бібліяграфія”, “РБІ”, “рэгіянальны бібліяграфічны дапаможнік”. Ёсць розныя меркаванні аб мэтазгоднасці замены традыцыйных паняццяў на “рэгіянальны”, аб аб’ёме самога паняцця “рэгіён” і вытворных словазлучэнняў. Але шырокая распаўсюджанасць паняцця “рэгіён” дазваляе сёння падтрымліваць меркаванне аб сінанімічнасці гэтых паняццяў і рабіць выснову, што паняцці “краязнаўчая” і “рэгіянальная бібліяграфія” і вытворныя аб іх словазлучэнні: КБІ, РБІ, “краязнаўчы” і “рэгіянальны бібліяграфічныя дапаможнікі” магчыма ўжываць у якасці сінонімаў.

Краязнаўчая бібліяграфічная дзейнасць бібліятэк абагульняецца, аналізуецца, у выніку чаго ствараюцца навуковыя і метадычныя веды аб ёй. Яны адлюстроўваюцца ў артыкулах, дакладах на канферэнцыях і семінарах і інш. У ходзе прафесійнай падрыхтоўкі бібліятэкараў-бібліёграфаў засвойваюцца сучасныя веды аб гэтым відзе бібліяграфіі. У Беларусі шмат выдатных бібліёграфаў-краязнаўцаў, напрыклад, Р.М.Чыгірова, Л.Р.Амяльковіч, Л.І.Турмасава, загадчыца крязнаўчым аддзелам Гродзенскай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

АБ, Т.С.Кавенька, загадчыца аддзелам краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі Гродзенскай АБ, Н.А. Пугачова, галоўны бібліяэкар Віцебскай АБ і інш.

**Пытанне 2. Падыходы да тлумачэння паняцця “краязнаўчая бібліяграфія”**

Прыхільнікі разумення краязнаўчай бібліяграфіі як асобнага віда ўлічваюць:

- наяўнасць сферы забеспячэння (краязнаўчай дзейнасці). Але абмяжоўвацца толькі сферай недастаткова.
- Падрыхтоўку і выкарыстанне КБІ (бібліяграфічнай інфармацыі, якая сваім зместам ці іншымі прыметамі звязана з тэрыторыяй). (А гэта значыць, што маецца суб’ект, аб’ект, мэта, працэсы, сродкі і вынік дзейнасці).

Склаліся **3** асноўныя тлумачэнні “краязнаўчай бібліяграфіі” як віда бібліяграфіі.

**Першы падыход**. На падставе тэрытарыяльна-зместавай прыметы. Краязнаўчая бібліяграфія – гэта вобласць навукова-практычнай дзейнасці па падрыхтоўцы і распаўсюджанні бібліяграфічнай інфармацыі, якая сваім зместам звязана з пэўнай мясцовасцю ў краіне. Такое азначэнне падаюць буйнейшыя бібліяграфазнаўцы А.В.Мамантаў, М.М.Шчэрба, І.І.Міхліна, А.П.Коршунаў.

Прыхільнікі гэтага падыходу не змешваюць краязнаўчую бібліяграфію з такімі відамі, як бібліяграфія мясцовага друку, бібліяграфія мясцовых аўтараў і рэгіянальная бібліяграфія. Але яны не адмаўляюць пэўнай сувязі мясцовага друку з краязнаўчай літаратурай.

У 1950-60-я гг. І.Б.Сіманоўскі і А.А.Сакольчык змест паняцця краязнаўчая бібліяграфія трактавалі ў вузкім сэнсе (па зместу), аднак граніцы края давялі да БССР.

Краязнаўчая бібліяграфія – гэта інфармацыйная інфраструктура, якая забяспечвае падрыхтоўку, распаўсюджанне і выкарыстанне бібліяграфічнай інфармацыі, якая *прысвечана пэўнай мясцовасці* ў краіне.

Можна выкарыстаць і азначэнне, якое падаў В.А.Факееў у тлумачальным слоўніку “Библиографическая наука и практика” (2008), с.129: “Краязнаўчая бібліяграфія – від бібліяграфіі, які забяспечвае патрэбнасці ў інфармацыі аб дакументах, прысвечаных пэўнай мясцовасці (тэрыторыі, краю, рэгіёну)

Падыход, які адлюстроўвае толькі змястоўную сувязь бібліяграфіі з краем, з'яўляецца абмежавальным і фармальна яго называюць вузкім.

**Другі падыход.** Сфарміраваны на аснове дапаўнення тэрытарыяльна-зместавай прыметы іншымі прыметамі сувязей дакументных аб’ектаў бібліяграфавання з краем: аўтарска-тэрытарыяльнай і прыметы месца выдання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Некаторыя даследчыкі ўключаюць у аб'ём паняцця "краязнаўчая бібліяграфііяˮ не толькі бібліяграфічную інфармацыю, сваім зместам звязаную з пэўнай мясцовасцю ў краіне, але таксама бібліяграфію мясцовых выданняў і біябібліяграфію ўраджэнцаў і дзеячоў края, мясцовых аўтараў. Атрымаецца азначэнне: "Краязнаўчая бібліяграфія – гэта вобласць навукова-практычнай дзейнасці па падрыхтоўцы і распаўсюджанні бібліяграфічнай інфармацыі, якая сваім **зместам** звязана з пэўнай мясцовасцю ў краіне, а таксама бібліяграфічнай інфармацыі **аб мясцовых выданнях** і **біябібліяграфіі** дзеячоў/аўтараў края.

Вытокі гэтага падыходу звязаны з даследаваннямі вядомага савецкага бібліёграфа-краяведа міжваеннага часу Мікалая Васільевіча Здобнава. Здобнаў прапанаваў аб'яднаць тры віды бібліяграфіі: краязнаўчую, біябібліяграфію і бібліяграфію мясцовага друку паняццем "краявая бібліяграфіяˮ. Тэрмін не замацаваўся і прыхільнікі пашыранага разумення пачалі выкарыстоўваць для абазначэння трох відаў бібліяграфіі менавіта тэрмін ˮкраязнаўчая бібліяграфіяˮ.

Вывучэнне асаблівасцей краязнаўчых дакументаў на сучасным этапе (С.Н.Акуліч, І.Б.Лукашоў) дазволіла паўней высветліць краязнаўчы характар мясцовых выданняў і выданняў мясцовых аўтараў. Выкарыстоўваючы тэрмін краязнаўчая бібліяграфія як абагульняючы для трох відаў бібліяграфіі, прыхільнікі гэтага падыходу зыходзяць не адрозненняў, а з агульнага, што дазваляе бачыць краязнаўчы характар дакументаў. Падзяляюць пашыраны падыход прадстаўнікі СПб дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, раней Ленінградскага інстытута культуры. Найбольш вядомы А.В.Мамантаў.

Вядомы беларускі краязнаўца М.Касяровіч у 1920-я гг. сфармуляваў пашыранае тлумачэнне краязнаўчай бібліяграфіі (уключаў у яе бібліяграфію твораў аб мясцовым краі, якія з'явіліся на яго тэрыторыі і за яе межамі, і бібліяграфію некраязнаўчых выданняў, здзейсненых на тэрыторыі края).

Пашыраны падыход шырока рэалізуецца і практыцы бібліятэк па падрыхтоўцы краязнаўчых каталогаў і БД, бібліяграфічных дапаможнікаў, у практыцы бібліяграфічнага абслугоўвання па краязнаўстве.

<u>**Трэці падыход.**</u> Вызначэнне суадносінаў паняццяў "краязнаўчая бібліяграфіяˮ і "рэгіянальная бібліяграфіяˮ. У апошнія дзесяцігоддзі ў розных навуках і практычнай дзейнасці пашыраецца выкарыстанне паняцця "рэгіёнˮ і вытворных тэрмінаў. А.М.Маслава і А.М.Бучанкоў прапанавалі замяніць канцэпцыю краязнаўчай бібліяграфіі канцэпцыяй рэгіянальнай бібліяграфіі. Яны лічаць, што паняцці: 1) "краязнаўстваˮ, "краязнаўчая бібліяграфіяˮ маюць мясцовы сэнс, г. зн., што даследаванні і бібліяграфічная работа праводзяцца мясцовымі сіламі, а рэгіянальная бібліяграфія мае не толькі мясцовы, але агульнадзяржаўны падыход, яна з'яўляецца звяном у агульнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сістэме НТІ у краіне. 2) паняцці “краязнаўства”, “краязнаўчая бібліяграфія” састарэлі, паняцці “рэгіён” і “рэгіянальная бібліяграфія” з'яўляюцца больш навуковымі і сучаснымі.

Функцыянальнае адрозненне паміж рэгіянальнай і краязнаўчай бібліяграфіяй, паводле А.М.Маславай, заключаецца ў тым, што першая забяспечвае ўсе віды рэгіянальных інфармацыйных патрэбнасцей: звязаныя з навукова-даследчай, вытворчай, асветніцкай дзейнасцю, з самаадукацыяй, адукацыяй. Таму рэгіянальная бібліяграфія па грамадскім прызначэнні падзяляецца на навукова-дапаможную і рэкамендацыйную. Прычым асноўнай задачай рэгіянальнай бібліяграфіі з'яўляецца задавальненне прафесійных запытаў спецыялістаў, абслугоўванне галіновых запытаў. Краязнаўчую бібліяграфію яна лічыць толькі рэкамендацыйнай, а змест краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў можа быць толькі комплексным ці тэматычным. Нарэшце Маслава лічыць, што мэта краязнаўчай бібліяграфіі прадстаўляць інфармацыю аб выданнях, змест якіх прысвечаны тэрыторыі і абмяжоўвае кола карыстальнікаў гэтай інфармацыі і літаратуры: мясцовымі краязнаўцамі, супрацоўнікамі музеяў, архіваў, турыстычных арганізацый і інш. А рэгіянальная бібліяграфія, на яе думку, адлюстровае не толькі матэрыялы, прысвечаныя тэрытарыі, але і іншых, важных для яе вывучэння. Гэта меркаванне надуманае, у методыцы краязнаўчага бібліяграфавання і бібліяграфічнага абслугоўвання заўсёды вялікая ўвага надавалася выяўленню звестак аб краі ў дакументах, якія не з'яўляюцца краязнаўчымі па зместу.

Блізкія да Маславай погляды выказала А.Н.Бурынская: рэгіянальная бібліяграфія служыць не столькі “пазнанню края”, сколькі “развіццю ў рэгіёне навукі прамысловасці, сельскай гаспадаркі, медыцыны і інш.” Такі падыход вядзе да зместавага абмежавання краязнаўчай бібліяграфіі дзейнасцю па задавальненні інфармацыйных патрэб, звязаных з вывучэннем мінулага рэгіёна / населенага пункта, яго духоўнай і матэрыяльнай культуры і звужае ўдзел у інфармацыйным забеспячэнні сучаснага развіцця (эканамічнага, грамадска-палітычнага, сацыяльнага, навуковага і інш.) Гэты шлях, між іншым, можа лёгка прывесці да і да далейшага абмежавання сферы краязнаўчай бібліяграфіі. Напрыклад, гістарычныя апісанні невялікіх тэрыторый і населеных пунктаў, якія раней часта называлі краязнаўчымі, зараз называюць мікрагістарычнымі даследаваннямі, г.зн. не раглядаюць іх у якасці вынікаў краязнаўчых даследаванняў.

Пазіцыі А.М.Маславай, А.Н.Бурынскай крытыкаваліся М.М.Шчэрбай, А.В. Мамантавым, В.А.Галадзяевай, І.І.Міхлінай. Беспадстаўнасць пазіцыі А.М.Маславай выцякае з парушэнняў адзінства прынцыпа падзялення відаў, адзначалася, што даследчыца разглядае паняцце “рэгіянальная бібліяграфія” ў розных сэнсах: 1) як від бібліяграфіі, які ахоплівае ўсе разнавіднасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліяграфічнай інфармацыі, што функцыянуе ў рэгіёне (г.зн. як рэгіянальную бібліяграфічную сістэму) і 2) як від бібліяграфіі, які прадстаўляе інфармацыю аб рэгіёне. Напрыклад, у першым значэнні, як від бібліяграфіі, які ахоплівае ўсе іншыя віды, то тады б у склад рэгіянальнай бібліяграфіі ўваходзілі:

- рэгіёназнаўчая бібліяграфія,
- бібліяграфія мясцовага друку,
- БІ, прысвечаная асобам, звязаным з рэгіёнам сваім паходжаннем (біябібліяграфія мясцовых ураджэнцаў і дзеячоў),
- БІ, створаная ў рэгіёне (усе створаныя бібліяграфічныя дапаможнікі)
- БІ па галінах і праблемах, важных для рэгіёна.

Існаванне такога аморфнага віду ўжо не адпавядае сучасным падыходам да класіфікацыі бібліяграфіі.

Больш абгрунтаваны падыход да паняцця “рэгіянальная бібліяграфія” ляжыць у рэчышчы разгляду яе як тэрытарыяльна-бібліяграфічнага комплексу. Прапанаваў А.М.Бучанкоў. Аляксей Мікалаевіч Бучанкоў характарызуе рэгіянальную бібліяграфію як “тэрытарыяльна-бібліяграфічны комплекс”, у межах якога вядзецца дзейнасць па падрыхтоўцы і распаўсюджанні бібліяграфічнай інфармацыі ў рэгіёне. І вылучыў паняцце “рэгіёназнаўчая бібліяграфія”, якое абазначае дзейнасць па падрыхтоўцы і распаўсюджанні Бі, зместам звязанай з пэўным рэгіёнам. Увядзенне паняцця “рэгіёназнаўчая бібліяграфія” дазваляе адрозніваць частку ад цэлага.

Яго думкі развілі Т.Я.Кузняцова і В.Е.Лявончыкаў паказалі, што рэгіянальную бібліяграфію неабходна разглядаць як узровень тэрытарыяльнай арганізацыі бібліяграфіі ў краіне.

В.Е.Лявончыкаў прапанаваў вызначаць рэгіянальную бібліяграфію не праз паняцце “від”, а праз паняцце “частка”, разглядаць яе як тэрытарыяльную частку бібліяграфіі па забеспячэнні грамадскіх патрэбнасцей рэгіёна ў профільнай бібліяграфічнай інфармацыі. Такі падыход дазваляе вызначыць месца рэгіянальнай бібліяграфіі ў сістэме бібліяграфіі краіны ў залежнасці ад яе дзяржаўнай арганізацыі. Паколькі ў Рэсп. Беларусь існуе адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел толькі на вобласці, то паняцці рэгіёназнаўчая і краязнаўчая бібліяграфія даныя тэрміны з'яўляюцца сінонімамі.

Існуюць і іншыя новыя спробы азначэння краязнаўчай бібліяграфіі, як, напрыклад, дадзенае В.А.Факеевым, што гэта змястоўна-тэрытарыяльная структура бібліяграфічных ведаў, якая адлюстроўвае літаратуру аб краі.

Падводзячы вынікі тэарэтычных дыскусій адносна паняцця краязнаўчая бібліяграфія можна канстатаваць, што праблема канчаткова не

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вырашана. Паняцце краязнаўчая бібліяграфія разглядаецца ці пашыра, ці звужана, яго альтэрнатывай выступае паняцце “рэгіянальная бібліяграфія”. Не дасягнута паразуменне адносна краязнаўчага характару мясцовых дакументаў, таму ў залежнасці ад таго, уключаюцца ў якасці аб’екта краязнаўчай бібліяграфіі мясцовыя выданні, персаналіі ці не і склаліся асноўныя трактоўкі паняцця краязнаўчай бібліяграфіі.

У сучасных умовах В.Е.Лявончыкаў выдзеліў краязнаўчую бібліяграфію па змястоўна-тэрытарыяльнай прымеце аб’ектаў бібліяграфавання ў складзе рэспубліказнаўчай бібліяграфіі. Ён указвае на значэнне тэрміна краявая бібліяграфія і па прымеце сувязі аб’ектаў бібліяграфавання з краем таксама выдзеліў: бібліяграфію мясцовага друку (тэрытарыяльная прымета), бібліяграфічную інфармацыю на мовах народаў кря (моўная прымета), краявую біябібліграфію і персанальную бібліяграфічную інфармацыю (па прымеце аўтарскай прыналежнасці, калектыва і персаналії).

**Пытанне 3. Паняцце “сістэма краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў” (СКБД)**

Сістэма краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў – гэта арганізацыйна ўпарадкаваная сукупнасць бібліяграфічных дапаможнікаў, якая цэласна раскрывае дакументны краязнаўчы паток і забяспечвае дыферэнцыраванае задавальненне патрэбнасцей карыстальнікаў у краязнаўчай бібліяграфічнай інфармацыі. СКБД уяўляе сабой складаную сукупнасць узаемазвязаных і падпарадкаваных падсістэм, кожную з якіх можна разглядаць як асобную сістэму са сваёй унутранай дыферэнцыяцыяй. Структура СКБД фарміруецца па розных прыметах. Важнейшымі з іх з'яўляюцца грамадскае прызначэнне і функцыі, змест аб’ектаў бібліяграфавання і асобныя тыпы дапаможнікаў. З улікам грамадскага прызначэння і функцый звычайна ў СКБД вылучаюць дзве буйнейшыя падсістэмы. Гэта падсістэмы навукова-дапаможных і рэкамендацыйных краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў, або падсістэмы агульных і спецыяльных краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў. Па прымеце зместу ў СКБД вылучаюць падсістэмы універсальных і комплексных, галіновых, тэматычных і персанальных дапаможнікаў. Кожная з гэтых падсістэм таксама можа мець складаную ўнутраную структуру, адносна якой з'яўляецца сістэмай. Напрыклад, сістэма галіновых дапаможнікаў уключае дапаможнікі па гісторыі, прыродзе, эканоміцы і іншых галінах. Акрамя таго большасць буйных галіновых комплексаў ахопліваюць больш вузкія галіны, па якіх таксама вядзецца падрыхтоўка краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

СКБД уяўляла на кожным гістарычным этапе своеасаблівую бібліяграфічную мадэль актуальнага дакументнага патоку і масіву і структуры патрэбнасцей карыстальнікаў бібліятэк.

Паняцце “Сістэмы краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў” узнікла ў 20 – 50-я гады XX ст., калі бібліёграфы-краязнаўцы прыйшлі да думкі, што выпуск краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў павінен быць не выпадковым працэсам, а змадэляваным. Пачалі выказваць прапановы аб стварэнні сістэмы краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў і распрацоўваць мадэлі гэтай сістэмы. Лічылася, што калі тая ці іншая бібліятэка прыменіць у дзейнасці па падрыхтоўцы краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў у якасці эталона абгрунтаваную мадэль, то з цягам часу стане магчымым забяспечыць бібліяграфічнымі дапаможнікамі шырокі і зменлівы паток краязнаўчых запытаў усяго кантынгенту карыстальнікаў бібліятэк, поўна і ў адпаведнасці з чытацкімі патрэбнасцямі адлюстроўваць бягучую і рэтраспектыўную часткі краязнаўчага дакументнага патоку. Вывучэнне СКБД праводзілі такія вядомыя даследчыкі, як Г.А.Озерава, Л.Н.Трапоўскі, М.В.Здобнаў, В.А.Нікалаеў, А.І.Коган, І.І.Міхліна, Н.Ф.Гарбачэўская, А.В.Мамантаў, М.М.Шчэрба, Л.Я.Шрайберг, В.Е.Лявончыкаў, А.В.Прадзеіна, Р.М.Чыгірова і інш. Вынікі вывучэння праблемы СКБД адлюстраваны ў шматлікіх публікацыях.

Вялікую ролю ў абгрунтаванні паняцця СКБД адыгралі абласныя і іншыя бібліятэкі ў перыяд СССР, якія распрацавалі многія тыпы і жанры краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў, што папоўнілі тыпалагічную структуру гэтай сістэмы. Былі распрацаваны нарматыўныя дакументы, якія змяшчалі апісанні мадэляў СКБД. Галоўныя цэнтры краязнаўчай бібліяграфіі павінны былі развіваць СКБД, як адзін з асноўных кірункаў бібліяграфічнай дзейнасці. Бібліятэкамі былі распрацаваны наступныя мадэлі СКБД:

1) Мадэль, апублікаваная ў “Положении о краеведческой работе областных, краевых, республиканских (АССР) библиотек” (1959)

2) Мадэль у праекце “Положения о краеведческой деятельности краевых и универсальных научных библиотек” (1991).

3) Мадэль бібліяграфазнаўцаў А.В.Мамантава і М.М.Шчэрбы ў падручніку “Краеведческая библиография“ (1989).

4) Мадэль, адлюстраваная ў “Палажэнні аб краязнаўчай рабоце бібліятэк Рэспублікі Беларусь” (1993).

Акрамя мадэляў, адлюстраваных у пералічаных дакументах, былі аўтарскія мадэлі, створаныя вядомымі бібліяграфазнаўцамі А.В.Мамантавым, М.М.Шчэрбай, Л.Я.Шрайбергам, А.В.Прадзеінай і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На працягу другой паловы XX ст. рэалізацыі той ці іншай сістэмы ў практычнай дзейнасці асобных бібліятэк надавалася вялікая ўвага. Выйшла многа публікацый, прысвечаных вывучэнню дасягнутага стану СКБД.

У апошні час у сувязі з укараненнем аўтаматызаваных тэхналогій, уплывам рынкавых эканамічных умоў, патрабаванні да праблемы СКБД змяніліся. Па-першае, шырокія пошукавыя магчымасці электронных краязнаўчых бібліяграфічных рэсурсаў дазваляюць задавальняць патрэбнасці карыстальнікаў з рознымі мэтавымі ўстаноўкамі, забяспечваць разнастайную тэматыку чытання. Гэта дазваляе бібліятэкам узбуйніць звёны, якія ў мадэлях СКБД, распрацаваных для друкаваных бібліяграфічных дапаможнікаў, даволі дробна раздзяляліся па мэтавым і чытацкім прызначэнні. Такім чынам карыстальнікі атрымліваюць друкаваныя бібліяграфічныя дапаможнікі ў любімай традыцыйнай форме, разлічаныя на пашыранае выкарыстанне. Па-другое, парадаксальна, але выкарыстоўваемыя сёння АБІС не забяспечваюць поўнагага раскрыцця зместу дакументаў па вузкіх актуальных пытаннях, напрыклад, гісторыя мясцовых шляхецкіх сядзіб, іх уладальнікаў і інш. Таму пры падрыхтоўцы бібліяграфічных дапаможнікаў бібліятэкі звяртаюцца да набыўшых асаблівую актуальнасць тэм. Па-трэцяе, сучасныя бібліятэкі не могуць забяспечыць функцыянаванне бібліяграфічных дапаможнікаў па ўсіх прапанаваных звёнах сістэмы па эканамічных прычынах. Такім чынам, аўтаматызаваныя тэхналогіі і змяненні поглядаў на прызначэнне сістэмы бібліяграфічных дапаможнікаў хаця і паменьшылі яе нарматыўнае значэнне, але не парушылі яе навукова-практычную значнасць, карысць для бібліёграфаў-складальнікаў, для бібліятэкараў, якія працуюць з карыстальнікамі ў непасрэдным кантакце. Бібліятэкі пачалі працаваць дакладна па выяўленні і задавальненні інфармацыйных патрэб рэгіянальнага зместу. Таму рашэнне аб фарміраванні СКБД, яе асобных звёнаў вырашаецца кожнай бібліятэкай з улікам актуальнасці пэўнай тэматыкі, адпаведнасці інфармацыйным патрэбнасцям насельніцтва рэгёна і магчымасцям самой бібліятэкі. Такім чынам СКБД канкрэтнай бібліятэкі цяпер утвараць звёны, на якія існуе попыт. З пераліку тыпаў, жанраў і формаў краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі канкрэтная бібліятэка можа выбіраць найбольш адпаведныя. Немалаважна, што асобныя бібліяграфічныя дапаможнікі – каляндары знамянальных і памятных дат, паказальнікі новай краязнаўчай літаратуры становяцца асновай для БД.

**Пытанне 4. Характарыстыка мадэляў СКБД.**

Мадэль, прапанаваная буйнейшымі спецыялістамі бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства А.В.Мамантавым і М.М.Шчэрбай, ахоплівае 2 падсістэмы: рэкамендацыйных і навукова-дапаможных дапаможнікаў. **Сістэма рэкамендацыйных дапаможнікаў** у сваю чаргу ўключае такія

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падсістэмы, як універсальныя паказальнікі літаратуры аб краі (аб абласцях, гарадах, раёнах, вёсках) і комплексныя дапаможнікі, каляндары знамянальных і памятных дат, тэматычныя і персанальныя дапаможнікі. Універсальныя паказальнікі літаратуры аб краі з'яўляюцца асноўным звяном гэтай сістэмы. Гэтыя дапаможнікі могуць быць прызначаны аматарам краязнаўства, шырокім колам чытачоў, якія прыступаюць да вывучэння края. Другая іх разнавіднасць адрасуецца краязнаўцам, спецыялістам, кіраўнікам, выкладчыкам, студэнтам старэйшых курсаў і іншым чытачам, якія маюць пэўны ўзровень ведаў аб краі. Адлюстроўваюць лепшую літаратуру апошніх год, характарызуюцца грунтоўна распрацаванай структурай і цікавымі характарыстыкамі ўключаных дакументаў.

**Сістэма краязнаўчых навукова-дапаможных дапаможнікаў** ахоплівае такія падсістэмы, як паказальнікі новай краязнаўчай літаратуры, рэтраспектыўныя універсальныя паказальнікі, галіновыя і тэматычныя дапаможнікі, персанальныя дапаможнікі, паказальнікі мясцовых перыядычных выданняў, паказальнікі краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў.

**Мадэль НББ, аўтар Р.М.Чыгірова.** У якасці галоўнай вылучана прымета зместу аб’ектаў бібліяграфавання. Сістэма адлюстравана ў пункце 53.1. “Палажэнне аб краязнаўчай рабоце бібліятэк Рэспублікі Беларусь”. Сістэма дапаможнікаў па зместу павінна ахопліваць усе бакі жыцця рэгіёнаў, задавальняць патрэбы ў краязнаўчай бібліяграфічнай інфармацыі, будавацца з улікам стану і напрамкаў развіцця іншых сістэм бібліяграфічных дапаможнікаў рэспублікі. Уключае 2 падсістэмы: 1) бібліяграфічных паказальнікаў літаратуры аб краі і 2) бібліяграфічных паказальнікаў мясцовых дакументаў.

**Падсістэма бібліяграфічных паказальнікаў літаратуры аб краі** ўключае:

- універсальныя бягучыя паказальнікі краязнаўчых дакументаў (тыпу “Новая літаратура аб ...вобласці”;
- бягучыя бібліяграфічныя дапаможнікі тыпу “Каляндар знамянальных і памятных дат”;
- універсальныя рэтраспектыўныя паказальнікі тыпу “Што чытаць аб краі”, аб асобных гарадах;
- персанальныя і біябібліяграфічныя дапаможнікі (паказальнікі і слоўнікі).
- паказальнікі краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў.

**Падсістэма бібліяграфічных паказальнікаў мясцовых дакументаў** уключае:

- паказальнікі кніг.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- паказальнікі перыядычных выданняў.
- паказальнікі зместу перыядычных выданняў.

Мадэль сістэмы рэгіянальных бібліяграфічных дапаможнікаў (СРБД), прапанаваная беларускай даследчыцай А.В.Прадзеінай, складаецца з двух падсістэм: 1) краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў і 2) бібліяграфічных дапаможнікаў мясцовых дакументаў і інфармацыйных рэсурсаў. Першая падсістэма ўключае зместавыя, функцыянальныя, суб'ектыўныя звёны. Другая – колькасныя і фармальныя. Па прымеце грамадскага прызначэння СРБД таксама падзяляецца на 2 падсістэмы: агульную і спецыяльную. **Падсістэму агульных рэгіянальных** дапаможнікаў утвараюць наступныя звёны:

- зводныя краязнаўчыя каталогі,
- паказальнікі мясцовых дакументаў і інфармацыйных рэсурсаў,
- паказальнікі іх зместу,
- зводныя рэтраспектыўныя паказальнікі мясцовых дакументаў,
- крыніцы масавай рэгіянальнай бібліяграфічнай інфармацыі (аб новых паступленнях мясцовых дакументаў у бібліятэку).

**Падсістэма спецыяльных рэгіянальных дапаможнікаў** уключае

- наступныя звенні па прымеце мэтавага і чытацкага прызначэння:
- навукова-вытворчыя,
- прафесійна-упраўленчыя,
- вучэбна-дапаможныя,
- папулярныя краязнаўчыя бібліяграфічныя дапаможнікі.

Падсістэма спецыяльных рэгіянальных бібліяграфічных дапаможнікаў дыферынцыруецца таксама па змесце (шматгаліновыя, тэматычныя і інш.)

Недахоп мадэлі СРБД А.В.Прадзеінай – дапаможнікі мясцовых інфармацыйных рэсурсаў могуць разумецца ў якасці краязнаўчых бібліяграфічных прадуктаў.

**<u>Вывады:</u>**

1. Склалася і працягвае развівацца тэрміналогія бібліяграфічнага краязнаўства. Неглндзячы на адсутнасць агульна прызнанага тлумачэння краязнаўчай бібліяграфіі, сам гэты тэрмін устойлівы, мае шырокае распаўсюджанне ў навуковай і практычнай дзейнасці бібліятэк па краязнаўстве.

2. Праблема СКБД набыла навуковую і практычную актуальнасць, атрымала грунтоўную тэарэтычную распрацоўку, практычную рэалізацыю і нарматыўную распрацоўку. Навукова абгрунтаваная мадэль СКБД была і застаецца эталонам (узорам) для бібліятэк, арганізацый і ўстаноў пры планаванні падрыхтоўкі тыпаў і відаў дапаможнікаў аб краі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Мадэлі СКБДхарактарызыюцца варыятыўнасцю і дазваляюць бібліятэкам планаваць стварэнне новых краязнаўчых бібліяграфічных рэсурсаў.

## Лекцыя 8. **КРАЯЗНАЎЧЫ ДАВЕДАЧНА-БІБЛІЯГРАФІЧНЫ АПАРАТ БІБЛІЯТЭКІ**

**Пытанні:**

**1. Азначэнне КБДА, яго структура і склад у бібліятэках розных тыпаў.**
**2. Краязнаўчыя БД і БД мясцовых дакументаў**
**3. Карткавыя і друкаваныя краязнаўчыя каталогі і каталогі мясцовых дакументаў; краязнаўчыя картатэкі.**
**4. Краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны фонд (КДБФ) бібліятэкі і фонд (архіў) выкананых даведак.**

### Пытанне 1. **Азначэнне КБДА, яго структура і склад у бібліятэках розных тыпаў**

Краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны апарат (КДБА) бібліятэкі – гэта ІПС у дакументнай ці/і электроннай формах, мэта якой аптымізаваць пошук краязнаўчай бібліяграфічнай і фактаграфічнай інфармацыі, арыентацыю ў краязнаўчых інфармацыйных рэсурсах.

Функцыянальнае прызначэнне КДБА заключаецца ў тым, каб аператыўна і якасна забяспечыць доступ карыстальнікаў да паўнатэкставай, бібліяграфічнай і фактаграфічнай інфармацыі, прысвечанай рэгіёну ці населенаму пункту.

Яркай уласцівасцю КДБА з’яўляецца *ўнікальнасць*. КДБА характарызуецца унікальнасцю зместу з пункту гледжання адлюстравання універсума дакументна-фіксаваных ведаў пра рэгіён. Структура гэтых ведаў на бібліяграфічным узроўні ствараецца толькі ў канкрэтнай рэгіянальнай бібліятэцы і нават прыблізна не дубліруецца ў іншых бібліятэках. Унікальным КДБА з'яўляецца і па такіх прыметах, як аўтарскі корпус і ў немалой ступені рэгіянальна абмежаванае месца стварэння дакументаў.

КДБА ўяўляе сабой арганізаваную сукупнасць, складаецца з некалькіх асноўных устойлівых частак. Гэта:

1*) Універсальныя* краязнаўчыя БД і БД мясцовых дакументаў;

-універсальныя (“энцыклапедычныя”) БД аб рэгіёне, якія камлексіруюць бібліяграфічную, фактаграфічную і паўнатэкставую інфармацыю.

-Карткавыя краязнаўчыя каталогі (КК) і каталогі мясцовых выданняў; універсальныя краязнаўчыя картатэкі.

- Навігатары па інфармацыйных рэсурсах, прысвечаных рэгіёну. Гэта параўнальна новым элемент, які набывае ўсё большую актуальнасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2) Краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны фонд (КДБФ) бібліятэкі уключае*Фонд даведачных* і бібліяграфічных краязнаўчых выданняў і іх электронныя версіі ці арыгінальныя электронныя дапаможнікі, фактаграфічныя БД, бібліяграфічныя БД актуальнай праблематыкі.

3) *Фонд неапублікаваных* краязнаўчых дакументаў, электронныя архівы выкананых краязнаўчых даведак.

Структура КДБА залежыць аб тыпа і віда бібліятэкі. Найбольш складаны КДБА вядуць АБ і ЦБС, асобныя яго элементы прысутнічаюць у спецыяльных бібліятэках.

**АБ вядзе:**

- карткавы ўніверсальны каталог і ўніверсальную бібліяграфічную БД (даступную праз электронны каталог бібліятэкі),

-зводны карткавы краязнаўчы каталог,

- карткавы, друкаваны і/ці электронны каталог мясцовых выданняў

- карткавы алфавітны каталог краязнаўчых выданняў

- універсальную (камбінаваную) БД аб рэгіёне, дзе камлексіруюць бібліяграфічную, фактаграфічную і паўнатэкставую інфармацыю.

Усе гэтыя кампаненты з найбольшай паўнатой адлюстроўваюць дакументаваныя веды аб вобласці.

КДБФ абласной бібліятэкі ўключае даведачныя і бібліяграфічныя дапаможнікі, афіцыйныя дакументы аб вобласці, асобных яе адміністрацыйна-тэрытарыяльных аб'ектах і населеных пунктах, аб насельніцтве. У фондах неапублікаваных дакументаў захоўваюцца складаныя тэматычныя даведкі, рукапісныя бібліяграфічныя працы. У некаторых бібліятэках Расіі фарміруюцца электронныя архівы выкананых краязнаўчых даведак.

**КДБА ЦБС** структурна падобны на КДБА абласных бібліятэк. На сучасным этапе ён прадстаўлены:

- сістэматычнымі краязнаўчымі картатэкамі (яны могуць называцца таксама ўніверсальнымі)

- электроннымі БД.

**КДБФ** уключае даведачныя і бібліяграфічныя выданні, кампакт-дыскі і іншыя алічбаваныя рэсурсы, прысвечаныя раёну ці гораду, а таксама вобласці, на тэрыторыі, якой яны размешчаны.

**КДБА** дзіцячых бібліятэк – ахоплівае тэматычныя і біябібліяграфічныя БД і краязнаўчыя картатэкі (н-д, "Іх імёнамі названы вуліцы …. горада".

**КДБА бібліятэк універсітэтаў і навуковых устаноў –** базы даных публікацый супрацоўнікаў, біябібліяграфічныя слоўнікі выкладчыкаў і вучоных, персанальныя бібліяграфічныя паказальнікі выдатных вучоных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гэтых устаноў; базы даных зместу перыядычных навуковых выданняў, якія выпускае даная ўстанова; базы даных тыпу "Універсітэт у друку".

КДБА размяшчаецца ў краязнаўчых аддзелах/сектарах абласных бібліятэк і ў краязнаўчых сектарах у некаторых ЦБС. У ЦБС, якія не маюць спецыялізаваных краязнаўчых падраздзяленняў, краязнаўчыя картатэкі, як правіла, знаходзяцца ў чытальных залах.

Для забеспячэння ўніфікаванай методыкі вядзення КК, у т.л. пераемнасці пры далучэнні новых работнікаў, неабходна наступная нарматыўна-метадычная дакументацыя: схема каталога (рабочая), пашпарт, тэхналагічныя інструкцыі па выкананні асобных працэсаў, картатэка прагледжаных крыніц, якая дазваляе здзейсніць кантроль за адлюстраваным патокам дакументаў, пазбягаць дубліравання, выбіраць чарговыя крыніцы для выяўлення краязнаўчага матэрыялу і інш.

## 2. Краязнаўчыя БД і БД мясцовых дакументаў

**Базы даных.** Сістэма БД ўяўляе сабой адносна самастойную частку электроннага ДБА бібліятэкі і звязаная з іншымі яго элементамі ў лакальнай сетцы. Гэтым забяспечваецца тэхналагічная магчымасць аднаразовай апрацоўкі краязнаўчых дакументаў і мясцовых выданняў, аператыўнага і камфортнага бібліятэчна-бібліяграфічнага абслугоўвання чытачоў бібліятэкі і аддаленых карыстальнікаў.

Склад БД, іх размеркаванне па структурных падраздзяленнях, суадносіны паміж сабой і з агульным ДБА у бібліятэках вызначаецца самастойна. Па магчымасці выключаюцца: шматразовая апрацоўка адных і тых жа дакументаў, дубліраванне або размеркаванне інфармацыі па некалькіх аднатыпных БД.

На сучасным этапе актыўна ствараюцца і выкарыстоўваюцца краязнаўчыя бібліяграфічныя, фактаграфічныя і поўнатэкставыя БД. Яны належаць да найбольш перспектыўных элементаў інфармацыйных рэсурсаў сучаснага бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства. У многіх БД гэтыя віды інфармацыі сінтэзуюцца, дадаецца выяўленчая і іншая інфармацыя, таму чотка вызначыць відавую прыналежнасць некаторых БД не заўсёды магчыма.

БД краязнаўчага характару ствараюцца абласнымі, публічнымі і спецыяльнымі бібліятэкамі, нярэдка з удзелам іншых арганізацый, ўстаноў і асобных спецыялістаў (асабліва ў Расіі).

**Бібліяграфічныя БД.** Асноўнымі бібліяграфічнымі БД з'яўляюцца:

1) універсальныя БД аб рэгіёне/населеным пункце і 2) БД мясцовых дакументаў.

У беларускіх ЦБС і абласных бібліятэках з сярэдзіны 1990-х гг. ствараюцца ўніверсальныя БД "Краязнаўства". Яны з'яўляюцца найбольш поўным крыніцай звестак па любым пытанні вывучэння краю. Уключаюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліяграфічныя апісанні кніг, брашур, выяўленчых выданняў, картаграфічных выданняў, артыкулаў з кніг, зборнікаў, перыядычных выданняў і інш.

З найбольшай паўнатой распісваецца мясцовы перыядычны друк (раённыя, гарадскія газеты і інш.)

Напрыклад, БД "Краязнаўства" Гродзенскай АБ імя Я. Карскага уключае каля 70000 аналітычных бібліяграфічных запісаў краязнаўчай тэматыкі з кніг, перыядычных выданняў і іншых відаў дакументаў. На яе аснове ствараецца бібліяграфічны паказальнік "Новая літаратура аб Гродзенскай вобласці". Запісы прадстаўлены на беларускай, рускай, польскай, англійскай, нямецкай і французскай мовах 10. 2016 г.).

Універсальная бібліяграфічная БД Віцебскай АБ разам з кнігамі, артыкуламі, адлюстроўвае выяўленчыя і картаграфічныя выданні.

БД “Краязнаўства” у беларускіх бібліятэках з’яўляюцца часткай ЭК.

1. Стварэнне аналітычных бібліяграфічных запісаў у АБ вядзецца ў краязнаўчых аддзелах і сектарах, а на асобныя выданні – у аддзелах камплектавання і апрацоўкі. Паводле праграмнага забеспячэння АЛІС пры апрацоўцы паступаючых дакументаў супрацоўнікі аддзелаў камплектавання і апрацоўкі лічбай 5 пазначаюць новыя краязнаўчыя выданні. Гэта лічба ўносіцца ў спецыяльнае поле “Прымета тэматычнай базы”. Дзякуючы гэтаму БЗ на краязнаўчыя выданні і артыкулы аб’ядноўваюцца ў агульны краязнаўчы масіў БЗ.

БЗ на самастойныя выданні і аналітычныя БЗ аб’ядноўваюцца ў падбазу “Краязнаўства” і прадстаўляюцца праз адзіны электронны каталог бібліятэкі. З’яўляюца найбольш поўнымі крыніцамі звестак аб канкрэтным рэгіёне па ўсіх галінах ведаў.

Бліжэйшая задача - стварэнне рэгіянальных зводных электроных каталогаў (РЗЭК) у абласцях. Яны будуць элементамі Зводнага электроннага каталога (ЗЭК) бібліятэк Беларусі і рэсурса нацыянальнай бібліяграфіі краіны. Гэта дазволіць з найбольшай паўнатой прадставіць БЗ на краязнаўчыя дакументы, забяспечыць доступ да іх праз Інтэрнет. На бягучы час функцыянуюць РЗЭК Гродзенскай і Гомельскай абласцей, але пакуль забяспечваюць доступ толькі да БЗ абласных бібліятэк, цэнтралізаваных сістэма гарадскіх бібліятэк абласных цэнтраў і па адной з раённых ЦБС. Вядзецца работа па стварэнні РЗЭК іншых абласцей Беларусі.

У Расіі некаторыя бібліятэкі вядуць самастойны ЭКК.

**Вельмі важна!** Бібліяграфічныя запісы, якія складаюць напаўненне краязнаўчых бібліяграфічных БД і ЭК у Беларусі, ствараюцца ў разліку на выкарыстанне ў нацыянальнай бібліяграфіі, ЗЭК, НЭБ, у рэгіянальным, нацыянальным і міжнародным інфармацыйным абмене. Яны павінны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэхналагічна адпавядаць стандартам, па якіх ствараюцца буйнейшыя нацыянальныя ІР.

*Таму існуе некалькі праблем, якія патрабуюць вырашэння:*

1) Пашырэнне аб'ектаў бібліяграфічнага адлюстравання – замежнамоўных, сеткавых і інш.

БД "Краязнаўства" трэба ствараць шляхам кааперацыі і каардынацыі ўсіх аддзелаў бібліятэкі, якія апісваюць бягучыя паступленні, уводзяць апісанні ў ЭК, ажыццяўляюць сэнсавую апрацоўку дакументаў ці займаюцца стварэннем бібліяграфічных і рэтраспектыўных паказальнікаў. Любы дакумент, які ўводзіцца ў ЭК, павінен аналізавацца на наяўнасць у ім краязнаўчага матэрыялу і атрымліваць адпаведную сэнсавую апрацоўку. Пажадана ў аддзелах АБ прызначаць адказных супрацоўнікоў за выяўленне краязнаўчага матэрыялу і аб'яднаць іх у рабочую групу "Краязнаўства". Яны б забяспечылі ўкараненне аптымальнай методыкі і тэхналогіі вядзення БД, стварэнне новых слоўнікавых сродкаў ці адаптацыю тых, што існуюць, з улікам мясцовай спецыфікі, іх пастаянную падтрымку.

Узаемадзеянне АБ з ЦБС магло б заключацца ў тым, што ЦБ пастаўлялі б цалкам падрыхтаваныя БЗ у АБ для агульнай БД "Краязнаўства". Другі варыянт, калі часткі БД "Краязнаўства" захоўваюцца ў кожнай ЦБС і выклікаюцца для пошуку.

2) Індэксаванне краязнаўчых дакументаў.

Асноўныя інструменты індэксавання: Для індэксавання краязнаўчых дакументаў у Беларусі будзе выкарыстоўвацца УДК. Пакуль выкарыстоўваецца "**Тыпавая схема класіфікацыі дакументаў для краязнаўчых каталога (картатэк) бібліятэк РБ".** У беларускамоўным выданні УДК упершыню створана класіфікацыя айчыннай гісторыі. Прычына пераводу – недапушчальнасць разнастайных несумяшчальных класіфікацыйных сістэм пры стварэнні важнейшых нацыянальных рэсурсаў: Зводнага электроннага каталога, НЭБ. Краязнаўчыя інфармацыйныя масівы ўвойдуць у гэтыя рэсурсы.

Выкарыстоўваецца таксама індэксаванне **ключавымі словамі.** Ключавыя словы дапамагаюць адлюстраваць вузкія паняцці (дэталі), якія характэрны для краязнаўчай літаратуры.

Краязнаўчыя каталогі і БД, ствараемыя бібліятэкай, з'яўляюцца яе інтэлектуальнай уласнасцю. Бібліятэка мае права кантраляваць капіраванне значных па аб'ёме масіваў БЗ з картачных і электронных каталогаў і абмяжоўваць яго праграмнымі ці іншымі сродкамі. Прадастаўленне вялікіх масіваў запісаў можа ажыццяўляцца на аснове дагавораў або за плату.

Зводныя каталогі бібліятэк абласцей Расійскай Федэрацыі з'яўляюцца рэгіянальнымі часткамі Зводнага каталога бібліятэк Расіі. Такі падыход будзе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ажыццяўляцца і ў Беларусі. У аснове тэхналогіі карпаратыўнага ўзаемадзеяння:

- выкарыстанне адзінага праграмнага забеспячэння, для забяспечэння каталагізацыі дакументаў у вэб-асяроддзі;

- выкарыстанне фармату BelMARC, у якасці рэгіянальнага карпаратыўнага фармату.

2) *БД мясцовых выданняў.* Максімальна поўна адлюстроўваюць бібліяграфічныя звесткі аб выдавецкай прадукцыі вобласці (горада), у т.л. пры адсутнасці асобных выданняў у бібліятэчных фондах. З'яўляюцца каштоўнымі крыніцамі звестак па гісторыі і культуры края. Ахопліваюць кнігі, перыядычныя выданні, прадаўжальныя выданні, лістоўкі. Бібліяграфічны ўлік гэтых выданняў мае крыніцазнаўчае і практычнае значэнне, садзейнічае вывучэнню друкаванай прадукцыі рэгіёна, дакамплектаванню бібліятэчнага фонда, выяўленню рэдкіх выданняў, папаўненню БД краязнаўчых дакументаў.

Так, у Электронным каталозе Магілёўскай вобласці з падтрымліваецца БД "Мясцовыя выданні" (вядзецца з 2007). БД мясцовых выданняў вядзецца у Брэсцкай АБ.

Рэальны шлях стварэння бібліяграфічнага рэпертуару мясцовых дакументаў, як часткі рэгіянальнай і нацыянальнай інфармацыйнай прасторы, бачыцца ў сувязі з распрацоўкай электроннага інфармацыйнага рэсурса (ЭІР) "Нацыянальная бібліяграфія Беларусі". У рамках стварэння данага рэсурса, які з'яўляецца важнай часткай бібліяграфічнага рэпертуару нацыянальнага дакумента, дзяржаўнай бібліяграфіі, абласныя бібліятэкі павінны выступіць ў ролі рэгіянальных цэнтраў каталагізацыі і бібліяграфіі мясцовага друку, мэтай якіх будзе прадстаўленне максімальна поўнай бягучай і рэтраспектыўнай бібліяграфічнай інфармацыі аб мясцовых дакументах.

**Камбініраваныя БД,** сумяшчаюць бібліяграфічную, фактаграфічную і поўнатэкставую інфармацыю і даныя ў пэўных суадносінах. Такія БД уключаюць тэкставую інфармацыю, фатаграфіі, аўдыёматэрыялы і інш.

Да ліку буйнейшых належаць БД Гомельскай АБ "Спадчына Гомельшчыны", Магілёўскай АБ "Край мой – Магілёўшчына", Віцебскай АБ "Прыдзвінскі край: гісторыя і сучаснасць".

Гэтыя БД утрымліваюць блокі звестак актуальнай краязнаўчай тэматыкі: аб персаналіях, адміністрацыйна-тэрытарыяльнай структуры, падзеях, помніках, эканоміцы і па іншых галінах.

*Так, БД "Памяць Гродзеншчыны"* адлюстроўвае найважнейшыя гістарычныя падзеі ў эканамічнай, грамадска-палітычнай, сацыякультурнай сферах жыцця Гродзеншчыны і звесткі пра гістарычных асоб, прадстаўнікоў знакамітых родаў, дзеячаў навукі, тэхнікі, эканомікі, а таксама культуры,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацтва, літаратуры, спорту, грамадска-палітычных, ваенных, рэлігійных дзеячах, якія адыгралі важную ролю ў гісторыі ці грамадскім жыцці Гродзеншчыны, нашай ці іншых краін і былі звязаны з нашай вобласцю месцам нараджэння, жыццём і дзейнасцю. Праграмнае забеспячэнне дазваляе ўключэнне ў БД не толькі тэкставай, але і бібліяграфічнай, графічнай, картаграфічнай і выяўленчай інфармацыі. На аснове БД выходзіць традыцыйнае выданне *"Краязнаўчы каляндар"*. Доступ да БД "Памяць Гродзеншчыны" і пошук у ёй ажыццяўляецца толькі *ў* аддзеле краязнаўства абласной бібліятэкі.

Часта такія БД ствараюцца абласнымі бібліятэкамі сумесна з ЦБС, г. зн., перадаюць у АБ масівы даных, створаныя імі аб гарадах і раёнах і могуць карыстацца агульным інфармацыйным рэсурсам. Так арганізавалі работу Гомельская, Магілёўская, Віцебская АБ. У сеткавым рэжыме даступнымі з'яўляюцца БД Магілёўскай АУНБ “Край мой – Магілёўшчына” (www. Mlib.basnet.by/kray/) і Віцебскай АУНБ “Прыдзвінскі край: гісторыя і сучаснасць (http: // lib. vitebsk.net/”, “Памяць Гродзеншчыны”. Прызначэнне гэтых БД даць комплекс даных рознага зместу аб раёнах і гарадах. Матэрыялы збіраюцца ўсімі ЦРБ і структурыраваны па раёнах, асобна – аб абласных цэнтрах. Так, у БД “Край мой – Магілёўшчына” асноўнымі раздзеламі з'яўляюцца “Гісторыя раёна”, “Знакамітыя людзі раёна” і “Эканоміка раёна”. Такое напаўненне прадстаўляе значны інтарэс для многіх карыстальнікаў, у т.л. для студэнтаў і навучэнцаў пры вывучэнні рэгіёназнаўчых дысцыплін і тэм. У БД сканіраваны тэксты з сучасных і каштоўных рэтраспектыўных выданняў. Лакальныя копіі зводнай БД выстаўлены ва ўсіх ЦРБ на рабочыя месцы “Абслугоўванне чытачоў”, а таксама ў бібліятэках аграгарадкоў. На жаль, раздзелы “Знакамітыя людзі раёна” і “Эканоміка раёна” не даступны праз інтэрнет.

**Фактаграфічныя БД** ствараюцца па актуальнай тэматыцы, адлюстроўваюць старанна сабраныя звесткі, якіх не хапае ў наяўных даведачных выданнях. Як правіла, збор звестак вядзецца па многіх крыніцах і патрабуе шмат часу і апрацоўкі. Да ліку распаўсюджаных фактаграфічных БД можна аднесці: “Установы і арганізацыі края”, “Дзеячы края”, “Навучальныя установы края”, “Хроніка края” (“Летапіс края”), “Край ў лічбах і фактах”, “Помнікі і памятныя мясціны края” і інш.

Асноўнымі элементамі інфармацыйнага паведамлення ў іх з'яўляюцца фармалізаваныя фактаграфічныя даныя: звесткі біяграфічнага характару, апісанні падзей, даты і інш. Дадаткова указваюцца крыніцы звестак, г.зн. бібліяграфічныя звесткі.

**Поўнатэкставыя БД** ствараюцца ў мэтах захавання найбольш каштоўных і рэдкіх краязнаўчых дакументаў і забеспячэння даступнасці да

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

іх. (Многа такіх дакументаў знаходзіцца не толькі ў бібліятэках, а ў музеях, архівах, прыватных зборах. Рассеянасць дакументаў, іх дрэнны стан і адзінкавасць экземпляраў вельмі актуалізуюць пытанне алічбоўкі). Падчас генерацыі паўнатэкставых БД паралельна ствараюцца графічныя БД, якія адлюстроўваюць тэксты і бібліяграфічныя БД, якія спрыяюць удасканаленню пошукавых магчымасцей поўнатэкставых БД. Напрыклад, з мясцовых перыядычных выданняў выяўляюцца артыкулы з фактычнай інфармацыяй аб рэгіёне, яны атрымліваюць БА, індэксы; у асобнае поле заносяцца звесткі аб назве файла, у якім захоўваецца графічны вобраз старонкі і каардынаты верхняга левага і ніжняга правага вуглоў газетнай старонкі. Калі артыкул складаецца з некалькіх фрагментаў, то поле паўтараецца.

Бібліяграфічная і графічная БД звязаны паміж сабою спецыяльнай пошукавай праграмай, якая ў адказ на запыт хутка фарміруе графічны вобраз дакумента, напрыклад, артыкула з газеты, выразаючы яго з газетнай паласы, ці па жаданні карыстальніка, прадстаўляючы газетную паласу цалкам.

Суцэльны прагляд газет вядзецца з дапамогай каляндарных табліц, у якія занесены нумар газеты і кожная яго газетная паласа. З рэжыма табліцы можна выйсці ў рэжым асобнай газетнай паласы і прачытаць поўнасцю нумар газеты, уключаны ў графічную базу.

Уключаныя ў БД артыкулы магчыма шукаць па шэрагу прымет: аўтару, назве, тэме, назве мерапрыемства, назве арганізацыі, прымеце персаналіі, па ключавому слову. Кожнае бібліяграфічнае апісанне можа быць выведзена на экран з усімі пошукавымі элементамі: прадметнымі рубрыкамі, ключавымі словамі. Хаця ў бібліяграфічныя БД трапляюць, як правіла, не ўсе артыкулы з перыядычных выданняў, карыстальнікі пры неабходнасці могуць весці пошук патрэбных звестак шляхам прагляду графічнай базы, дзе можна бачыць, напрыклад, усю паласу газеты. Класічных поўнатэкставых краязнаўчых БД у беларускіх бібліятэк пакуль яшчэ няма.

## Пытанне 3. Карткавыя і друкаваныя краязнаўчыя каталогі і каталогі мясцовых дакументаў; краязнаўчыя картатэкі.

На сучасным этапе карткавыя краязнаўчыя каталогі распаўсюджаны у АБ і ЦБС. Яны поўна адлюстроўваюць дакументы аб вобласці, раёне, горадзе (мікрараёне), вёсцы. Аб’ектам адлюстравання ў краязнаўчым каталозе з'яўляюцца розныя віды дакументаў: самастойныя выданні, артыкулы са зборнікаў, часопісаў і газет, рэцэнзіі, друкаваныя творы выяўленчага мастацтва, картаграфічныя матэрыялы, ноты, апісанні частак выданняў – асобных глаў, раздзелаў, старонак, якія змяшчаюць матэрыял аб тэрыторыі, рукапісныя матэрыялы, АВ-матэрыялы, СД-РОМ, электронныя рэсурсы, у тл., размешчаныя ў Інтэрнет.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўны крытэрый для ўключэння звестак аб дакуменце ў краязнаўчы каталог – гэта яго якасць – наяўнасць важных звестак, фактаў, навуковых высноў, мастацкае ўвасабленне мясцовай рэчаіснасці. Малазначныя матэрыялы не ўключаюцца.

**Карткавыя краязнаўчыя** каталогі абласных бібліятэк, як правіла складаюцца з трох частак: сістэматычнай, тапаграфічнай і біябібліяграфічнай (персаналій). У некаторых бібліятэках вядуцца алфавітныя каталогі краязнаўчых кніг.

**Сістэматычныя** часткі карткавых краязнаўчых каталогаў (картатэк) вядуцца па “Тыпавой схеме класіфікацыі дакументаў для краязнаўчых каталогаў (картатэк) бібліятэк Рэспублікі Беларусь”, якая бесперапынна дапрацоўваецца ў бібліятэках як рабочая класіфікацыйная схема. Матэрыял унутры рубрык падзяляецца на: 1) кнігі і іншыя асобныя выданні і 2) артыкулы з перыядычнага друку. Унутры гэтых груп рэкамендуецца адваротна-храналагічная групоўка картачак. Апісанні аднаго года ставяцца ў алфавітным парадку.

**Тапаграфічныя** часткі карткавых краязнаўчых каталогаў прызначаны для больш дакладнага раскрыцця зместу дакументаў у тэрытарыяльным апекце. Таму яны арганізуюцца на аснове адміністрацыйна-тэрытарыльнага падзелу вобласці. Напрыклад, абласны цэнтр, вобласць, раёны, сельскія саветы ў алфавітным парадку. Унутры матэрыял размяшчаецца па тэматычнаму прынцыпу. Напрыклад, у каталозе Магілёўскай АУНБ пасля раздзелаў аб вобласці і горадзе Магілёве, размешчаны раздзяляльнікі на 21 раён і горад абласнога падчынення Бабруйск.

**Біябібліяграфічныя** часткі карткавых краязнаўчых каталогаў (ці персаналій) прызначаны для найбольш поўнага адлюстравання імён асоб, жыццё і дзейнасць якіх звязана з пэўным краем. Уключаюцца даныя аб мясцовых дзеячах, вядомасць якіх абмяжоўваецца краем і выдатных дзеячах, часова ці пастаянна звязаных з краем. Матэрыял аб славутых асобах, вядомых у краіне і свеце, павінен адлюстроўвацца толькі ў аспекце сувязі “асоба – край”. Аб знакамітых ураджэнцах, дзейнасць якіх працякала за межамі края, уключаюць матэрыялы, прысвечаныя іх паходжанню і пачатковаму перыяду жыцця. Матэрыялы аб знаходжанні ў краі вядомых грамадска-палітычных дзеячоў, вучоных, дзеячоў мастацтва і іншых знакамітасцей адлюстроўваюцца ў адпаведных раздзелах сістэматычнага КК, напрыклад, “Літаратурнае жыццё” і інш. Ствараць персаналіі на такіх асоб не мэтазгодна.

Групоўка персанальных рубрык можа быць у алфавіце прозвішчаў або па родах дзейнасці асоб. Рэкамендуецца першы спосаб. Пры другім рассейваецца інфармацыя аб асобах, дзейнасць якіх ахоплівае некалькі галін.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Акрамя таго карыстальнікі ў пачатку інфармацыйна-спажывецкай дзейнасці не заўсёды дакладна ведаюць профіль дзейнасці адшукваемых асоб.

Папаўненне краязнаўчых каталогаў вядзецца па шырокаму колу крыніц. Новыя дакументы выяўляюцца шляхам прагляду новых паступленняў у бібліятэку, з дапамогай матэрыялаў выдавецка-кнігагандлёвай бібліяграфіі, пошуках на сайтах выдавецтваў і інш. Выяўленне дакументаў мінулых гадоў – з дапамогай пошукаў у фондах буйных кнігасховішчаў, па рэтраспектыўных бібліяграфічных паказальніках і БД.

Краязнаўчыя каталогі павінны арганічна ўваходзіць у агульны ДБА бібліятэкі Таму яны ўзаемнымі спасылкамі звязваюцца з сістэматычнымі каталогамі, сістэматычнымі картатэкамі артыкулаў бібліятэкі.

У абласных бібліятэках Беларусі карткавыя краязнаўчыя каталогі складаюць звыш 350 000 бібліяграфічных запісаў.

Акрамя сістэматычных краязнаўчых каталогаў вядуцца:

1) алфавітныя каталогі мясцовых выданняў. Гэта кнігі, ноты, карты, выяўленчыя матэрыялы (камплекты паштовак), аўдыёвізуальныя матэрыялы (Гродно : мультимедийная презентация);

2) алфавітныя каталогі прац мясцовых аўтараў. Вядзецца ў алфавіце аўтараў.

3) алфавітныя каталогі на фонд аддзела.

4) храналагічныя каталогі мясцовых выданняў.

**Каталогі мясцовых дакументаў.** Адлюстроўваюць усе віды дакументаў ад пачатку ўзнікнення кнігадрукавання ў населеным пункце ці адміністрацыйна-тэрытарыяльным аб’екце (вобласці, раёне). З’яўляюцца зводнымі, т. як поўнымі калекцыямі ўсіх мясцовых выданняў бібліятэкі не валодаюць. Ахопліваюць любыя віды дакументаў. Карткавыя каталогі мясцовых дакументаў змяшчаюць два рады: 1) кніг і іншых самастойных выданняў, 2) перыядычных выданняў. БЗ кніг і самастойных выданняў арганізуюцца ў храналагічным парадку; перыядычных выданняў у алфавіце.

Напрыклад, каталог мясцовых дакументаў у Магілёўскай АБ утрымлівае інфармацыю пачынаючы з 1638 г.

**Друкаваныя каталогі** – гэта бібліяграфічныя дапаможнікі, якія звычайна змяшчаюць дзве часткі. 1) – гэта даследаванне мясцовага кнігавыдання; 2) уласна зводны каталог мясцовых выданняў. З'яўляюцца ўніверсальным па змесце бібліяграфічным дапаможнікам. Ахопліваюць значныя перыяды развіцця кнігадрукавання: ад пачатку з’яўлення першага выдання да ўстаноўленай верхняй даты, н-д, да 1917 г. і інш. Адлюстроўваюць кнігі, брашуры, альбомы, геаграфічныя карты, нотныя і ліставыя выданні, прэйскуранты, перыядычныя і па-часовыя выданні

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(часопісы, газеты). Выдатны прыклад, каталог “Мінскія выданні 1622 – 1917 гг. Ахоплівае звыш 3 тысяч бібліяграфічных запісаў, размеркаваных у храналагічным парадку з указаннем. Каталог падрыхтаваны Л.І. Доўнар.

*(У Расіі выходзяць зводныя друкаваныя і электронныя каталогі. Н-д, такім дапаможнікам з'яўляецца Коновалова, Е. Н. Книга Тобольской губернии. 1790–1917 гг. Сводный каталог местных изданий (Новосібірск, 2006)).*

Бібліяграфічныя і фактаграфічныя краязнаўчыя картатэкі вядуцца бібліятэкамі ўсіх тыпаў. Сістэматычныя краязнаўчыя картатэкі вядуцца у ЦБС, школьных бібліятэках і некаторых іншых спецыяльных бібліятэках. Тэхналогія па ўзору краязнаўчых каталогаў.

ЦБС вядуць бібліяграфічныя картатэкі афіцыйных дакументаў мясцовых органаў улады і кіравання, картатэкі па экалагічных праблемах рэгіёнаў і па іншых актуальных тэмах. Адметнасцю бібліяграфічных краязнаўчых картатэк з'яўляецца шырокае адлюстраванне матэрыялаў з мясцовай перыёдыкі і іншых рэгіянальных выданняў.

Фактаграфічныя картатэкі прысвечаюцца хроніцы рэгіёнаў, падзеям, асобам. Гэта картатэкі народных лекараў, майстроў, тапанімічных назваў, дзелавой інфармацыі, дзяцей інвалідаў, замоў, народных прымет і інш. У залежнасці ад тэматыкі ў такіх картатэках каротка фармулююць асноўныя фактычныя даныя. Так, калі адлюстроўваюцца персаналіі, неабходна указаць поўнае імя, звесткі аб дзейнасці, якой вызначыўся чалавек, магчыма яго адрас (калі гэта лекар, майстар), узнагароды. Напрыклад, Стаўбцоўская ЦБС вядзе “Зводную картатэку народных лекараў раёна”, “Замовы і народныя прыметы” і інш. Напрыклад, у картатэцы “Слынныя імёны Гарадзеншчыны” Гродзенскай АБ змешчаны звесткі пра 2000 мясцовых дзеячаў і ўраджанцаў вобласці (на 2013).

Агульныя фактаграфічныя картатэкі тыпу “Факт” адлюстроўваюць найбольш значныя падзеі, мерапрыемствы, даты рэгіёна. Напрыклад, у Віцебскай АБ картатэка “Факт” вядзецца сектарам краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі (галоўным бібліятэкарам). Загалоўкам з'яўляюцца назвы найбольш значных мерапрыемстваў, падзей, дат горада, час і месца іх правядзення. Па меры ўкаранення сродкаў аўтаматызацыі карткавыя картатэкі пераўтвараюцца ў БД.

**Пытанне 4. Краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны фонд (КДБФ) бібліятэкі**

Значнасць краязнаўчага ДБФ абумоўлена яго патэнцыялам для выканання фактаграфічных і бібліяграфічных даведак. Частка ДБФ, прызначаная пераважна для выканання фактаграфічных запытаў карыстальнікаў фарміруецца з даведачных выданняў, якія змяшчаюць матэрыялы пра даную тэрыторыю ці населены пункт. Трэба адзначыць, што ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

апошні час назіраецца павышэнне выпуску даведачнай літаратуры, прысвечанай невялікім тэрыторыям. Калі краязнаўчае даведачнае выданне маецца ў бібліятэцы ў адным экземпляры, яно ўключаецца ў краязнаўчы фонд, калі экземпляраў больш – адзін выдзяляецца ў КДБФ. У любым выпадку бібліёграф павінен добра ўяўляць, якія выданні маюць даведачны характар і адпаведна іх выкарыстоўваць. У даведачную частку КДБФ уключаюць:

1) Універсальныя даведачныя выданні аб рэгіёне/населеным пункце. Да ліку іх адносяцца рэгіянальныя энцыклапедыі і даведнікі сучаснага часу і рэтраспектыўныя. Сярод сучасных рэгіянальных энцыклапедый і даведнікаў распаўсюджаны выданні тыпу “Віцебск”, “Гродна”, “Мінск”, “Брэсцкая вобласць”, “Гомельская вобласць” і т.п. Зараз яны перавыдаюцца раз у некалькі год і станоўча, што з'явіліся падобныя даведнікі аб невялікіх тэрыторыях. Гэтыя выданні ўключаюць кароткія звесткі аб мінулым, асабліва гісторыка-культурнага характару, і больш поўна прадстаўляюць сучасныя дасягненні рэгіёна, у .т. л. у лічбах. Маюць добрае паліграфічнае афармленне. Выкарыстоўваюцца пераважна для задавальнення фактаграфічных запытаў навучэнцаў і студэнтаў, аматараў краязнаўства, журналістаў, настаўнікаў і інш.

Да ліку універсальных даведачных выданняў адносяцца гісторыка-дакументальныя хронікі “Памяць”, прысвечаныя абласцям, раёнам і гарадам Беларусі. У гэтых унікальных даведніках у комплексе прадстаўлены важнейшыя гістарычныя дакументы, статыстычныя звесткі, сабраны матэрыялы з шырокага кола крыніц, якія характарызуюць гістарычны ход падзей, розныя бакі жыцця, змешчана багатая персанальная інфармацыя, уключаючы фотадакументы і інш. Невыпадкова кнігі гісторыка-дакументальнай хронікі набылі значэнне лепшага памочніка ў даведачна-бібліяграфічным абслугоўванні ў ЦБС.

Падобнымі да гісторыка-дакументальных хронік серыі “Памяць” з'яўляюцца асобныя выданні гэтага ж тыпу, здзейсненыя сучаснымі краязнаўцамі па індывідуальнаму замыслу. Гэта “Хроніка Убарцкага Палесся” (Лельчыцкага раёна Гомельскай вобласці) краязнаўцы-аматара Анатоля Атнагулава. Выданне прадстаўляе сабой сістэматызаваны унікальны збор гістарычных дакументаў, звестак і фактаў гісторыі края. Да ліку выдатных гісторыка-дакументальных хронік адносіцца “Деревни и люди Мозырщины”: Ист.-док. хроника Мозыр. р-на, всех сельсоветов и насел. пунктов региона (деревень, поселков, хуторов) (2001).

Павышэнне інтарэсу да краязнаўства ў сучасным грамадстве дазваляе прагназаваць павялічэнне выпуску такіх выданняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Каштоўнымі элементамі з'яўляюцца летапісы вёсак, падрыхтаваныя работнікамі сельскіх бібліятэк. Яны змяшчаюць унікальныя матэрыялы пра гэтыя пасяленні.

2) Даведнікі рэгіянальных статыстычных упраўленняў (абласных, гарадскіх, раённых). Гэта універсальныя даведнікі тыпа “Народная гаспадарка вобласці за перыяд, у годзе”, “Вобласць у годзе” і галіновыя, тэматычныя даведнікі “Народная адукацыя вобласці ў годзе”, “Медыцына і ахова здароўя вобласці ў годзе”, “Жанчыны вобласці” і інш. Прадстаўляюць афіцыйныя статыстычныя даныя аб стане рэгіянальнага развіцця.

3) Даведачна-інфармацыйныя матэрыялы, ствараемыя раённымі і гарадскімі выканкамамі. Змяшчаюць пераважна даныя і статыстыку сучаснага развіцця рэгёнаў, але адлюстроўваюць і важнейшыя гісторыка-культурныя звесткі. Маюць прыгожае афармленне.

4) Каляндары знамянальных і памятных дат. Рыхтуюцца АУНБ і ЦБС. Некаторыя з іх змяшчаюць толькі фактаграфічныя звесткі.

5) Тапанімічныя даведнікі. Дазваляюць выконваць шматлікія запыты, звязаныя з паходжаннем назваў. Гэта, напрыклад, вельмі папулярныя і зручныя ў выкарыстанні тапанімічныя “Слоўнікі назваў населеных пунктаў” Яўгена Рапановіча, якія выходзілі ў канцы 70-х-80-я гады XX ст. Стан населеных пунктаў краіны на сучасны час зафіксаваны ў новым нарматыўным даведачным выданні “Назвы населеных пунктаў...вобласці”. Стваральнікі Інстытут мовазнаўства імя Я.Коласа НАН Беларусі, Рэспубліканская тапанімічная камісія НАН Беларусі, сумесна з цэнтрамі картаграфіі і геадэзіі краіны. Асобныя бібліятэкі вядуць дасье мясцовай тапанімікі.

6) Дыялектныя слоўнікі. Гэта слоўнікі рэгіянальных гаворак, напрыклад, “Краёвы слоўнік Лагойшчыны”, “Матэрыялы для слоўніка Мінска-Маладзечанскіх гаворак”, “Слоўнік Гродзенскай вобласці”, “Тураўскі слоўнік” і інш. Важна прадставіць у ДБФ як дыялектныя слоўнікі, што адлюстроўвалі мову рэгёна ў мінулым, так і сучасныя. Фактычна зараз мова ўсіх рэгёнаў Беларусі адлюстравана ў дыялектных слоўніках, выдадзеных у той ці іншы час. Асобныя бібліятэкі самі выступаюць збіральнікамі сучаснага моўнага матэрыялу, якія ўяўляе вялікую каштоўнасць і будзе служыць вывучэнню развіцця мовы на тэрыторыі рэгёна(Свіслачская ЦБС). Гэтыя матэрыялы павінны быць прадстаўлены ў ДБФ.

7) Генеалагічныя даведнікі. Перш за ўсё бібліятэкі сочаць за з'яўленнем рэгіянальных даведнікаў, напрыклад, Яцкевіч З. “Малы гербоўнік Халопеніцкай шляхты”, “Гербоўнік Наваградскай шляхты” і інш. Генеалагічныя даведнікі дапамагаюць вывучаць сямейную гісторыю, гісторыю мясцовых шляхецкіх родаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

8) Навуковыя, навукова-папулярныя і вучэбныя выданні з вялікім і унікальным фактаграфічным матэрыялам. Напрыклад, упершыню на сучасным этапе з'явіліся кнігі, аднесеныя да новага кірунку краязнаўчых даследаванняў "вёсказнаўства". Гэта кнігі, прысвечаныя асобным вёскам, напісаныя іх ураджэнцамі. Падрыхтаваны па унікальных крыніцах: архіўных дакументах, успамінах і інш.

9) Адрасныя і тэлефонныя рэгіянальныя даведнікі.

10) Бізнес-даведнікі. Прадстаўляюць даныя аб суб'ектах гаспадарання розных формаў уласнасці, іх паслугах, таварах. Змяшчаюць юрыдычныя рэквізіты, кантактныя тэлефоны. Распаўсюджаны універсальныя бягучыя бізнес-даведнікі і тэматычныя.

На сучасным этапе бібліятэкі імкнуцца папоўніць КДБФ каштоўнымі даведачнымі выданнямі мінулага. Зараз узнікла магчымасць набываць алічбаваныя выданні, як, напрыклад, "Памятныя кніжкі Магілёўскай губерні", якія пачалі выходзіць на CD-ROM. З'яўленне падобных кампакт-дыскаў павінна ўважліва адсочвацца бібліёграфамі-краязнаўцамі.

Бібліяграфічная частка ДБФ уключае галіновыя, тэматычныя, персанальныя бібліяграфічныя дапаможнікі, прысвечаныя данай тэрыторыі, як новыя, так і створаныя ў ранейшыя часы. Вельмі карыснымі з'яўляюцца універсальныя бягучыя паказальнікі аб абласцях, якія на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў выдаюцца ўсімі АБ краіны. Карысна выяўляць і ўключаць у ДБФ бібліяграфічныя матэрыялы аб тэрыторыі, асобных населеных пунктах і выдатных асобах, якія часта змяшчаюцца ў бюлетэні "Новыя кнігі: па старонках беларускага друку". Прадстаўляецца мэтазгодным выяўляць і адлюстроўваць у КДБФ замежныя бібліяграфічныя матэрыялы аб тэрыторыях. Яны дапамогуць паглыбіць задавальненне інфармацыйных запытаў даследчыкаў. Уключаюцца таксама паказальнікі мясцовага друку, з дапамогай якіх магчыма выконваць разнастайныя краязнаўчыя запыты. (аб паказчыках мясцовага кнігадрукавання, яго асартыменце, шукаць творы мясцовых аўтараў і інш.).

Такім чынам, бібліёграфы бесперапынна выяўляюць новыя даведачныя і бібліяграфічныя дапаможнікі, вядуць пошукі даведачных выданняў мінулага. У перспектыве найбольш каштоўныя даведачныя выданні будуць алічбоўвацца, што зробіць даступнымі для бібліятэк і карыстальнікаў мноства фактаў і даных мінулага і сучаснасці любых тэрыторый Беларусі.

Карысна выяўляць і выкарыстоўваць інтэрнэт-рэсурсы, якія прадстаўляюць масівы фактаграфічных бібліяграфічных даных аб краі.

## Фонд неапублікаваных бібліяграфічных дапаможнікаў (ФНБД), архіў выкананых даведак

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прызначаецца для захавання рукапісных (неапублікаваных) краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў, копій найбольш складаных тэматычных краязнаўчых даведак з мэтамі паўторнага выкарыстання. Копіі краязнаўчых даведак арганізуюць як самастойны фонд, асабліва калі ў бібліятэцы ёсць структурнае падраздзяленне па краязнаўстве, або ўключаюць іх у агульны фонд выкананых даведак. ФНБД вядзецца ў выглядзе картатэкі; копіі даведак захоўваюцца ў канвертах ці як камп'ютарны файл; у спецыяльных папках. На канверце ўказваюцца метадычныя характарыстыкі выкананай даведкі (тэма, від, колькасць дакументаў, іх відавы, моўны склад і інш.). Пры паўторным выкарыстанні важнай працэсам з'яўляецца дапрацоўка спіса з карэктыроўкай мэтавага і чытацкага прызначэння, асаблівасцей зместу, пошуку новых дакументаў.

У Расіі некаторыя бібліятэкі ствараюць электронныя архівы краязнаўчых даведак, якія выконваліся праз віртуальныя даведачныя службы (у Беларусі няма).

## ЛЕКЦЫЯ 9. АГУЛЬНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ МЕТОДЫКІ БІБЛІЯГРАФАВАННЯ КРАЯЗНАЎЧЫХ ДАКУМЕНТАЎ

**Пытанні:**

Мэта: вывучэнне студэнтамі віда-тыпалагічнага і жанравага складу краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў, асаблівасцей асобных тэхналагічных этапаў іх падрыхтоўкі.

1. Віды, тыпы і жанры краязнаўчых дапаможнікаў.
2. Асаблівасці працэсаў і аперацый падрыхтоўчага этапу.
3. Асаблівасці працэсаў і аперацый аналітычнага этапу.
4. Асаблівасці працэсаў і аперацый сінтэтычнага этапу.
5. Асаблівасці працэсаў і аперацый заключнага этапу.

### Пытанне 1. Віды, тыпы і жанры краязнаўчых дапаможнікаў

На сучасным этапе бібліятэкі ствараюць разнастайныя краязнаўчыя бібліяграфічныя дапаможнікі. Па прымеце грамадскага прызначэння вылучаюць іх **віды**: навукова-дапаможныя, папулярныя, вучэбна-дапаможныя, вытворча-дапаможныя дапаможнікі. Паказальнікі, агляды і спісы з'яўляюцца найбольш распаўсюджанымі **тыпамі** дапаможнікаў. **Жанравы** склад краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі прадстаўлены даведнікамі, каляндарамі знамянальных і памятных дат, гутаркамі аб кнігах, нарысамі, пуцевадзіцелямі, хронікамі, энцыклапедыямі, памяткамі, закладкамі і інш. У залежнасці ад форм існавання краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў выдзяляюцца самастойныя выданні, несамастойныя выдавецкія формы, электронныя БД, карткавыя формы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Для выбару віду і тыпу дапаможніка можна выкарыстаць у якасці ўзору мадэлі краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў, распрацаваныя ў краязнаўчым бібліяграфазнаўстве, якія адлюстроўваюць як грамадскае прызначэнне дапаможнікаў, так і іх класіфікацыю па змесце, тыпах і жанрах. У наш час бібліятэкі ствараюць тыпы і жанры дапаможнікаў, якія сталі класічнымі, – яны адпавядаюць задавальненню ўстойлівых патрэбнасцей у галіне краязнаўства. Гэта, напрыклад, паказальнікі новай літаратуры аб тэрыторыі, каляндары знамянальных і памятных дат, персанальныя паказальнікі. І ў той жа час выпускаюцца дапаможнікі новых жанраў, што сведчыць аб творчых пошуках складальнікаў, прыўнясенні жанрава-стылістычнага вопыту з іншых абласцей літаратурнай і навуковай дзейнасці, аб імкненні да больш глыбокай аналітыка-сінтэтычнай апрацоўкі матэрыялу. У склад найбольш распаўсюджаных **навукова-дапаможных паказальнікаў** уваходзяць універсальныя бягучыя і рэтраспектыўныя аб вобласці (раёне, горадзе), рэтраспектыўныя галіновыя і тэматычныя, персанальныя (біябібліяграфічныя) даведнікі і слоўнікі, паказальнікі краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў. Сярод **папулярных** краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў ўзрасла ўвага да падрыхтоўкі універсальных даведнікаў тыпу “Край: мінулае і сучаснасць”, “Край праз стагоддзі”, бібліяграфічных энцыклапедый, календароў знамянальных і памятных дат, бібліяграфічных хронік, нарысаў і іншых жанраў.

Праблема якаснага бібліяграфавання матэрыялу залежыць ад інтэлектуальнай і прафесійнай культуры бібліёграфа: маюць значэнне ўмелае бібліяграфічнае мысленне, граматнае прымяненне навукова-эўрыстычнага і логіка-дыялектнага метадаў пошуку інфармацыі. Пры падрыхтоўцы дапаможнікаў важна прытрымлівацца наступных прынцыпаў: гістарызму, навуковасці, мастацкай значнасці, навізны, дыферынцыраванага падыходу да аб’ектыўнай ацэнкі інфармацыі, паўнаце яе адлюстравання ў складанай структуры дапаможніка.

На сучасным этапе бібліятэкі размяшчаюць краязнаўчыя інфармацыйныя рэсурсы на сайтах. Тэкставая інфармацыя разбіваецца відэасюжэтамі, прэзентацыямі, інфаграфікай, цытатамі, фатаграфіямі. Для стварэння інтэрактыўных матэрыялаў выкарыстоўваюцца праграмы для работы з фатаграфіямі (Google, Flickr, Pisaca і інш.), інтэрактыўнымі фота (Thinglink), графікай (Risovach.ru), інфаграфікай (Google Charts), відэа (YouTube, Vimeo).

### Пытанне 2. Асаблівасці працэсаў падрыхтоўчага этапу.

Тэхналогія падрыхтоўкі любых відаў, тыпаў і жанраў краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў абапіраецца на агульную тэхналогію, але

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

існуюць пэўныя метадычныя асаблівасці, абумоўленыя спецыфікай краязнаўства як галіновага комплекса.

На падрыхтоўчым этапе выбіраецца актуальная і грамадска значная для рэгіёна (населенага пункта) тэма. Неабходнымі ўмовамі з'яўляецца яе недастатковая бібліяграфічная забяспечанасць і наяўнасць краязнаўчага дакументнага патоку адпаведнай тэматыкі.

Важным працэсам з'яўляецца вызначэнне геаграфічных межаў края. Асноўная частка бібліяграфічных дапаможнікаў ахоплівае сучасныя адміністрацыйна-тэрытарыльныя межы края, але ў дапаможніках гістарычнай тэматыкі (ці гістарычных раздзелах паказальнікаў) улічваюць і існаваўшы ў мінулым адміністрацыйна-тэрытарыяльны, канфесіянальны, судова-адміністрацыйны падзел, эканамічныя і іншыя сувязі.

Вывучэнне тэмы вядзецца з выкарыстаннем дакументных крыніц. Пры неабходнасці вядуцца кансультацыі са спецыялістамі-краязнаўцамі.

План-праспект адлюстроўвае ўсе параметры будучага дапаможніка. Яго структура адпавядае агульным метадычным патрабаванням і фіксуе ўсе метадычныя асаблівасці.

Крыніцы выяўлення дакументаў падзяляюцца на першасныя і другасныя, асноўныя і дадатковыя. Пачынаецца выяўленне дакументаў з прагляду асноўных бібліяграфічных крыніц. У склад **асноўных** крыніц уключаюцца краязнаўчыя каталогі, картатэкі, базы даных, грунтоўныя краязнаўчыя бібліяграфічныя дапаможнікі. Важнае значэнне надаецца несамастойным бібліяграфічным матэрыялам (прыкніжным, прыартыкульным спісам літаратуры і інш.) Да ліку асноўных крыніц могуць быць аднесены “Новыя кнігі: па старонках беларускага друку”, паказальнікі бягучай і рэтраспектыўнай нацыянальнай бібліяграфіі Беларусі. У склад асноўных крыніц уключаюцца першасныя дакументы, якія патрабуюць уважлівага прагляду. Асаблівасцю методыкі бібліяграфавання краязнаўчай літаратуры з'яўляецца тое, што часта ўзнікае неабходнасць адшукваць раздзелы, параграфы і нявызначаныя тэкставыя фрагменты, прысвечаныя краю, у беларусазнаўчых манаграфіях, зборніках, а таксама весці пошук артыкулаў па мясцовых часопісах і газетах.

Да дадатковых крыніц выяўлення краязнаўчых дакументаў адносяцца рэспубліканскія і замежныя перыядычныя выданні, навукова-дапаможныя галіновыя і тэматычныя бібліяграфічныя дапаможнікі, для якіх характэрны рэгіянальны аспект даследаванняў.

У працэсе выяўлення дакументаў ствараюцца рабочыя картатэкі ўсіх прагледжаных крыніц і рэлевантных дакументаў на аснове прагледжаных другасных і першасных крыніц. У картатэцы рэлевантных дакументаў бібліяграфічныя апісанні павінны адпавядаць стандарту 7.1.-2003

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

“Бібліяграфічны запіс. Бібліяграфічнае апісанне” і справа ўнізе карткі прастаўляецца яе ідэнтыфікацыйны індэкс, які замацоўвае той ці іншы дакумент за пэўным раздзелам дапаможніка паводле структуры, вызначанай у плане-праспекце.

**Пытанне 3. Асаблівасці працэсаў і аперацый аналітычнага этапу**

Вядзецца агульны бібліяграфічны аналіз дакументаў, у ходзе якога высвятляецца значэнне кожнага з іх для будучага дапаможніка. Складаецца ці ўдасканальваецца іх бібліяграфічнае апісанне. Асаблівасцю з'яўляецца шырокае выкарыстанне аналітычных апісанняў і апісанняў па форме “Са зместу:”.

Пры анатаванні дакументаў для краязнаўчых дапаможнікаў выкарыстоўваюцца ўсе віды анатацый і тэхналогія іх падрыхтоўкі абапіраецца на напрацоўкі ў вобласці анатавання ў цэлым. Шырока выкарыстоўваюцца кароткія і пашыраныя даведачныя анатацыі. Кароткія даведачныя анатацыі ствараюцца для ўдакладнення зместа ў тых выпадках, калі назвы дакументаў не адлюстроўваюць іх краязнаўчы змест. Адкрываюцца квадратныя дужкі [], куды ўпісваюць удакладняльныя звесткі, што раскрываюць краязнаўчы змест дакументаў. Такія анатацыі выкарыстоўваюцца і для ўдакладнення аспекту краязнаўчага зместу нават пры наяўнасці назвы краю ў загалоўку. У рэкамендацыйных бібліяграфічных дапаможніках выкарыстоўваюцца рэкамендацыйныя анатацыі.

Анатацыі неабходны:

калі назвы дакументаў не адлюстроўваюць іх краязнаўчы змест (маюць сімвалічны (вобразны), публіцыстычны, прапагандысцкі характар). Такія назвы найбольш распаўсюджаны ў публіцыстыцы, мастацкай літаратуры, сярод матэрыялаў перыядычных выданняў.

Пры неабходнасці ўдакладніць аспект краязнаўчага зместу, адлюстраваны ў дакуменце.

Анатацыі неабходны для больш дасканалага мадэліравання зместу дакументаў, што вельмі важна для ідэнтыфікацыі дакументна фіксаваных краязнаўчых ведаў і іх пошуку. Анатацыі лепш забяспечваюць інтэлектуальны доступ да ведаў, неабходных асобе, калектыву ці супольнасці людзей у параўнанні з дапаможнікамі, абмежаванымі толькі бібліяграфічнымі апісаннямі. Без анатацый немагчымы некаторыя тыпы і жанры бібліяграфічных дапаможнікаў.

Разам з тым існуюць пэўныя асаблівасці падрыхтоўкі анатацый для краязнаўчых дапаможнікаў, абумоўленыя менавіта спецыфікай самога віда – краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў. 1) Неабходна дакладна вызначыць тэрыторыю (населены пункт), аб якім ідзе гаворка ў першасным дакуменце. Пералічаюцца фізіка-геаграфічныя, эканамічныя, гістарычныя,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адміністрацыйна-тэрытарыяльныя аб’екты, населеныя пункты, аб якіх ідзе гаворка ў тэксце. Калі аб’ектаў шмат, то адлюстроўваюць толькі тыя, аб якіх ёсць больш поўныя і значныя звесткі. Калі аб’ектаў шмат, варта зрабіць спасылку: “Матэрыялы аб краі гл. таксама ў “Паказальніку геаграфічных назваў”.

2) Указаць час, да якога адносяцца падзеі, з'явы і факты. Выключэннем з'яўляюцца тыя выпадкі, калі час дакладна адлюстраваны ў назве дакумента.

*Літвін, В. Клецкая бітва* ***[1506 г. паміж ВКЛ і Крымскім ханствам]*** */ В.Літвін // Беларус. мінуўшчына. – 1995. - № 2. – С.17 – 18.*

3) Пералічыць асоб і звесткі аб іх, іх адносіны да края. Выключэннем з'яўляюцца тыя выпадкі, калі імя асобы дакладна адлюстравана ў назве дакумента.

*Бараноўскі, Я.Трагедыя забыцця: жыццё і смерць падпольшчыка [аднаго з арганізатараў і кіраўнікоў Мінскага антыфашысцкага падполля Івана Кірылавіча Кавалёва] / Я.Бараноўскі // Звязда. – 1995. – 6 мая.*

4) Даць канкрэтную характарыстыку ілюстрацыйнага матэрыялу (карт, схем, фотаздымкаў, партрэтаў, малюнкаў). Прыводзяць назвы карт, іх масштаб. Адзначаюць першыя публікацыі фатаграфій асоб або аб’ектаў, важных для краязнаўчага вывучэння.

5) Цытаванне, перадрукоўка невялікіх тэкстаў з рэдкіх і цяжкадаступных дакументных крыніц.

Гэтыя элементы з'яўляюцца найбольш важнымі для бібліёграфаў. Яны павінны прысутнічаць у анатацыях розных відаў.

**Пытанне 4. Асаблівасці працэсаў і аперацый сінтэтычнага этапу.**

Важнейшымі працэсамі з'яўляюцца: канчатковы адбор дакументаў, групоўка бібліяграфічных запісаў і падрыхтоўка дапаможных паказальнікаў.

Пры складанні краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў выкарыстоўваюць **фармальны, зместавы і якасны адбор**. Вызначэнне крытэрыяў адбору дакументаў абумоўлена функцыянальнымі асаблівасцямі будучага дапаможніка. Фармальны адбор ажыццяўляецца па знешніх прыметах (храналагічнай, відавой, па месцы выдання і інш.). Крытэрыі фармальнага адбору звычайна спадарожнічаюць яго іншым відам. З’яўляецца асноўным для паказальнікаў мясцовага друку і паказальнікаў краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў.

Зместавы адбор дазваляе ўключыць дакументы адпавядаючыя тэме дапаможніка. Шырока прымяняецца ў навукова-дапаможных краязнаўчых паказальніках. Якасны адбор выкарыстоўваецца ў папулярных краязнаўчых бібліяграфічных дапаможніках.

Асаблівасцю з'яўляецца ўлік зместавай сувязі дакумента з рэгіёнам. Звяртаецца ўвага на важнасць тэмы дакумента, наяўнасць у ім значных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

статыстычных і іншых фактычных звестак. Пры неабходнасці ацаніць навізну звестак у якасці крытэрыяў адбору могуць выкарыстоўвацца: час публікацыі і адпаведна атрыманых вынікаў; наяўнасць навізны тэмы даследавання; навізна выкарыстаных аўтарам крыніц і метадаў; адрозненне прадстаўленых вывадаў ад ужо вядомых; адлюстраванне новых сувязяў паміж вядомымі фактамі і інш. Для адлюстравання даставерных дакументаў улічваюць навуковую рэпутацыю аўтара, наяўнасць і характар ссылак на разглядаемыя дакументы, параўнальныя перавагі і недахопы выкарыстоўваемых метадаў. Вялікую каштоўнасць прадстаўляюць гістарычныя першакрыніцы: тэксты нарматыўна-прававых актаў, мемуары.

Складальнікам краязнаўчых дапаможнікаў неабходна здзяйсняць адбор шматлікіх газетных публікацый. Акрамя агульных падыходаў да адбору, неабходна ўлічваць значнасць тэмы артыкула, наяўнасць цікавых фактаў, адлюстраванне мясцовых асаблівасцей і інш. Не ўключаюцца матэрыялы, якія змяшчаюць агульнавядомыя звесткі, бягучыя інфармацыйныя паведамленні, кароткія замалёўкі і рэпартажы. Адрозніваецца падыход да адбору новых газетных публікацый і рэтраспектыўнага адбору. Новыя публікацыі ўлічваюцца з большай паўнатой, тады як матэрыялы мінулых гадоў ацэньваюцца з пункту гледжання паўнаты, даставернасці, значнасці.

Для **групоўкі** бібліяграфічных запісаў прымяняюць тры асноўных спосабы: **фармальны і змястоўны і рэкамендацыйны**. На іх выбар уплываюць від, тып, жанр будучага бібліяграфічнага дапаможніка.

**Фармальныя**: алфавітная, храналагічная/адваротна-храналагічная, тапаграфічная і інш.

**Змястоўныя:** сістэматычная (на аснове “Табліцы класіфікацыі дакументаў для краязнаўчых каталогаў (картатэк) бібліятэк Рэспублікі Беларусь), тэматычная.

**Рэкамендацыйныя:** ад простага да складанага, ад агульнага да прыватнага і ад прыватнага да агульнага.

Нярэдка на практыцы выкарыстоўваюцца фармальны і змястоўны спосабы ў адным бібліяграфічным дапаможніку. Так, у краязнаўчых календарах і хроніках даты размяшчаюцца ў храналагічнай паслядоўнасці, а бібліяграфічныя апісанні ў спісках да падзей могуць размяшчацца ў лагічным парадку, ад агульнага да прыватнага. У многіх універсальных і галіновых паказальніках выкарыстоўваецца з пэўнай дапрацоўкай “Тыпавая схема класіфікацыі дакументаў для краязнаўчых каталогаў (картатэк) бібліятэк Рэспублікі Беларусь”.

У адпаведнасці з тыпам і жанрам краязнаўчыя дапаможнікі могуць мець простую ці складаную структуру.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тыпалагічная разнастайнасць краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў абумоўлівае шырокі склад дапаможных паказальнікаў, якія дазваляюць аптымізаваць бібліяграфічны пошук па іх.

Як правіла, калі асноўная групоўка зместавая, то рыхтуюць дапаможныя паказальнікі, якія раскрываюць адлюстраваны масіў БЗ па фармальных прыметах. Калі асноўная групоўка БЗ у паказальніку фармальная, то стварающца дапаможныя паказальнікі, якія раскрываюць змест. Гэта агульнае правіла, але ў канкрэтных дапаможніках могуць быць розныя спалучэнні дапаможных паказальнікаў. У краязнаўчых дапаможніках, дзе вельмі часта выкарыстоўваюць менавіта зместавыя групоўкі, дадатковае выкарыстанне дапаможных паказальнікаў, пабудаваных таксама на гэтай прымеце, дазваляе больш глыбока адлюстраваць краязнаўчы змест дакументаў.

Да краязнаўчых дапаможнікаў складаюцца імянныя, персанальныя, геаграфічныя, тэматычныя, прадметныя, аўтараў і назваў дакументаў і іншыя дапаможныя паказальнікі. Яны будуюцца найчасцей на аснове такіх інфармацыйных аб’ектаў, як уласныя імёны, тапанімічныя назвы, назвы геаграфічных аб’ектаў, калектываў і арганізацый. Таксама выкарыстоўваюцца найменні прадметаў і іншыя (публікацыі ці першыя радкі вершаў, цытаты, табліцы, ілюстрацыі, абрэвеатуры, сіглы).

Дапаможныя паказальнікі могуць змяшчаць рубрыкі трох відаў: **простыя** (“глухія”), якія складаюцца з найменняў прадметаў, уласных імён і спасылак да бібліяграфічных запісаў. **Складаныя** (разгорнутыя ці аналітычныя), якія складаюцца з загалоўкаў і падзагалоўкаў. **Анатаваныя**, якія змяшчаюць акрамя рубрык у вузкім значэнні, дадатковыя звесткі ў выглядзе своеасаблівых анатацый, вытрымак з тэксту.

Групоўка матэрыялу ў дапаможных паказальніках можа быць алфавітнай, сістэматычнай (іерархічнай), тэматычнай, храналагічнай, нумарацыйнай і інш.

Найбольш адметным з'яўляюцца **геаграфічны** і **персанальны** дапаможныя паказальнікі.

У геаграфічным адлюстроўваюцца назвы разнастайных аб’ектаў, пераважна зямной прасторы. Асновай пабудовы геаграфічных дапаможных паказальнікаў з'яўляюцца геаграфічныя рубрыкі – найменні адміністрацыйна-тэрытарыяльных, дзяржаўных, фізіка-геаграфічных, геалагічных (рудаўпраўленне), эканамічных аб’ектаў (“Дражня”, СЭЗ “Брэст”); аб’ектаў, звязаных з рознымі відамі транспарта: чыгункай, воднымі шляхамі, аўтамагістралямі і інш. Уключаюцца найменні гісторыка-геаграфічных аб’ектаў (Юравіцкая стаянка), ваенна-геаграфічныя аб’екты (тэатры ваенных дзеянняў, месцы асобных баёў); уключаюцца назвы навуковых станцый,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абсерваторый, запаведнікаў, метэастанцый і інш.); часовыя пасяленні рознага прызначэння (палявы лагер вытворчай практыкі, геалагічнай экспедыцыі).

Пры ўключэнні назваў геаграфічных аб’ектаў трэба ўлічваць асаблівасці функцыянавання тэрмінаў. Нельга пераўтвараць пастаянна прымяняемыя тэрміны, якія сталі звыклымі, шырока вядомымі ў навуцы і ў грамадскай практыцы, у тэрміны нязвыклыя, напрыклад, Рудабельская Рэспубліка не варта змяняць на Рудабель, калі ў дакуменце асвятляюцца падзеі ўстанаўлення савецкай улады. Неабходнасць дакладнай ідэнтыфікацыі і лакалізацыі населеных пунктаў у некаторых выпадках патрабуе ўдакладненняў гістарычных назваў, адміністрацыйна-тэрытарыяльнай прыналежнасці аб’ектаў. Бібліёграфу-складальніку мэтазгодна кіравацца наступнымі рэкамендацыямі ў складаных сітуацыях.

- Выкарыстанне **сучасных назваў** у якасці рубрык**.** Пры гэтым галоўная рубрыка павінна дапаўняцца ўсімі варыянтамі гістарычных назваў. Гістарычныя назвы таксама павінны адлюстроўвацца ў рубрыках-адсылках.
- Прымяненне **гістарычных назваў** у якасці самастойных рубрык мэтазгодна у тых выпадках, калі немагчыма ідэнтыфікаваць населеныя пункты, якія сустракаюцца ў гістарычных дакументах, у гістарычнай літаратуры з сучасна існуючымі.
- Абавязкова указваецца **тып** населенага пункта: горад, фальварак і інш. Дазваляе пазбегнуць хібаў аманіміі (Свіслач, рака; Свіслач, гарадскі пасёлак.)
- Указваецца **адміністрацыйна-тэрытарыяльная функцыя** аб’екта: цэнтр ваяводства, павета, раёна, сельсавета.
- Указваецца **адміністрацыйна-тэрытарыяльная прыналежнасць** да пэўнай дзяржаўнай тэрытарыяльнай адзінкі (да ваяводства, павета, губерні, акругі, раёна, вобласці).
- Даюцца **адсылкі** пры наяўнасці сінанімічных назваў (Прапойск гл. Слаўгарад)

У геаграфічным паказальніку мэтазгодна змяшчаць храналагічныя і тэматычныя падрубрыкі і падрубрыкі, якія характарызуюць мэтавае і чытацкае прызначэнне, форму дакумента.

У **персанальны** дапаможны паказальнік уключаюцца звесткі аб усіх асобах, узгаданых у назвах дакументаў і анатацыях і яшчэ лепш у тэкстах дакументаў. Інфарматыўнасць іх рубрык павялічваецца за лік указання поўных імён, дат жыцця, прафесіі, віда дзейнасці, рода заняткаў, тытула і інш.

Падрыхтоўка бібліяграфічнага дапаможніка ў электронным рэжыме дазваляе павысіць яго інфарматыўнасць з дапамогай сістэмы слоўнікаў: “Імяннога”, “Персаналій”, “Назваў твораў”, “Тэматычнага”, “Ключавых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

слоў", "Геаграфічнага", комплекснага "Прадметна-геаграфічнага", "Назваў канферэнцый", "Храналагічнага", "Крыніц публікацый".

**Пытанне 5. Асаблівасці працэсаў і аперацый заключнага этапу.**

На заключным этапе рыхтуецца даведачна-метадычны апарат краязнаўчага бібліяграфічнага дапаможніка. У яго склад уваходзяць прадмова, уводны артыкул, змест, дапаможныя паказальнікі, разнастайныя дадаткі. Склад элементаў метадычнага апарату залежыць ад тыпу і жанру бібліяграфічнага дапаможніка.

Да буйных універсальных папулярных і навукова-дапаможных краязнаўчых дапаможнікаў мэтазгодна ў складзе прадмовы або ў асобных уводных артыкулах прадставіць абагульняючую ўсебаковую характарыстыку рэгіёна. Ва ўводзінах, напісаных навуковымі рэдактарамі ці кансультантамі, асвятляюць асаблівасці дакументнага патоку (масіву), ацэньваюць важнейшыя выданні і ўклад буйнейшых аўтараў.

У складзе дадаткаў важнае значэнне мае спіс выкарыстаных крыніц і картаграфічныя матэрыялы. У большасці дапаможнікаў мэтазгодна размяшчаць карту сучаснага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу ці іншыя сучасныя карты. У паказальнікі з гістарычным аспектам карысна ўключыць гістарычныя карты рэгіёна. Зараз выкарыстоўваецца методыка пазначэння на картах важнейшых аб'ектаў, якія ўзгадваюцца ў бібліяграфуемых дакументах (напрыклад, мясцін лакалізацыі помнікаў, калі дапаможнік прысвечаны помнікам, культуры края).

Падрыхтаваны краязнаўчы бібліяграфічны дапаможнік праходзіць рэдагаванне, афармленне і падрыхтоўку да друку. Навуковае, літаратурнае і бібліяграфічнае рэдагаванне выконваюць навуковыя рэдактары – краязнаўцы-даследчыкі, спецыялісты і бібліёграфы.

Навуковы рэдактар можа працаваць на працягу ўсяго перыяду падрыхтоўкі дапаможніка, або на заключным этапе. Ён высвятляе адпаведнасць плана-праспекта тэксту дапаможніка, аналізуе актуальнасць тэмы, паўнату кола крыніц выяўлення дакументаў, прынцыпы адбору дакументаў, групоўкі запісаў, методыкі анатавання, склад даведачна-метадычнага апарату. Навуковы рэдактар сочыць за дакладнасцю выкарыстання спецыяльных паняццяў, дат.

У працэсе літаратурнага рэдагавання тэкст бібліяграфічнага дапаможніка неаднаразова старанна вычытваецца, выпраўляюцца моўныя і стылістычныя хібы.

Бібліяграфічнае рэдагаванне забяспечвае аднастайнасць афармлення бібліяграфічных запісаў, адпаведнасць сучасным стандартам і правілам, паслядоўнасць іх размяшчэння і правільнасць нумарацыі, дакладнасць ссылак ад дапаможных паказальнікаў да асноўнага бібліяграфічнага тэкста.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Вывады:**

1. Краязнаўчыя бібліяграфічныя дапаможнікі характарызуюцца разнастайнасцю тыпаў і жанраў. На сучасным этапе жанравая структура дапаможнікаў развіваецца пад уплывам жанрава-стылістычнага вопыту з іншых абласцей літаратурнай і навуковай дзейнасці і больш глыбокай аналітыка-сінтэтычнай апрацоўкай бібліяграфуемых дакументаў.

2. На кожным тэхналагічным этапе падрыхтоўкі краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў неабходна рэалізаваць метадычныя асаблівасці бібліяграфавання краязнаўчых дакументаў.

## Лекцыя 10. **КРАЯЗНАЎЧЫЯ БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ І ФАКТАГРАФІЧНЫЯ ВЫДАННІ**

Мэта – вывучэнне студэнтамі метадычных асаблівасцей найбольш распаўсюджаных краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў.

**Пытанні:**

1. **Агульныя метадычныя асаблівасці падрыхтоўкі папулярных краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў.**
2. **Метадычныя асаблівасці падрыхтоўкі асобных тыпаў і жанраў навукова-дапаможных краязнаўчых дапаможнікаў.**

### Пытанне 1. Методыка падрыхтоўкі папулярных краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў

**Мэтавае** прызначэнне папулярных дапаможнікаў скіравана на пашырэнне і паглыбленне ведаў аб краі шляхам дасугавага чытання, чытання як элемента самаадукацыі і адукацыі. Большасць сучасных папулярных краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў адрасуецца шырокім колам карыстальнікаў, аматарам краязнаўзнаўства. Пералічэнне ў прадмовах асобных груп, напрыклад, бібліятэкараў, краязнаўцаў, студэнтаў, не з'яўляецца прынцыповым. Складальнікі сучасных папулярных бібліяграфічных дапаможнікаў адаптавалі многія характарыстыкі навукова-папулярнай літаратуры, метады майстэрства папулязацыі ведаў, што дазволіла зрабіць рэкамендацыйна-бібліяграфічныя тэксты шырока даступнымі. Важнейшай асаблівасцю дапаможнікаў стала паглыбленне ўзроўня аналітыка-сінтэтычнага прадстаўлення дакументаваных ведаў. Складальнікі імкнуцца забяспечыць карыстальніку магчымасць свабодна абарачацца ў літаратурнай прасторы і фактаграфічным матэрыяле. Гэта прывяло да значнага павялічэння ўвагі да раскрыцця **зместу** дакументаў і выкарыстання **фактаграфічных** звестак для характарыстыкі кола адлюстраваных пытанняў. Узніклі жанры, у якіх фактаграфічныя даныя выконваюць не меншую ролю, чым бібліяграфічныя, напрыклад,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліяграфічныя даведнікі, хронікі, каляндары знамянальных і памятных дат і інш. Важнае значэнне набыў наступны метадычны падыход: не толькі рэкамендаваць літаратуру, але і знаёміць са зместам выданняў без непасрэднага звароту чытача да літаратуры. Фактаграфічныя звесткі часта афармляюцца ў выглядзе ўводных тэкстаў (даведак) да раздзелаў, уводных артыкулаў, хронік і іншых структурных элементаў дапаможнікаў. Фактаграфічныя фрагменты тэкстаў пішуцца папулярным стылем, што забяспечвае іх даступнасць, рыхтуе чытача да ўспрыймання бібліяграфічнага матэрыялу. Сапраўды, гэтыя тэксты апасрэдуюць функцыю бібліёграфа-дарадчыка, акрэсліваючы змест у цэлым і важнейшыя пытанні. Фактаграфічны матэрыял ў папулярных дапаможніках прадстаўляе сабой:

1) даныя (імёны, даты, апісанні падзей і інш.), якія могуць быць узяты з бібліяграфуемых дакументаў ці з іншых крыніц;

2) тэксты бібліяграфуемых дакументаў: фрагменты мастацкіх твораў, гістарычных дакументаў (невялікія могуць быць прыведзены цалкам), цытаты, выказванні крытыкаў, вядомых людзей, нарысы па гісторыі стварэння твораў, аб прататыпах герояў. Пры адсутнасці нарысаў гісторыка-літаратурнага характару аб творах мясцовых аўтараў, яны могуць быць падрыхтаваны бібліёграфам-складальнікам.

Важнай метадычнай задачай, вырашаемай бібліёграфам-складальнікам, з'яўляецца стымуляванне чытання з дапамогай розных пазнавальных і інструкцыйна-метадычных звестак. З дапамогай пазнавальных звестак чытач атрымлівае веды аб тэме чытання, аб змесце бібліяграфуемай літаратуры. Пры бібліяграфаванні навукова-папулярнай літаратуры мэтазгодна звяртаць увагу на асаблівасці зместу дакументаў: навуковыя факты, навуковыя і светапоглядныя падыходы, канцэпцыі, тэорыі, дадзеныя аб прыкладным значэнні матэрыялу. Пры бібліяграфаванні твораў мастацкай літаратуры важна адлюстраваць сюжэт, час і месца падзей, прататыпаў персанажаў, гістарычныя ўмовы перыяду, якія паўплывалі як на падзеі, так і на светапогляд аўтара.

З дапамогай інструкцыйна-метадычных звестак бібліёграф садзейнічае арганізацыі чытання. Да іх адносяцца метадычныя рэкамендацыі, парады ў прадмовах і ўводных артыкулах, спасылкі на іншыя бібліяграфічныя дапаможнікі. Да іх адносяцца дапаможныя паказальнікі, а таксама ілюстрацыі і розныя шрыфты.

Да сродкаў, якія стымулююць чытанне, адносяцца аргументуючыя сродкі, праблемныя сродкі і эмацыянальна-стымулюючыя сродкі.

Аргументуючыя сродкі накіраваны на перакананне чытача ў важнасці кірунка, тэматыкі чытання, твора, паказваюць іх актуальнасць, навізну, навуковыя, мастацкія і іншыя якасці. Да выкарыстоўваемых бібліёграфам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аргументаў адносяцца: факт-прыклад, які дапамагае чытачу спасцігнуць значэнне тэмы, кнігі; экскурс ў гісторыю пытання ці адлюстраванне яго сучаснага стану: уключэнне дадатковага матэрыялу аб аўтары; спасылкі на выказванні і меркаванні вучоных, пісьменнікаў, грамадскіх дзеячаў.

Праблемныя сродкі стымулявання чытання прызначаны для стварэння ў чытача асаблівага псіхалагічнага стану, які падштурхоўвае да актыўнага звяртання да тэмы, да чытання, абуджае пазнавальныя інтарэсы. Для такога ўздзеяння выкарыстоўваюцца: факт-праблема, якая выклікае ў чытача супярэчанне паміж наяўнымі прадстаўленнямі і новымі звесткамі, ведамі, якія яму прапануюцца; праблемнае пытанне, сфармуляванае бібліёграфам як супярэчанне; супрацьпастаўленне поглядаў вучоных, пісьменнікаў, гісторыкаў, грамадскіх дзеячаў на праблемы, падзеі, ролю асобных персон края.

Эмацыянальна-стымулюючыя сродкі надаюць краязнаўчаму бібліяграфічнаму дапаможніку выразнасць, ствараючы станоўчы эмацыянальны настрой на чытанне рэкамендуемай літаратуры. Да іх адносяцца: цікавыя малавядомыя фактаграфічныя звесткі, эпітэты, рытарычныя пытанні, воскліцаеія, звароты да чытача, выкарыстанне такога спосабу, як раскрыццё ключавога эпізоду, цэнтральнага персанажа твора, гістарычных, псіхалагічных, мастацкіх і іншых асаблівасцей твора.

Складальніку сучасных папулярных краязнаўчых бібліяграфічных жанраў уласціва схільнасць да літаратурнай працы, уменне праз друкаванае слова звяртацца да канкрэтнага чытача так, каб ён адчуў свой удзел у “дыялогу” з бібліёграфам.

**Пытанне 2. Метадычныя асаблівасці падрыхтоўкі асобных тыпаў і жанраў навукова-дапаможных краязнаўчых дапаможнікаў.**

- **Агульныя метадычныя асаблівасці ПКБД:**
- 1) Сінтэзаванне разнастайных фактаграфічных, дакументальных і бібліяграфічных матэрыялаў.
- 2) Тэкст ПКБД ствараецца праз шырокае выкарыстанне дакументаў розных відаў, якія цытуюцца, пераказваюцца, прыводзяцца цікавыя і важныя звесткі з іх.
- 3)Гэта спалучэнне дазваляе ствараць арыгінальныя папулярныя бібліяграфічныя тэксты, якія не патрабуюць абавязковага звяртання карыстальніка да рэкамендаванай літаратуры.

**Календары знамянальных і памятных дат.** Асноўная задача гэтых дапаможнікаў давесці фактаграфічныя і бібліяграфічныя звесткі аб значных рэгіянальных падзеях, юбілеі якія святкуюцца ў бягучым годзе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пры падрыхтоўцы гэтых дапаможнікаў асноўнымі праблемамі з'яўляюцца:

1) крытэрыі адбора знамянальных і памятных дат;

2) аб’ём і каштоўнасць рэкамендуемай літаратуры.

3) своечасовасць і рэгулярнасць выпуску календароў.

Падрыхтоўка дапаможнікаў пачынаецца з вызначэння дат, юбілеі якіх наступаюць у будучым годзе. Фармальна гэта даты кратныя 5, але абавязкова ўлічваецца іх грамадская значнасць. Бібліёграфы вядуць пошук такіх дат, абапіраючыся на асноўныя тыповыя катэгорыі: “падзея”, “персона”, “факт”, “месца”, “аб’ект”. Асноўнымі крыніцамі выяўлення такіх дат з'яўляюцца:

- картатэкі/БД мясцовых знамянальных і памятных дат, картатэкі/БД хронікі;
- даведачныя выданні, (рэгіянальныя і нацыянальныя энцыклапедыі, даведнікі і інш.;
- афіцыйныя дакументы (рэгіянальных і цэнтральных органаў улады і кіравання);
- гістарычная літаратура аб краіне і рэгіёне;
- экспазіцыі мясцовых музеяў;
- інфармацыя ад краязнаўцаў.

На адбор дат уплываюць такія фактары, як іх грамадская значнасць, актуальнасць, адпаведнасць сучасным грамадскім каштоўнасцям. Пасля выяўлення дат пачынаецца працэс іх удакладнення і вывучэння. Для ўдакладнення дат выкарыстоўваецца шырокае кола крыніц, напрыклад, пастанаўленні і рашэнні мясцовых, а часам і цэнтральных органаў улады аб іх святкаванні. Бібліёграфы выкарыстоўваць апублікаваныя дакументы і матэрыялы архіваў і музеяў. Падчас удакладнення дат мінулага важна звярнуць увагу на адпаведнасць сучаснаму каляндару. Трэба вырашыць пытанні з дакладнасцю дат, месцам падзей, удзельнікамі, калі існуюць спрэчныя погляды. Да ўключэння беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі выкарыстоўваўся грэгарыянскі стыль, а пасля інкарпарацыі – юліанскі. Таму бібліёграф павінен ведаць пра неабходнасць удакладнення дат па асобных беларускіх тэрыторыях, якія сустракаюцца ў крыніцах за перыяд з 1772, 1793, 1795 да 14 лютага 1918 г. паводле грэгарыянскага стыля. Існуюць правілы пераводу дат са старога на новы стыль [3].

Асноўнымі крыніцамі выяўлення літаратуры да дат з'яўляюцца:

- краязнаўчыя каталогі і картатэкі, бібліяграфічныя БД;
- бягучыя і рэтраспектыўныя універсальныя краязнаўчыя бібліяграфічныя дапаможнікі;
- персанальныя бібліяграфічныя дапаможнікі і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У структуру календара ўваходзяць прадмова, спіс дат, асноўная частку, дапаможныя паказальнікі. У прадмове даеццa яго характарыстыка і рэкамендацыі па выкарыстанню. Затым можа быць спіс дат года са спасылкам на старонкі, дзе яны характарызуюцца больш падрабязна. Калі дата не зусім дакладная, напрыклад, невядомы дзень ці месяц, то такія даты ў спісе і ў асноўнай частцы паказваюцца ў канцы. Асноўная частка змяшчае тэкставыя даведкі па датах, а таксама фактаграфічныя, статыстычныя, бібліяграфічныя і іншыя матэрыялы. Тэкставыя характарыстыкі дат размяшчаюцца ў храналагічнай паслядоўнасці дат: дата, месяц, год. Пасля даты даецца канкрэтная і інфарматыўная яе назва. Важным працэсам з'яўляецца падрыхтоўка тэкставай даведкі. Яна павінна адпавядаць патрабаванням навуковасці, даставернасці, дакладнасці, таму пішуць яе на аснове выяўлення і вывучэння першакрыніц, новай навуковай літаратуры, крытычных матэрыялаў, уключаючы даныя з энцыклапедый, замежнамоўных крыніц і інш. Для напісання тэкставых даведак могуць быць запрошаны краязнаўцы, супрацоўнікі музеяў, журналісты, выкладчыкі ці іншыя асобы. Прычым неабходна прытрымлівацца правіла, чым менш маецца апублікаваных матэрыялаў, тым больш увагі трэба надаваць тэкставай даведцы, паўнаце яе зместу.

Пасля кожнай тэкставай даведкі даецца спіс літаратуры – 5 – 10 назваў найбольш значных і новых публікацый, а таксама архіўных дакументаў, матэрыялаў з музейных калекцый, АВ-дакументаў, ілюстрацый, статыстычных даных.

Могуць складацца імянны (персаналій) і геаграфічны дапаможныя паказальнікі.

Пры аўтаматызаванай тэхналогіі каляндар ствараецца на аснове фактаграфічнай БД памятных дат. Пры наяўнасці неабходнай інфармацыі ў рэжыме ўводу даных запаўняюцца палі “год”, “месяц”, “дзень” падзеі, даецца яе апісанне. Тэкставыя даведкі і бібліяграфічныя спіскі таксама рыхтуюцца аўтаматызавана на аснове электроннага каталога і БД памятных дат, пасля чаго рэдагуюцца. Аўтаматызаваны рэжым дазваляе ствараць календары, прысвечаныя мясцовасці, тэме і канкрэтнай асобе. Пачалося стварэнне “Календароў знамянальных і памятных дат” як паўнатэкставых БД, якія выстаўляюцца ў інтэрнет.

**Бібліяграфічная хроніка.** Віды хронік: агульная, калі адлюстроўваюцца падзеі за ўвесь гістарычны перыяд існавання края (населенага пункта), за пэўны гістарычны перыяд, хроніка ўстановы, персанальная хроніка, хроніка падзеі. Выбіраюцца падзеі і факты, важныя для вывучэння данага рэгёна ці населенага пункта (юбілейнасць дат не мае значэння у адрозненне ад жанра каляндара). Аб'ектам адлюстравання могуць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

быць факты і падзеі любога паходжання, у тым ліку тыя, якія не святкуюцца, але памяць аб іх важная для мясцовай гісторыі (даты вялікіх пажараў і інш.)

Рубрыкі (даты) ў хроніцы групуюцца ў прамой паслядоўнасці. Для загалоўкаў выкарыстоўваецца дата і найменне падзеі ці факта. Пажадана ўказваць поўную дату, часам да некаторых падзей вядомы нават гадзіны. Пасля загалоўка змяшчаецца фактаграфічная даведка, або выкарыстоўваецца тэкст – фрагмент з дакументаў. Калі даведка ствараецца бібліёграфам, важна ўключыць цытаты з твораў асоб, якія аставілі прыметны след у гісторыі края, вытрымкі з афіцыйных дакументаў, справаздач, мемуараў, літаратурна-мастацкіх твораў гістарычнай тэматыкі, якія “ажыўляюць” дату, ствараюць вобраз падзеі, што аказвае эмацыянальны ўплыў на чытача. Магчыма падабраць фрагмент тэкста ці з некалькіх тэкстаў, звязаўшы іх паміж сабою. Гэта могуць быць вытрымкі з рэдкіх крыніц, напрыклад, кніг XIX ст., даступныя шырокаму колу чытачоў. Асобае значэнне мае цытаванне ўспамінаў, якія перадаюць непаўторнае ўспрыйманне падзеі. У канцы даведкі прыводзіцца спіс літаратуры. Пры недахопе крыніц па вузкіх пытаннях, можна змяшчаць спісы літаратуры ў канцы асобных гістарычных адрэзкаў.

Матэрыялы асноўнай часткі ў бібліяграфічнай хроніцы групуюцца ў храналагічнай паслядоўнасці падзей.

**Папулярная бібліяграфічная энцыклапедыя** прадстаўляе сабой як мага паўнейшае кола звестак аб рэгіёне (прадмеце ці чалавеку), апрацаваных на папулярным узроўні. Асаблівасці краязнаўчай бібліяграфічнай энцыклапедыі: 1) магчыма шырокі ахоп жыцця края, яго гісторыі; гісторыка-культурных і гісторыка-літаратурных сюжэтаў і праблем, 2) панарамнае прадстаўленне самых разнастайных фактаграфічных, дакументальных і бібліяграфічных матэрыялаў. Бібліяграфічная інфармацыя спалучаецца з фактаграфічнай і фактаграфічныя матэрыялы размяшчаюцца ў пачатку раздзелаў і глаў. 3) Тэкст энцыклапедыі ствараецца праз шырокае выкарыстанне важнейшых дакументаў розных відаў, якія цытуюцца, пераказваюцца. Бібліёграф стварае магчымасць карыстальніку пашырыць свае веды з дапамогай энцыклапедыі без звяртання да рэкамендаванай літаратуры, але на яе аснове. Чытач сам павінен выйсці на неабходныя яму кнігі. Спісы літаратуры ў канцы раздзелаў (структурных падраздзяленняў) не анатуюцца, так як па ходу тэкстаў раздзелаў ідуць спасылкі па літаратуру.

Бібліяграфічная энцыклапедыя можа мець тэматычную структуру: выдзяляюцца раздзелы па пэўнай тэматыцы, якія групуюцца ў лагічнай паслядоўнасці. Групоўна матэрыялу можа быць і ў алфавітнай паслядоўнасці вызначаных для адлюстравання фактаў.

Асноўнымі элементамі даведачна-пошукавага апарату з'яўляюцца прадмова, уводзіны, дапаможныя паказальнікі (геаграфічны, персаналій і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інш.) У афармленні друкаваных і электронных энцыклапедый шырока выкарыстоўваюцца карты, фатаграфіі, рэпрадукцыі карцін.

**Бібліяграфічная анталогія** прысвячаецца паэтычным творам аб краі, або паэзіі аўтараў пэўнага рэгіёна (населенага пункта), таму адрасуецца найперш аматарам гэтага жанра мастацкай літаратуры. У анталогіі змяшчаюць вершы, фрагменты твораў, біяграфіі паэтаў, выказванні крытыкаў. Прынята адлюстроўваць вялікі перыяд часу. Па структуры бібліяграфичная анталогия складаецца з п**радмовы, уводзінаў, асноўнага тэксту** (у аснове якога могуць быць персаналіі ці назвы геаграфічных аб’ектаў края, ці падзеі), д**апаможных паказальнікаў** (геаграфічнага, персаналій і інш.) Склад даведачна-пошукавага апарату і афармленне краязнаўчых бібліяграфічных анталогій падобныя да энцыклапедый.

**Бібліяграфічны нарыс** прысвячаецца важнай гістарычнай з’яве, падзеі, лёсу канкрэтнага чалавека. Нарыс дапамагае поўна і ўсебакова пазнаёміцца з пэўнымі падзеямі мясцовага жыцця і самастойна асэнсаваць іх. Нарыс прадстаўляе сабой сукупнасць рэфератыўна выкладзеных розных матэрыялаў: крытычных артыкулаў, рэцэнзій, успамінаў, навуковых, навукова-папулярных прац, літаратурна-мастацкіх твораў. Уключаюцца творы аўтараў, што стаяць на розных ідэйных пазіцыях, ці маюць розныя эстэтычныя, палітычныя ці іншыя погляды. Колькасць крыніц залежыць ад тэмы нарыса, але для яго стварэння трэба адабраць найбольш істотныя, пажадана 7-10 кніг, артыкулаў. Кожная крыніца вывучаецца, вызначаюцца з яе цытаты, факты, думкі, фрагменты. Потым робіцца сінтэз – аб’яднанне фактаў, дакументаў у адзіны ланцуг пераказу.

У нарысе галоўнае паказаць шлях чытання, даць штуршок да разважання, развіцця думкі, погляду. На этапе вывучэння тэмы важна, каб у складальніка сфарміраваліся свае погляды на падзею. Але складальнік нарыса не падводзіць вынікі дыскусій аб той ці іншай падзеі, аб разглядаемай тэме, не прапануе бясспрэчную ісціну. Кожны чытач можа пагадзіцца ці не пагадзіцца з выказанай думкай. Асноўная задача нарыса абудзіць у чытача імкненне разабрацца ў матэрыяле, дапамагчы яму знайсці найбольш правільны, аб’ектыўны адказ на хвалюючыя пытанні. Таму асноўнае месца займае фактаграфічны тэкст, а спіс літаратуры – дапаўняльнае. Ён змяшчаецца ў канцы нарыса. Чытач можа звярнуцца да яго тады, калі яму недастаткова звестак па тэксту.

Па **структуры** нарыс можа складацца з наступных частак:

1) Прадмова, якая з'яўляецца фонам для далейшай размовы. Каротка раскрываецца тэма нарыс, якая павінна быць цікавай і значнай, характарызуецца рэкамендуемая літаратура. Нарыс можа пачынацца роздумам аўтара – складальніка ці цытатай з кнігі, успамінамі, гістарычнымі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

звесткамі. Неабходна, каб атрымалася супадзенне інтарэсаў асобнага чалавека, чытача і грамадства.

2) Асноўная частка – агляд крытычных артыкулаў, іншай літаратурных матэрыялаў, пабудаваных у пэўнай паслядоўнасці. Тэкст нарыса можа перамяжацца звесткамі аб крыніцах (спасылкі на кнігі), але абавязкова роздумы аўтара нарыса па тэме, пастаноўка пытанняў, праблем, паказ пазіцый розных аўтараў на праблему, адказы на пытанні праз кнігі, з указаннем канкрэтных старонак, цытаваннем пэўных матэрыялаў. Калі нарыс прысвячаецца асобе, то неабходна пазнаёміцца з біяграфічнай, крытычнай, мемуарнай літаратурай, творамі асобы (калі чалавек пісаў). Апісваюцца ўмовы, абставіны жыцця грамадства, асобнага чалавека, якія маюць дачыненне да асноўнага факта, падзеі і заканчваюцца роздумам аўтара аб іх.

Бібліяграфічнае апісанне кніг у тэксце нарыса не прыводзіцца, даюцца толькі спасылкі на аўтара, назвы кніг.

3) Спіс літаратуры, на аснове якога рыхтуецца бібліяграфічны нарыс. Ён можа мець назву “Кнігі нарыса” ці інш. Пералік кніг без анатацый падаецца ў алфавітным парадку ці адпаведна ўпамінанню іх у тэксце.

**Універсальныя і комплексныя паказальнікі тыпу “Што чытаць аб краі”.** На сучасным этапе гэтыя паказальнікі атрымліваюць назвы тыпу “Край: мінулае і сучаснасць”. Змена назвы не выпадковая, выклікана яна пэўнымі метадычнымі асаблівасцямі ў іх падрыхтоўцы. Па-першае, павялічылася роля фактаграфічнай інфармацыі, тэкставых даведак, тэкставых уставак, цытавання. Па-другое, пашырыліся крытэрыі адбору літаратуры. Калі ў паказальніках “Што чытаць аб краі” рэкамендавалі папулярную новую літаратуру (да 10 год), то зараз уключаюць каштоўную літаратуру мінулага, калі яна мае крыніцазнаўчае значэнне, нават на замежных мовах; апісваюць матэрыялы з архіваў. Аднак менавіта ў гэтых дапаможніках захавалася перавага бібліяграфічнай інфармацыі. Абавязковым патрабаваннем з'яўляецца і ўключэнне анатацый.

Адбор дакументаў ва універсальныя і комплексныя паказальнікі ажыццяўляецца па тэрытарыяльнай, храналагічнай і тыпавідавой прыметах. Па тэрытарыяльнай прымеце адбор у асноўным адпавядае сучаснаму адміністрацыйна-тэрытарыяльнаму падзелу края, але з улікам яго гістарычных, сацыяльна-эканамічных і прыродных і іншых асаблівасцей. Па храналагічнай прымеце раіцца ўключаць дакументы прыкладна за апошнія 7 – 10 год, але патрэбна ўключаць і ранейшую літаратуру, калі яна не страціла свайго значэння і змяшчае унікальныю краязнаўчыя звесткі. Па тыпавідавой прымеце пры адборы з найбольшай паўнатой уключаюцца кнігі і іншыя асобна выдадзеныя дакументы, поўнасцю ці часткова прысвечаныя краю. Перавага аддаецца навукова-папулярнай, даведачнай і мастацкай літаратуры,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

а таксама навуковай па даступных галінах ведаў. Больш абмежавана падыходзяць да ўключэння артыкулаў з часопісаў і газет.

Асноўная частка мае сістэматычную групоўку, для якой адаптуецца “Тыпавая схема класіфікацыі дакументаў для краязнаўчых каталогаў (картатэк) бібліятэк Рэспублікі Беларусь”. Бібліяграфічныя запісы ў межах апошніх структурных дзяленняў павінны групавацца ў лагічнай паслядоўнасці і ўключаць рэкамендацыйныя і даведачныя анатацыі. У асобных радзелах, напрыклад, персаналій, можа быць выкарыстана алфавітная ці храналагічная паслядоўнасць імёнаў знакамітых людзей края.

Да гэтых паказальнікаў абавязковымі з'яўляюцца прадмова, дапаможныя геаграфічны, персанальны і іншыя паказальнікі.

**Пытанне 2. Метадычныя асаблівасці асобных тыпаў і жанраў навукова-дапаможных краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў**

Навукова-дапаможныя краязнаўчыя паказальнікі адрасуюцца спецыялістам, даследчыкам, кіраўнікам, студэнтам старэйшых курсаў ВНУ, чые прафесійныя і навуковыя інтарэсы непасрэдна звязаны з канкрэтнай мясцовасцю. У большасці гэтых дапаможнікаў выкарыстоўваецца выбарачны адбор дакументаў, заснаваны на ацэнцы наяўнасці важных звестак, арыгінальных трактовак матэрыялу.

Сярод навукова-дапаможных паказальнікаў важнае месца займаюць **універсальныя бягучыя** тыпа “Новая літаратура аб вобласці” (раёне, горадзе). Яны прызначаны для аператыўнага інфармавання аб з'яўленні новых дакументаў і мадэлююць краязнаўчыя дакументныя патокі за кароткія адрэзкі часу – пераважна за адзін квартал.

Пры падрыхтоўцы гэтых паказальнікаў асноўнымі праблемамі з'яўляюцца:

- Забеспячэнне паўнаты выяўлення матэрыялаў аб тэрыторыі / населеным пункце, які апублікаваны ў краі і за яго межамі;
- вызначэнне крытэрыяў адбору матэрыяла;
- аператыўнасць і бесперапыннасць падрыхтоўкі паказальнікаў.

Аб’ектамі адлюстравання ў іх з'яўляюцца любыя дакументныя носьбіты інфармацыі: кнігі, фрагменты кніг, артыкулы з мясцовага і цэнтральнага друку, фотадакументы, ілюстрацыі, картаграфічныя матэрыялы. На жаль, пакуль не адлюстроўваюцца відэастужкі, гуказапісы, дакументы на замежных мовах, прысвечаныя тэрыторыі.

Адметнасцю гэтых паказальнікаў з'яўляецца шырокае адлюстраванне **артыкулаў з мясцовага перыядычнага друку.** У сучасным дакументным краязнаўчым патоку матэрыялы з мясцовага перыядычнага друку займаюць да 90% і гэта асаблівасць цалкам мадэлюецца ў паказальніках новай літаратуры. Складальнікі ўважліва праглядаюць гарадскія, раённыя і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абласныя газеты. Тэндэнцыяй сучаснасці з'яўляецца пашырэнне кола мясцовых газет. Пры адборы газетных матэрыялаў неабходна аддаваць перавагу новым фактам і з'явам у жыцці края, напрыклад, новым установам, тэхналогіям, формам гаспадарання, адукацыйным і сацыяльным рэформам, навуковым дасягненням, мясцовым вынаходніцтвам, а таксама матэрыялам краязнаўчых даследаванняў, у якіх падаюцца малавядомыя факты і падзеі, па-новаму пераасэнсоўваюцца вядомыя эпізоды жыцця рэгіёна. Пераважна адлюстроўваюцца такія газетныя жанры, як аналітычныя і інфармацыйныя карэспандэнцыі, рэпартажы, справаздачы, тэматычныя, аналітычныя і агульныя агляды; навуковыя артыкулы, артыкулы-расследаванні, дакументальныя, партрэтныя і іншыя нарысы.

Вопыт адлюстравання матэрыялаў з мясцовага і рэспубліканскага перыядычнага друку ў паказальніках новай краязнаўчай літаратуры, якія выпускаюць бібліятэкі Беларусі, заслугоўвае станоўчай ацэнкі.

У складзе бібліяграфічных запісаў пераважаюць аналітычныя. Шырока выкарыстоўваюцца кароткія даведачныя анатацыі.

Для групоўкі матэрыялу ў гэтых паказальніках выкарыстоўваецца "Тыпавая схема класіфікацыі дакументаў для краязнаўчых каталогаў (картатэк) бібліятэк Рэспублікі Беларусь". Уключаюцца неабходныя новыя рубрыкі, або выключаюцца дакументна незабяспечаныя структурныя падраздзяленні.

У паказальніках змяшчаюць кароткія прадмовы, у якіх адлюстроўваюць мэтавае і чытацкае прызначэнне, аб'екты ўліку, склад даведачна-метадычнага апарату, і асабліва ўнесеныя змены. Пошукавыя магчымасці гэтых паказальнікаў пашыраюцца з дапамогай сістэмы спасылак і дапаможных паказальнікаў. Да іх складаюць паказальнікі: імянны, персаналій, геаграфічны. Геаграфічны павінен змяшчаць тэматычныя падрубрыкі, што, на жаль, не прымяняюць беларускія абласныя бібліятэкі.

Шырока распаўсюджана падрыхтоўка ў бібліятэках **аглядаў** краязнаўчых дакументаў. Гэта **бібліяграфічныя** агляды, якія ствараюцца ў выніку дакументаграфічнага аналізу крыніц, а таксама **рэфератыўныя і аналітычныя**, якія рыхтуюцца на аснове іх фактаграфічнага аналізу.

**Бібліяграфічныя** агляды арыентуюць спажыўцоў інфармацыі ў дакументных патоках у межах абранай тэматыкі. Рэфератыўныя і аналітычныя агляды ствараюцца ў выніку аналітыка-сінтэтычнай перапрацоўкі сукупнасці дакументаў па пэўных пытаннях (праблемах, кірунках) і змяшчаюць сістэматызаваныя, абагульненыя і крытычна ацэненыя звесткі.

Бібліяграфічныя агляды краязнаўчых дакументаў шырока ствараюцца і выкарыстоўваюцца ў бібліятэках розных тыпаў. Бібліяграфічныя агляды

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

могуць быць навукова-дапаможнымі і папулярнымі. Агляды рэфератыўныя і аналітычныя рыхтуюцца, як правіла, даследчыкамі. Але на сучасным этапе і бібліёграфы павінны мець асноўныя ўяўленні аб методыцы рэфератыўных і аналітычных аглядаў. Падрыхтоўка такіх аглядаў вядзецца, напрыклад, у некаторых абласных бібліятэках Украіны і Расіі, існуе як платная паслуга, выконваецца па заказах мясцовай адміністрацыі, устаноў і арганізацый рэгіёнаў. Рэфератыўныя і аналітычныя агляды могуць рыхтавацца бібліёграфамі сумесна з іншымі спецыялістамі-краязнаўцамі.

**Бібліяграфічны агляд** змяшчае зводную характарыстыку выданняў краязнаўчага зместу і іншых дакументаў, выкананую на аснове дакументаграфічнага аналіза. Бібліяграфічныя агляды падраздзяляюцца на агляды: 1) новых краязнаўчых дакументаў (за месяц, квартал, год); 2) крыніцазнаўчыя агляды, у якіх разглядаецца характар, прызначэнне і тэматыка твораў па пэўнай праблематыцы; 3) агляды краязнаўчых інфармацыйных выданняў (бібліяграфічных дапаможнікаў). Агляды краязнаўчых бібліяграфічных выданняў адлюстроўваюць узровень бібліяграфічнай забяспечанасці вывучэння рэгіёна, даюць аналіз методыкі падрыхтаваных дапаможнікаў, выяўляюць найбольш цікавыя метадычныя рашэнні, недахопы; 4) тэматычныя. Яны прысвячаюцца як гістарычным падзеям і датам, так і розным сучасным пытанням, напрыклад, экалогія края, эканамічныя пытанні, край у творах мастацтва і іншыя; 5) персанальныя.

Асноўнымі часткамі бібліяграфічнага агляду з'яўляюцца прадмова, асноўны тэкст, спіс крыніц.

Бібліяграфічны агляд прадугледжвае абавязковае выкарыстанне карыстальнікамі адлюстраваных дакументаў.

**Рэфератыўны агляд** арыентуе карыстальнікаў не ў патоку дакументаў, а ў ведах, у сукупнасці фактаў і канцэпцый, у падзеях незалежна ад таго, па якіх дакументах яны выяўлены. Патрабаваннем да рэфератыўных аглядаў з'яўляецца неабходная паўната і дакладнасць перадачы фактаў і канцэпцый, адлюстраваных у літаратуры. Астатняя інфармацыя, якая можа быць змешчана ў вывучаемых крыніцах, не асвятляецца. Складальнік рэфератыўнага агляда не павінен даваць крытычнай ацэнкі матэрыяла, адлюстроўваць уласныя погляды. Бібліяграфічная інфармацыя прадстаўлена ў рэфератыўным аглядзе спісам літаратуры і спасылкамі, цытаваннем.

**Аналітычны агляд** арыентуе спецыялістаў у інфармацыйным патоку па данай праблеме і дае ацэнку стану праблемы, выяўляе тэндэнцыі ў яе развіцці. Таму аналітычны агляд з'яўляецца вынікам не толькі фактаграфічнага аналіза першасных дакументаў, але і канцэптаграфічнага аналіза адлюстраваных фактаў, падзей, ідэй. (Гэта значыць, што пры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стварэнні данага віду агляда ажыццяўляецца не толькі інфармацыйнае згортванне, але і разгортванне інфармацыі).

Аналітычныя агляды ў залежнасці ад выконваемай імі функцыі падзяляюцца на віды:

- агляды-абгрунтаванні, у якіх даецца ацэнка стану пытання з абгрунтаваннем неабходнасці рашэння данай праблемы, і прапануюцца шляхі і метады вырашэння. Напрыклад, тэма агляда “Кансервацыя Крэўскага замка” патрабуе абгрунтавання не толькі гістарычнай і культурнай значнасці аб’екта, яго турыстычнага значэння, але і плана рэалізацыі кансервацыі. Агляды-абгрунтаванні вельмі часта адрасуюцца мясцоваму кіраўніцтву.
- Выніковыя агляды сумяшчаюць ацэнку стана пытання з характарыстыкай дасягнутага ўзроўня, а таксама паказваюць нявырашаныя праблемы. Такія агляды фіксуюць пэўны этап даследавання ці стану аб’екта, засяроджваюць увагу на нявырашаных праблемах.
- Прагнастычныя агляды. У іх даецца ацэнка стану і вызначаюцца перспектыўныя шляхі развіцця краязнаўчых даследаванняў, кірункаў сучаснага развіцця рэгіёнаў. Прагнастычныя агляды арыентаваны на перспектыўныя кірункі краязнаўчых даследаванняў, могуць быць адрасаваны плануючым мясцовым органам, і выконваюць ролю элементаў праграм рэгіянальнага развіцця.

Структура рэфератыўнага і аналітычнага аглядаў:

1) уводзіны – абгрунтаванне агляду, чытацкае прызначэнне, храналагічныя і іншыя межы адлюстравання дакументаў.

2) Асноўная тэкставая частка.

3) Заключэнне (вывады).

4) Спіс літаратуры, прадметны і імянны паказальнік, змест і анатацыя.

Пры падрыхтоўцы рэфератыўнага ці аналітычнага агляду неабходна зрабіць яго абгрунтаванне і распрацаваць заданне па састаўленні (тэматычны план, змест). У заданні па састаўленні важна вылучыць геаграфічныя, храналагічныя, відавыя, моўныя і семантычныя межы адбору дакументных крыніц інфармацыі. Семантычныя межы – гэта пералік тэрмінаў (ключавых слоў), якія раскрываюць сэнсавае значэнне тэмы агляда і вызначаюць склад асноўных пытанняў, якія трэба разглядзець. У якасці ключавых слоў могуць быць выкарыстаны назоўнікі, прыметнікі, лічэбнікі, за выключэннем дзеясловаў, дзеяпрыметнікаў і некаторых інш. Ужываюцца словазлучэнні тыпу назоўнік + назоўнік (гісторыя фальварка), прыметнік + назоўнік, (рэгіянальная лексіка), словазлучэнні, якія ўключаюць уласныя імёны, тытулы, пасады і т.п. (князь Геранім Любамірскі) і інш.

Семантычны аналіз выконваецца з выкарыстаннем рознага роду слоўнікаў, даведнікаў, тэрміналагічных стандартаў, падручнікаў, вучэбных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дапаможнікаў і іншых дакументальных крыніц інфармацыі. Вынікі структурна-семантычнага аналізу першапачаткова фіксуюць на картачках, а затым на лістах паперы з устаноўленым фарматам запісу. Рубрыкатар агляда – гэта сістэматызаваная сукупнасць ключавых слоў, якія характарызуюць яго змест з указаннем класіфікацыйных індэксаў і назваў тэматычных рубрык, да якіх яны адносяцца. Рубрыкатар у значнай ступені вызначвае і лагічную пабудову агляда і паўнату адлюстравання ў ім асобных пытанняў і сувязь тэмы агляда з іншымі абласцямі ведаў. Вызначаныя тэрміны параўноўваюцца з дапаможнымі паказальнікамі да інфармацыйных выданняў (геаграфічнымі, прадметнымі, тэматычнымі, персанальнымі) і выбіраюцца адпаведныя рубрыкі. Выпісваюцца рэлевантныя нумары бібліяграфічных запісаў, якія можна запісваць умоўным шыфрам.

Па тэме агляда складаецца спіс літаратуры. Калі інфармацыйнае выданне не мае дапаможных паказальнікаў, ці патрэбных рубрык, магчыма на аснове структурна-семантычнага аналіза зместа падабраць найбольш адпаведную тэматычную рубрыку і абследаваць яе. Таксама дзейнічаюць, прагладаючы перыядычныя выданні і зборнікі. Пры пошуку інфармацыі ў БД і ЭКК адбор дакументаў можа праводзіцца па шырокаму колу пошукавых прымет.

На аснове выяўленых бібліяграфічных запісаў складаецца картатэка дакументаў па тэме агляда і вядзецца іх вывучэнне. Рэлевантныя дакументы канспектуюцца. Падчас вывучэння дакументаў у змест могуць уносіцца неабходныя змяненні.

Пры канспектаванні бібліёграф ажыццяўляе лексічнае і семантычнае згортванне матэрыялу. Лексічнае згортванне (выкарыстанне абрэвеатур, значкоў і інш.) магчыма прымяняць настолькі, каб яно не перашкаджала ўспрыйманню інфармацыі, так як гэты канспект не асабісты (работа над аглядам можа быць перададзена іншаму супрацоўніку). Семантычнае згортванне зводзіцца да ацэнкі значнасці фрагментаў тэкста, іх скарачэння і перафразіроўкі.

У рэфератыўных аглядах найчасцей выкарыстоваецца падрабязнае, лагічнае, паступовае раскрыццё тэмы.

Тэматыка **галіновых і тэматычных** бібліяграфічных паказальнікаў непасрэдна звязана з сучаснымі кірункамі рэгіёназнаўчых даследаванняў, з задачамі эканамічнага і сацыяльна-культурнага развіцця асобных тэрыторый. Назіраецца тэндэнцыя пашырэння храналагічных рамак да адлюстравання галін і тэм. Напрыклад, калі дапаможнік прысвечаны геаграфіі вобласці, то храналагічна пачынаецца з пачатку вядомых даследаванняў.

Змест галіновых паказальнікаў фарміруецца на аснове вывучэння тэматыкі дакументнага масіву і з улікам структуры галіны краязнаўства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рубрыкі “Тыпавой схемы класіфікацыі дакументаў для краязнаўчых каталогаў (картатэк) бібліятэк Рэспублікі Беларусь” павінны дапрацоўвацца. Для тэматычных паказальнікаў змест фарміруецца на аснове ствараемага паняційнага рубрыкатара.

Выяўленне і адбор дакументаў павінны адпавядаць мэтаваму і чытацкаму прызначэнню гэтых дапаможнікаў. Крытэрыі адбору павінны забяспечыць дастатковую паўнату адлюстравання дакументаў, але адмяжаваць уключэнне малаінфарматыўных, нязначных і папулярных матэрыялаў. Вельмі важна забяспечыць поўнае адлюстраванне нарматыўных дакументаў, гістарычных першакрыніц, мемуараў, бібліяграфічных дапаможнікаў, навуковых публікацый. Не меншае значэнне мае ўключэнне замежнамоўных дакументаў.

Бібліяграфічныя запісы ў краязнаўчых навукова-дапаможных паказальніках пры неабходнасці анатуюцца, для чаго выкарыстоўваюцца пераважна даведачныя анатацыі.

Групоўка бібліяграфічных запісаў у апошніх структурных дзяленнях, як правіла, алфавітная.

Неабходнымі элементамі дапаможнікаў з'яўляюцца уводзіны, у якіханалізуецца развіццё галіны і яе дакументальнае забеспячэнне, сістэма дапаможных паказальнікаў.

**Персанальныя дапаможнікі.** Біяграфічнае вывучэнне і вывучэнне ўкладу асобы ў навуку, грамадскую практыку з'яўляецца спосабам атрымання новых краязнаўчых ведаў. Дыяпазон краязнаўчых навукова-дапаможных персанальных (біябібліяграфічных) дапаможнікаў па тыпах і тэматыцы дастаткова шырокі. Гэта паказальнікі, спісы, агляды, даведнікі, слоўнікі і інш. Прысвячаюцца яны адной асобе ці групе ўраджэнцаў / дзеячоў края. Па тэматыцы гэта дапаможнікі, прысвечаныя гістарычным, грамадска-палітычным дзеячам, прадстаўнікам мастацтва і іншых галін і сфер. На сучасным этапе прыметным попытам карыстаюцца дапаможнікі, прысвечаныя дзеячам навукі і асветы. Назіраецца тэндэнцыя падрыхтоўкі буйных бібліяграфічных дапаможнікаў.

Асноўнымі структурнымі элементамі персанальных дапаможнікаў з'яўляюцца прадмова, уводзіны, біяграфічная даведка (або аўтабіяграфія ці хроніка), спіс літаратуры, які складаецца са спісаў літаратуры пра асобу, спіса твораў асобы, калі такія існуюць, дапаможныя паказальнікі. У біябібліяграфічных дапаможніках асноўны тэкст складаецца з персанальных глаў, а іх групоўка можа быць здзейснена па алфавіту, у храналагічнай паслядоўнасці, па відах дзейнасці.

Загалоўкам кожнай персанальнай главы з'яўляецца поўнае імя дзеяча. Гэтым элементам загаловак можа быць абмежаваны, але нярэдка яго

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пашыраюць, уключаючы псеўданімы, мянушкі. Прыводзяцца даты жыцця, часам указваецца род дзейнасці, прафесія. Недапушчальна ў загалоўку (а гэта рубрыка персанальнай главы) ўказваць толькі ініцыялы асобы.

У сучасных персанальных бібліяграфічных дапаможніках адбор імён ажыццяўляецца па наступных прынцыпах:

- ураджэнцы края (у неабходных выпадках з ўлікам гістарычных змяненняў адміністрацыйна-тэрытарыяльных межаў края);
- асобы, пэўныя перыяды жыцця якіх прайшлі ў даным краі;
- асобы, якія прызнаюць, што даны край аказаў уплыў на іх жыццё і дзейнасць.

Таксама могуць адлюстроўвацца дзеячы, наведванне якімі населенага пункта ці рэгіёна, аказала прыметны ўплыў на яго развіццё.

Пошук імён вядзецца па картатэках знакамітых людзей края, фактаграфічных БД, даведачных выданнях, мясцовых перыядычных выданнях і іншых крыніцах.

Вельмі важным структурным элементам з'яўляюцца біяграфічныя звесткі. Яны набываюць у дапаможніках розныя формы: ад кароткіх біяграфічных даведак, да разгорнутых біяграфічных артыкулаў. Пісацца яны павінны па распрацаванаму плану. Не пажадана без апрацоўкі выкарыстоўваць даведкі з энцыклапедычных і іншых выданняў, так як у дапаможніку атрымліваецца кангламерат даведак розных па структуры, а сувязь “чалавек – край” не знаходзіць адлюстравання. Часам біяграфічныя даведкі, падрыхтаваныя бібліёграфамі па цяжкадаступных крыніцах, па крупіцах, становяцца амаль адзінай даступнай крыніцай.

Бібліяграфічныя апісанні ў персанальных дапаможніках, як правіла, не анатуюцца. Такая методыка апраўдана тады, калі біяграфічныя даведкі насычаны звесткамі, раскрыта сувязь “дзеяч-край”, а ў спісах літаратуры прадстаўлены творы, змест якіх дубліруеццца (напрыклад, юбілейнага характару), спецыфічныя дакументы (каталогі выстаў мастакоў і інш.) Калі ж біяграфічныя даведкі мінімальныя, а спісы літаратуры аб’ёмныя, то неабходна анатаваць хаця б важнейшыя публікацыі.

У персанальных дапаможніках нярэдка прысутнічае наступны метадычны недахоп: у біяграфічных даведках (тэкстах) складальнікі імкнуцца раскрыць значэнне дзеяча для Беларусі ці свету, але выпускаюць такі аспект, як роля чалавека ў жыцці края, ці ўплыў края на чалавека, адлюстраванне сувязяў чалавека і яго малой радзімы; уплыў сям’і, блізкіх людзей, пражываўшых разам з ім у данай мясцовасці, на жыццёвы і творчы лёс дзеяча. Зразумела, што раскрыць сувязі чалавека з краем бывае вельмі няпроста, асабліва калі такая сувязь мала адлюстравана ў біяграфічнай літаратуры. Аднак чым менш звестак, тым больш глыбока неабходна

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вывучаць крыніцы, звязаныя з дзеячом, таму што менавіта аспект сувязі “чалавек – край” з'яўляецца найбольш каштоўным у плане рэалізацый функцыянальнага патэнцыялу персанальнай краязнаўчай бібліяграфічнай інфармацыі.

Пры адборы літаратуры аб дзеячах, сувязь якіх з краем была эпізодам іх жыцця, непажадана поўна адлюстроўваць усе творы гэтых людзей, творы ніякім чынам не звязаныя з даным краем (калі асобы з'яўляюцца аўтарамі).

**Дайджэсты.** Гэты жанр яшчэ не атрымаў прыметнага распаўсюджання ў краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі бібліятэк Беларусі, але можа разглядацца як перспектыўны, асабліва з улікам абмежаванай даступнасці значных дакументальных крыніц краязнаўчай інфармацыі. Так, Любанская ЦБ Мінскай вобласці выпусціла шэраг дайджэстаў краязнаўчай тэматыкі. Прадаўжальныя дайджэсты краязнаўчага характару са штогадовай кумуляцыяй матэрыялу рыхтуе ЦБС Маскоўскага раёна Санкт-Пецярбурга і інш. Гэта бібліятэка апрацоўвае самыя розныя публікацыі, прысвечаныя эканоміцы, прамысловасці, культурнаму жыццю, медыцынскаму абслугоўванню насельніцтва раёна.

У навуковым асяроддзі ствараюцца такія тыпы дайджэстаў, як рэфераты і анатацыі (ці рэзюме). Зараз ствараюцца “часопіс-дайджэст”, “інфармацыйна-аналітычны часопіс-дайджэст“, “дайджэст-канспект”, “дайджэст-бібліятэка”. Акрамя матэрыялаў названых жанраў, яны змяшчаюць аналітычныя агляды, статыстычныя дадзеныя, артыкулы, фрагменты тэкстаў публікацый, афіцыйныя і нарматыўныя дакументы, падабраныя па тэмах, не забяспечаных абагульняючымі публікацыямі, з улікам сферы інстарэсаў рэальных ці патэнцыяльных карыстальнікаў. Кожны фрагмент, вытрымка з тэксту, суправаджаецца спасылкай на бібліяграфічнае апісанне дакумента ў цэлым.

Найчасцей дайджэсты складаюцца пры абслугоўванні кіраўнікоў. Бібліятэкі навучальных устаноў практыкуюць іх падрыхтоўку па новых раздзелах вучэбных дысцыплін. Для публічных бібліятэк у якасці перспектыўнай тэматыкі можна раглядаць падрыхтоўку дайджэстаў па курсах рэгіёназнаўства (горадазнаўства), якія пашыраюцца ў школах краіны.

Методыка падрыхтоўкі дайджэстаў падобная да методыкі праблемна-тэматычных паказальнікаў. Асноўнымі працэсамі з'яўляюцца: вызначэнне тэматыкі, пошук інфармацыі, выдзяленне неабходных фрагментаў тэкстаў, групоўка матэрыялу, якая фактычна пераўтварецца ў стварэнне новага тэксту. Асноўная асаблівасць дайджэстаў заключаецца ў тым, што адзінкай групоўкі пры складанні бібліяграфічных паказальнікаў з'яўляюцца дакументы, а пры складанні дайджэста – фрагменты тэкстаў (нярэдка аб рэгіёнах важнымі з'яўляюцца нават малыя фрагменты). Для

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

даджэстаў характэрны: вузкасць тэматыкі, шматаспектнасць разгляду праблемы; разнастайнасць тэрміналогіі, якая выкарыстоўваецца спецыялістамі розных галін; супярэчлівасць пуктаў гледжання і ацэнак, выказваемых рознымі аўтарамі.

Пры адборы матэрыялу перавага аддаецца навуковым публікацыям, для якіх характэрна навізна ідэй, фактаў і прапаноў, паўната адлюстравання разглядаемага пытання, кампетэнтнасць і аўтарытэт аўтара.

Структура дайджэста: тытульны ліст, змест. Прадмова, асноўны тэкст, які звычайна падзяляецца на параграфы, спіс выкарыстанай літаратуры, дадаткі (карты, табліцы, графікі і інш.), слоўнік асноўных тэрмінаў (пры неабходнасці). У надрукаваны дайджэст мэтазгодна ўключыць дапаможныя паказальнікі (імянны, персаналій, геаграфічных назваў, прадметны і інш.) У электронным варыянце дайджэста прадугледжваюцца гіперспасылкі, якія аблягчаюць арыентацыю ў тэксце.

**Вывады:**

1. На сучасным этапе бібліятэкі рыхтуюць разнастайныя па тыпах і жанрах папулярныя і навукова-дапаможныя краязнаўчыя бібліяграфічныя дапаможнікі.

2. У шэрагу жанраў, асабліва папулярных, заметна павялічылася значэнне фактаграфічных матэрыялаў, што звязана з імкненнем з боку бібліёграфаў лепш задавальняць пазнавальныя патрэбнасці карыстальнікаў.

3. Бібліятэкі аддаюць перавагу ў падрыхтоўы такіх жанраў папулярных краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў, як каляндары знамянальных і памятных дат, бібліяграфічныя хронікі, энцыклапедыі, нарысы, універсальныя і комплексныя бібліяграфічныя паказальнікі.

4. Сярод навукова-дапаможных паказальнікаў распаўсюджаны універсальныя паказальнікі новай літаратуры, галіновыя і тэматычныя, агляды. Перспектыўным прадуктам і паслугай могуць быць рэфератыўныя і аналітычныя агляды па даступнай для бібліёграфаў-краязнаўцаў тэматыцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 3.1 Тэматыка семінарскіх, практычных і лабараторных заняткаў

| № п/п | Назва тэмы | Від заняткаў і колькасць гадзін |
|---|---|---|
| 1. | Асаблівасці складу і фарміравання краязнаўчага фонда бібліятэк | 2 гадзіны, семінар |
| 2. | Арганізацыя бібліятэчнага абслугоўвання па краязнаўстве | 2 гадзіны, семінар |
| 3. | Краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны апарат бібліятэкі | 2 гадзіны, семінар, 4 гадзіны лабараторная работа |
| 4. | Электронныя краязнаўчыя інфармацыйныя рэсурсы | 2 гадзіны, семінар, 2 гадзіны, практычная работа |
| 5. | Вызначэнне краязнаўчай каштоўнасці дакументаў | 6 гадзін, практычная работа |
| 6. | Бягучае камплектаванне краязнаўчага фонда бібліятэкі | 2 гадзіны, практычная работа |
| 7. | Рэтраспектыўнае камплектаванне краязнаўчага фонда бібліятэкі | 2 гадзіны, практычная работа |
| 8. | Аналітыка-сінтэтычная апрацоўка краязнаўчых дакументаў | 2 гадзіны, лабараторная работа |
| 9. | Методыка падрыхтоўкі краязнаўчай бібліяграфічнай і фактаграфічнай прадукцыі | 4 гадзіны, практычная работа |
| 10. | Краязнаўчая бібліяграфічная прадукцыя ў электронным (лічбавым) асяроддзі | 4 гадзіны, практычная работа |
| **Усяго: 8 г. – семінары, 20 г. – практычныя заняткі 6 – лабараторныя заняткі** | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 3.2 Метадычныя парады да семінараў

Семінарскія заняткі з'яўляюцца вынікам самастойнай работы па вывучэнні асноўнай і дадатковай літаратуры па прапанаваных ніжэй тэмах семінарскіх заняткаў. Семінарскія заняткі садзейнічаюць больш глыбокаму асэнсаванню і засваенню самых складаных і значных тэм курса.

На семінары студэнты павінны паказаць дастаткова глыбокае веданне матэрыялу тэмы, уменні аналізаваць гэты матэрыял, самастойна развражаць і рабіць тэарэтычныя і практычныя вывады па вызначанай тэме.

У падрыхтоўку да семінарскага занятку ўваходзіць вывучэнне рэкамендуемай літаратуры, канспектаванне, складанне разгорнутых адказаў па кожным пытанні. Неабходна прачытаць асноўную і дадатковую літаратуру, зрабіць выпіскі і падрыхтаваць кароткі або разгорнуты (па жаданні студэнта) пісьмовы адказ на кожнае пытанне семінара. Гэтымі запісамі студэнт можа карыстацца пры адказах на семінарскіх занятках.

Існуюць наступныя патрабаванні да выступлення студэнта: добрае валоданне вывучаным матэрыялам; уменне звязаць яго з адпаведным напрамкам дзейнасці бібліятэк; лагічнасць і паслядоўнасць у адказе; выдзяленне найбольш важных палажэнняў і ўменне зрабіць вывады па кожным пытанні семінара. Дадатковыя балы набіраюць студэнты, якія дапаўняюць выступленні, выказваюць крытычныя і ацэначныя меркаванні, вядуць дыскусію, рыхтуюць невялікія прэзентацыі па тэматыцы семінараў.

### 3.3 Метадычныя парады да выканання курсавой работы

Курсавая работа на другім курсе прадстаўляе сабой напісанне рэферата ці агляда літаратуры на падставе дакументальных крыніц па тэме. Яна будуецца на аналізе і абагульненні асноўных ідэй, палажэнняў, якія выказаны рознымі аўтарамі.

***Мэта работы***: Замацаваць гістарычныя і тэарэтычныя веды, атрыманыя ў працэсе вывучэння бібліяграфазнаўства, дапамагчы студэнтам разумець прычыны ўзнікнення бібліяграфіі, яе ролю ў інфармацыйным забеспячэнні грамадства, спецыфіку бібліяграфіі ў розныя гістарычныя перыяды, уклад выдатных бібліёграфаў і арганізацый, працэсы фарміравання і ўдасканалення метадаў бібліяграфічнай дзейнасці, эвалюцыю тыпаў і форм бібліяграфічнай прадукцыі, што забяспечвае выяўленне, захаванне і выкарыстанне каштоўнага вопыту мінулага.

***Методыка выканання работы***: Студэнт самастойна выбірае тэму з прапанаванага спісу. Выкарыстоўваючы слоўнікі, энцыклапедыі і іншую літаратуру, студэнт вывучае тэму. Па каталогах бібліятэк, базах даных, спецыяльных часопісах неабходна выявіць асноўную літаратуру прыкладна за апошнія 5-10 гадоў. Рэлевантныя публікацыі вывучаюцца і аналізуюцца, на кожную з іх складаецца канспект. Пасля вывучэння і аналіза літаратуры складаецца план курсавой работы. Ен павінен складацца з раздзелаў: уводзіны, асноўная частка, якая павінна быць прадстаўлена тэматычнымі раздзеламі і падраздзеламі па тэме работы, і заключэнне. Ва ўводзінах неабходна даць абгрунтаванне актуальнасці, значнасці тэмы, адлюстраваць мэты і задачы работы.

Курсавая работа павінна прадстаўляць сабой звязнае выкладанне матэрыяла са спасылкамі на афіцыйныя крыніцы, артыкулы, манаграфіі і г.д.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спасылкі на літаратуру можна даваць у падрадковых заўвагах ці непасрэдна ў тэксце.

***Літаратура***

1. Методические указания по подготовке курсовых и дипломных работ для специальности 1-23 01 11 Библиотечно-информационная деятельность (по направлениям) / составители : Р.А. Ровина, Н.А. Яцевич. – Минск : БГУКИ, 2016. – 29с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ

## 4.1 Пералік пытанняў па тэмах семінарскіх, практычных і лабараторных заняткаў

## СЕМІНАР
## па тэме "АСАБЛІВАСЦІ СКЛАДУ І ФАРМІРАВАННЯ КРАЯЗНАЎЧАГА ФОНДА БІБЛІЯТЭК", 2 гадзіны

### Пытанні

1. Тыпы, віды, групы дакументаў, якія складаюць краязнаўчыя фонды бібліятэк.
2. Асноўныя этапы фарміравання краязнаўчых фондаў бібліятэк. Мадэліраванне краязнаўчага фонда.
3. Камплектаванне краязнаўчага фонда. Этапы вызначэння краязнаўчай каштоўнасці дакумента.
4. Асаблівасці складу і камплектавання краязнаўчых фондаў універсальных навуковых абласных бібліятэк (УНАБ), спецыяльных бібліятэк, публічных масавых бібліятэк.
5. Крыніцы папаўнення, улік і апрацоўка краязнаўчых дакументаў. Размяшчэнне і захаванне краязнаўчых фондаў.
6. Краязнаўчыя калекцыі ў фондах бібліятэк.

*ЛІТАРАТУРА*

*Асноўная*

1. *Акулич, С.Н.* О сущности понятия "краеведческий документ" / С.Н. Акулич // Сов. библиотековедение. – 1990. – №4. – С. 4 – 53.

2. *Балацкая, Н.М.* Библиотечное краеведение / Н.М. Балацкая // Библиотечная энциклопедия / РГБ. – Москва : Пашков дом, 2007. – С.198 – 199.

3. *Библиотечное* краеведение : терминологический словарь / сост. В.С. Крейденко, А.В. Мамонтов. – СПб., 1998. – 85 с. *(выбар тэрмінаў па тэме).*

4. *Грядовкина, И.В.* Формирование краеведческих полнотекстовых коллекций в Национальной библиотеке Беларуси: достижения и перспективы / И.В. Грядовкина // Бібліятэчнае краязнаўства : прастора вялікіх магчымасцей і перспектыў : зборнік навуковых артыкулаў / Нацыянальная бібліятэка Беларусі ; складальнік Т.В. Кузьмініч. – Мінск, 2013. – С.176-187.

1. *Калініна Т. М.* Аддзел беларускай і краязнаўчай літаратуры: мінулае і сучаснасць : (да 80-годдзя з часу заснавання Магілёўскай абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна) / // Віцебскі край — Матэрыялы Міжнароднай навукова-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

практычнай канферэнцыі, прысвечанай 170-годдзю з дня нараджэння М. Я. Нікіфароўскага, 5 лістапада 2015 г., Віцебск — С. 262—266.

2. *Калініна, Т.М.* Дзейнасць Магілёўскай бібліятэкі па фарміраванні краязнаўчых рэсурсаў рэгіёна / Т.М. Калініна // // Бібліятэчнае краязнаўства : прастора вялікіх магчымасцей і перспектыў : зборнік навуковых артыкулаў / Нацыянальная бібліятэка Беларусі ; складальнік Т.В. Кузьмініч. – Мінск, 2013. – С.52-57.

3. *Криворотенко, С.Н.* Краеведческий фонд библиотек : учеб. пособие / С.Н.Криворотенко. – М. : Либерея-Бибинформ, 2005. – 94 с.

4. *Мамонтов, А.В.* Библиотечное краеведение : учеб. пособие. Вып. 2. Краеведческий библиотечный фонд / А.В.Мамонтов. – СПб.: Академия культуры , 1998. – 38 с.

5. *Турмасава, Л.І.* Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф. Карскага – цэнтр бібліятэчнага краязнаўства на Гродзеншчыне / Турмасава Л.І., Ігнатовіч М.Э. // Бібліятэчнае краязнаўства : прастора вялікіх магчымасцей і перспектыў : зборнік навуковых артыкулаў / Нацыянальная бібліятэка Беларусі ; складальнік Т.В. Кузьмініч. – Мінск, 2013. – С.46-51.

6. Стрыжонак, І.М. Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства: тэксты лекцый / І.М.Стрыжонак, В.І.Саітава [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: Бібліятэка БДУ культуры і мастацтваў.

*Дадатковая*

1. *Ползик, В.П.* Памятные книжки Витебской губернии на 1861 – 1914 гг. как основа регионального краеведения XIX в. / В.П. Ползик // Бібліятэчнае краязнаўства : прастора вялікіх магчымасцей і перспектыў : зборнік навуковых артыкулаў / Нацыянальная бібліятэка Беларусі ; складальнік Т.В. Кузьмініч. – Мінск, 2013. – С.128-138.

2. *Криворотенко, С.Н.* Структурная модель краеведческого фонда библиотек / С.Н. Криворотенко // Інфармацыйныя рэсурсы бібліятэк і іх кадравае забеспячэнне: матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф. – Минск, 2000.– С.55 – 54.

3. *Лукашов, И.Б.* Определение краеведческого качества документа / И.Б.Лукашов // Библиотековедение. – 1993. – №3. – С.67 – 75.

4. *Шаталова, Н.В.* Формирование информационных ресурсов краеведения – важные направления региональной культурной политики / Н.В.Шаталова // Библиотечное дело – 2000: проблемы формирования открытого информационного общества. Тезисы докл. – Ч.1 – М., 2000. – С.242 – 243.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# СЕМІНАР
# па тэме "РАСПАЎСЮДЖВАННЕ КРАЯЗНАЎЧЫХ ВЕДАЎ СЯРОД НАСЕЛЬНІЦТВА", 2 гадзіны

## Пытанні

1. Арганізацыя і правядзенне буйных комплексных мерапрыемстваў:
   - краязнаўчых конкурсаў,
   - краязнаўчых канферэнцый, чытанняў,
   - сустрэч з краязнаўцамі,
   - Дзён населеных пунктаў, вуліц і інш.
2. Стварэнне і дзейнасць аматарскіх аб'яднанняў (суполак, гурткоў і інш.).
3. Стварэнне і дзейнасць музейных экспазіцый і краязнаўчых музеяў на базе бібліятэк; распрацоўка краязнаўчых экскурсій.
4. Узаемадзеянне з адукацыйнымі ўстановамі, архівамі, музеямі, адміністрацыяй мясцовых органаў улады, рэгіянальнымі СМІ.
5. Прамоцыя краязнаўчых ведаў ў сацыяльных медыя.
6. Распаўсюджванне вынікаў уласных навуковых і пошукавых даследаванняў бібліятэкараў-краязнаўцаў (публікацыі, выступленні, рэзультаты даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання).
7. Краязнаўчы сайт (раздзел сайта) бібліятэкі як канал распаўсюджвання краязнаўчых ведаў.

*ЛІТАРАТУРА*

*Асноўная*

1. *Ажеева, Р.Б.* Историко-краеведческая деятельность публичных библиотек : учеб. пособие / Р. Б. Ажеева. – Москва : Литера, 2011. — 105 с. – (Серия "Современная библиотека" ; вып. 88).
2. *Балацкая, Н.М.* Краеведение на сайтах публичных библиотек: формальный подход / Н.М. Балацкая // Бібліятэчнае краязнаўства : прастора вялікіх магчымасцей і перспектыў : зборнік навуковых артыкулаў / Нацыянальная бібліятэка Беларусі ; складальнік Т.В. Кузьмініч. – Мінск, 2013. – С.231-236.
3. *Карпова, И.*А. Борисовская центральная районная библиотека им. И.Х. Колодеева – мемориальный центр / И.А. Карпова // Бібліятэчнае краязнаўства : прастора вялікіх магчымасцей і перспектыў : зборнік навуковых артыкулаў / Нацыянальная бібліятэка Беларусі ; складальнік Т.В. Кузьмініч. – Мінск, 2013. – С.58-67.
4. *Ковалева А. М.* Краеведческий корпоративный ресурс "Алтайский край» / А.М. Ковалева // Научные и технические библиотеки. – 2012. – № 5. – С. 60-67.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. *Коптик, С.К.* Информационные краеведческие ресурсы: доступ и обслуживание пользователей / С.К. Коптик Бібліятэчнае краязнаўства : прастора вялікіх магчымасцей і перспектыў : зборнік навуковых артыкулаў / Нацыянальная бібліятэка Беларусі ; складальнік Т.В. Кузьмініч. – Мінск, 2013. – С.242-250.

1. *Малышко, О. Ф.* Электронные площадки размещения и продвижения краеведческих ресурсов / О.Ф. Малышко // Библиотека в контексте российской социокультурной истории: краеведческий аспект: материалы Всерос. науч. конф. (с междунар. участием), посвящ. 180-летию Нац. библиотеки им. Ахмет-Заки Валиди Республики Башкортостан (Уфа, 24-25 марта 2016 г.). – Уфа, 2016. – С. 334-340. – Режим доступа: http://altlib.ru/945.

6. *Морылева, Н.И.* Научная библиотека университета в системе создания и распространения краеведческой информации (на примере науч. б-ки Новгородского ун-та) / Н.И. Морылева // Научные и технические библиотеки. – 2005. – № 4. – С.44 – 50.

7. *Полетаева, Т.М.* Библиотеки, архивы, СМИ: сотрудничество в области краеведения / Т.М. Полетаева // Бібліятэчнае краязнаўства : прастора вялікіх магчымасцей і перспектыў : зборнік навуковых артыкулаў / Нацыянальная бібліятэка Беларусі ; складальнік Т.В. Кузьмініч. – Мінск, 2013. – С.85-92.

8. *Потупчик, М.Н.* Современные интернет-технологии как средство продвижения краеведческих ресурсов: мобильность, вовлечение, сотрудничество / М.Н. Потупчик, О.Ф. Малышко // Бібліятэчнае краязнаўства : прастора вялікіх магчымасцей і перспектыў : зборнік навуковых артыкулаў / Нацыянальная бібліятэка Беларусі ; складальнік Т.В. Кузьмініч. – Мінск, 2013. – С.237-241.

9. *Устинова, Н. М.* Краеведческий контент в электронных социальных сетях / Н.М. Устинова // Современная краеведческая деятельность библиотеки в цифровом формате : материалы межрегион. науч.-практ. конф., 25 сент. 2015 г., Челябинск / Челяб. обл. универс. науч. б-ка ; редкол. : Н. И. Диская [и др.]. – Челябинск, 2015. – С. 44 – 50. - Режим доступа : http://chelreglib.ru/media/files/resources/editions/sovremennya_kraevedcheskaya_deyatelnost.pdf.

*Дадатковая*

1. *Мартиросова, М. Б.* Библиотеки и Википедия / М. Б. Мартиросова // Современная краеведческая деятельность библиотеки в цифровом формате : материалы межрегион. науч.-практ. конф., 25 сент. 2015 г., Челябинск /, Челяб. обл. универс. науч. б-ка ; редкол. : Н. И. Диская [и др.]. – Челябинск, 2015. – С. 60 – 69. – Режим доступа :

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

http://chelreglib.ru/media/files/resources/editions/sovremennya_kraevedcheskaya_deyatelnost.pdf.
2. *Поздеева, Н.Е.* Краеведение: приоритетные направления / Н.Е. Поздеева // Библиотековедение. – 2000. – №6. – С.83 – 86.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## СЕМІНАР
## па тэме “КРАЯЗНАЎЧЫ ДАВЕДАЧНА-БІБЛІЯГРАФІЧНЫ АПАРАТ БІБЛІЯТЭКІ”, 2 гадзіны

### Пытанні

1. Краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны апарат: азначэнне, уласцівасці, крытэрыі, структура ў бібліятэках розных тыпаў.
2. Універсальныя базы даных “Краязнаўства”: прызначэнне, аб’екты адлюстравання, асаблівасці бібліяграфічнай характарыстыкі і інш.

    2.1. Выступленні студэнтаў з прэзентацыямі баз даных “Краязнаўства” . абласных бібліятэк Беларусі (Гродзенскай, Магілёўскай і інш.).
3. Замежны вопыт стварэння самастойных краязнаўчых электронных каталогаў, зводных электронных краязнаўчых каталогаў (Расія і інш.).
4. Метадычная характарыстыка карткавага краязнаўчага каталога.
5. Каталог мясцовых выданняў: прызначэнне, аб’екты адлюстравання, асаблівасці бібліяграфічнай характарыстыкі, электроннай і карткавай формаў і інш. Зводныя (карпаратыўныя)каталогі мясцовых выданняў.
6. Пуцевадзіцелі бібліятэкі па электронных краязнаўчых рэсурсах Інтэрнета.
7. Краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны фонд (КДБФ) бібліятэкі: прызначэнне, тыпалогія даведачных выданняў (рэсурсаў) у яго складзе.

    7.1. Бібліяграфічныя, фактаграфічныя і камбініраваныя базы даных у складзе КДБФ бібліятэк розных тыпаў.
8. Фонд неапублікаваных бібліяграфічных дапаможнікаў (ФНБД), электронныя архівы выкананых краязнаўчых даведак.
9. Віртуальнае даведачнае абслугоўванне па краязнаўстве.

*ЛІТАРАТУРА*

*Асноўная*

1. *Ковалева, А. М.* Краеведческий корпоративный ресурс “Алтайский край» / А.М. Ковалева // Научные и технические библиотеки. – 2012. – № 5. – С. 60-67; то же: http://www.altlib.ru/216 ; http://ellib.gpntb.ru/subscribe/ntb/2012/5/ntb_5_8_2012.htm.
2. *Котышева, Н. Н.* Опыт Кемеровской областной научной библиотеки им. В. Д. Федорова по ретроконверсии карточного краеведческого каталога на основе ежеквартального указателя «Литература о Кемеровской области» / Н.Н. Котышева // Современная краеведческая деятельность библиотеки в цифровом формате : материалы межрегион. науч.-практ. конф., 25 сент. 2015 г., Челябинск. – Челябинск, 2015. – С. 132-137 [Электронный ресурс]. – Режим доступа:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

http://chelreglib.ru/media/files/resources/editions/sovremennya_kraevedcheskaya_deyatelnost.pdf.

3. *Краеведческие* указатели и БД // Справочник библиографа. – Изд 4 – е, испр. и доп. – СПб. : Профессия, 2014. – С.552 – 564. (без змен гэты раздзел ёсць і ў папярэдніх выданнях “Справочника библиографа”).

4. *Краеведческий* каталог // Библиотечная энциклопедия /РГБ. – М.: Пашков дом, 2007. – С. 537.

5. *Кублова, Т.Н.* Модель распределённой каталогизации для формирования краеведческих ресурсов / Т.Н.Кублова, Н.В. Сороколетова // Библиография. – 2008. – № 5. – С. 34 – 38.

6. *Мамонтов, А.В.* Краеведческая библиография : учебник / А.В.Мамонтов, Н.Н.Щерба. – Москва : Кн. палата, 1989. – С.81 – 174.

2. *Павловская, И. С.* Виртуальное справочное обслуживание как способ распространения краеведческой информации (на примере виртуальной справочной службы (ВСС) «Спроси об Алтае») / И. С. Павловская // Библиотека в контексте российской социокультурной истории: краеведческий аспект: материалы Всерос. науч. конф. (с междунар. участием), посвящ. 180-летию Нац. библиотеки им. Ахмет-Заки Валиди Республики Башкортостан (Уфа, 24-25 марта 2016 г.). – Уфа, 2016. – С. 114-116. – Режим доступа: http://altlib.ru/945.

7.

8. *Саітава, В. І.* Функцыі краязнаўчага даведачна-бібліяграфічнага апарату бібліятэкі ў кантэксце бібліякамунікацыі / В. І. Саітава // Культура Беларусі і сусвет: агульнае і асаблівае : матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі (13—14 лістапада 2008 г.) / [рэдкалегія: Н. А. Ляйко (адказны рэдактар) і інш.]. – Мінск, 2010. — С. 221—225.

9. *Сокал, Т.Ф.* Рэгіянальны геаграфічны аб’ект у нацыянальнай базе даных аўтарытэтных запісаў / Сокал Т.Ф. // Бібліятэчнае краязнаўства: тэрыторыя вялікіх магчымасцей і перспектыў : зборнік навуковых артыкулаў. – Мінск, 2013. – С. 205–215.

10. *Сусликова, Н. В.* Виртуально-справочное обслуживание в библиотеках Алтайского края // Алтай библиотечный: науч.-практ. сб. Вып. 12 / Алт. краев. универс. науч. б-ка им. В. Я. Шишкова;. – Барнаул: РИО АКУНБ, 2017 – С. 58-64.

11. *Тараненко, Л.Г.* Информационное обеспечение потребностей региона: специфика краеведческой деятельности библиотек : учебное пособие / Тараненко, Л.Г. – Москва : Литера, 2009. – С. 82–99.

12. *Шатохина, Н.З.* Оптимальная модель построения краеведческих библиографических ресурсов / Н. З. Шатохина // Библиотечное Дело.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Специальный выпуск. Библиотечные технологии: наука о мастерстве. – 2010. - № 3(5). – С. 63-67.

*Дадатковая*

1. *Ковенько, Т.С.* Краеведческий библиографический ресурс: проблемы формирования и использования / Ковенько Т. С. // Брэсцкая абласная бібліятэка імя М. Горкага — сацыякультурны і інфармацыйны цэнтр рэгіёна. Да 70-годдзя з дня заснавання : матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі, Брэст, 7–8 красавіка 2010 г. : [зборнік дакладаў / складальнік А. М. Мяснянкіна ; пад агульнай рэдакцыяй Ст. Р. Рачэўскага]. – Брэст, 2010. — С. 37—44.
2. *Сводный* краеведческий каталог библиотек Ростовской области : методические рекомендации для участников корпоративной каталогизации. – 4-е изд, доп. и исправ. [Электронный ресурс]. - Режим доступа: http://metodichka.x-pdf.ru/15kulturologiya/542583-1-svodniy-kraevedcheskiy-katalog-bibliotek-rostovskoy-oblasti-metodicheskie-rekomendacii-dlya-uchastnikov-korporativnoy-k.php.
3. *Стрыжонак, І.М.* Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства : тэксты лекцый / І.М.Стрыжонак, В.І.Саітава [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.buk.by/libbuk/?page_id=34.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## СЕМІНАР
## па тэме “ЭЛЕКТРОННЫЯ КРАЯЗНАЎЧЫЯ ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ РЭСУРСЫ”, 2 гадзіны

1. Метадычныя асаблівасці і тэхналогія БД “Літаратурная карта рэгіёна”.

1.1 Выступленні студэнтаў з прэзентацыямі літаратурных картаў расійскіх бібліятэк.

2. Электронныя ўніверсальныя краязнаўчыя энцыклапедыі: прызначэнне, лічбавы кантэнт, навігацыя, пошук і іншыя асаблівасці.

2.1 Выступленні студэнтаў з прэзентацыямі энцыклапедычных ЭІР расійскіх і беларускіх бібліятэк (Віцебскай АБ “Прыдзвінскі край: гісторыя і сучаснасць”, Магілёўскай АБ “Край мой – Магілёўшчына”, “Пермский край” Пермскай дзяржаўнай краявой бібліятэкі).

3. Краязнаўчыя календары: прызначэнне, аб’екты адлюстравання, спалучэнне розных відаў інфармацыі; рэалізацыя як баз даных і электронных паказальнікаў.

4. Фактаграфічныя базы даных: прызначэнне, тэматыка, асаблівасці фактаграфічных запісаў і інш.

4.1. Выступленні студэнтаў з прэзентацыямі фактаграфічных БД (Магілёўскай АБ “Таленты ад роднай зямлі”, Брэсцкай ЦГБ імя А.С. Пушкіна “Галерея личностей”, Маларыцкай ЦРБ “Улицы нашего города”.

4.2. Рэгіянальны геаграфічны аб’ект у нацыянальнай базе даных аўтарытэтных запісаў.

5. Базы даных тыпу “Установа/арганізацыя ў прэсе”: прызначэнне, абъекты адлюстравання, спалучэнне розных відаў інфармацыі, структураванне кантэнту і іншыя асаблівасці.

5.1 Выступленні студэнтаў з прэзентацыямі рэсурсаў: БД “Политех в прессе” Навуковай бібліятэкі БНТУ; “Публикации о БРНТУ в прессе”.

*Па кожным пытанні і прэзентацыях праводзяцца групавыя абмеркаванні.*

*ЛІТАРАТУРА*

*Асноўная*

1. *Вербицкая, Т. В.* «Литературная карта региона» средствами САБ ИРБИС: миссия выполнима / Т.В. Вербицкая, Г. А. Арноси [Электронный ресурс] – Режим доступа: http://www.gpntb.ru/libcom15/tezis/014.pdf. (Опыт Государственной УНБ Красноярского края, Россия).

2. *Карауш, А.С.* Опыт использования фактографической базы данных «Календарь знаменательных дат» в Томской МИБС / А.С. Карауш, Г.В. Павлюченко [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.gpntb.ru/win/inter-events/crimea2016/disk/051.pdf.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. *Лихимович, О.В.* Электронные краеведческие ресурсы областных библиотек Беларуси кА источник изучения истории и культуры региона / О.В. Лихимович // Бібліятэчнае краязнаўства: прастора вялікіх магчымасцей і перспектыў : зборнік навуковых артыкулаў. – Мінкс, 2013. – С. 158-164. (ч/зала бібліятэкі БДУКМ).
4. *Мальщукова, И.В.* Электронная энциклопедия «Пермский край» и база данных «Афиша культурных событий»: формирование культурного, научного и образовательного потенциала региона / И.В. Мальщукова : [Электронный ресурс]. - Режим доступа: http://infoculture.rsl.ru/RSKD/files_colleg/r_nov/chuv_d12.htm .
5. *Мешачак, Н.А.* Веб-календарь знаменательных дат как средство продвижения библиотечных ресурсов / Н. А. Мешачак, А.С. Карауш [Электронный ресурс]. – Режим доступа : // http://www.gpntb.ru/win/inter-events/crimea2016/disk/052.pdf/
6. *Пермский* край : энциклопедия : [Вступление] : [Электронный ресурс]: Режим доступа: http://www.gorkilib.ru/; пашыраная даведка : http://kpolibrary.ucoz.ru/blog/ehnciklopedija_permskij_kraj/2015-07-20-650.
7. *Сокал, Т.Ф.* Рэгіянальны геаграфічны аб'ект у нацыянальнай базе даных аўтарытэтных запісаў / Т.Ф. Сокал // Бібліятэчнае краязнаўства: прастора вялікіх магчымасцей і перспектыў : зборнік навуковых артыкулаў. – Мінкс, 2013. – С. 205 – 215 (ч/зала бібліятэкі БДУКМ).
8. *Юрик, И.В.* Система «ProБНТУ как способ популяризации научно-технического и творческого потенциала университета»: [Электронный ресурс] - Режим доступа: http://www.ekmair.ukma.edu.ua/bitstream/handle/123456789/8782/Yuryk_Systema_ProBNTU.pdf?sequence=1&isAllowed=y

*Дадатковая*

1. *Илюшина, И.* Интернет и электронные каталоги в информационно-библиографическом обслуживании пользователей библиотек / И. Илюшина // Бібліятэчны свет. – 2015. – № 2. – С. 26-28.
2. *Шатохина, Н. З.* Краеведческие библиографические ресурсы областных библиотек / Н.З. Шатохина // Библиография. – 2008. – № 2. – С. 31-38.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПРАКТЫЧНАЯ РАБОТА
## па тэме "ВЫЗНАЧЭННЕ КРАЯЗНАЎЧАЙ КАШТОЎНАСЦІ ДАКУМЕНТАЎ", 6 гадзін

*Мэта:* Авалоданне методыкай правядзення экспертызы краязнаўчай каштоўнасці дакументаў (КД): не толькі па зместу (агульныя крытэрыі), але і па іншых дапаможных крытэрыях (прыметах).

*Заданне і методыка выканання:* Апытанне студэнтаў аб змесце агульных і дапаможных прымет (крытэрыяў), на падставе якіх камплектатар праводзіць экспертызу краязнаўчай каштоўнасці дакументаў з мэтай адбора дакументаў у краязнаўчы фонд бібліятэкі.

Кожны студэнт практычна праводзіць экспертызу краязнаўчай каштоўнасці 3 – 4 прапанаваных яму дакументаў, пісьмова, у сшытку, вызначаючы кожную з агульных і дапаможных прымет (крытэрыяў) гэтых дакументаў.

Правесці аналіз колькасных характарыстык каштоўнасці краязнаўчых дакументаў з мэтай вызначэння ўзроўня іх краязнаўчай каштоўнасці.

Пры аналізе грунтавацца на наступныя лічбавыя паказчыкі:

-КД, змястоўна звязаны з краем – 100 балаў;

-КД шырокага сацыяльнага прызначэння – 20 балаў;

-КД, функцыянальна прызначаны для вывучэння края – 20 балаў;

-КД, створаны і выдадзены ў краі – 20 балаў;

-КД комплекснага характару – 10 балаў;

-КД, які цалкам прысвечаны краю – 10 балаў;

-КД, створаны мясцовым аўтарам – 5 балаў;

-КД, надрукаваны на дзяржаўнай мове або мове карэннага насельніцтва – 3 бала;

*-КД, дзе супадае час стварэння, выдання і падзеі, якія апіс. у КД – 2 бала*

---

*200 балаў*

Калі КД набраў 200 балаў – гэта ідэальна каштоўны ў краязнаўчым сэнсе дакумент, які неабходна набыць бібліятэцы і які пойдзе ў яе ядро краязнаўчага фонду (КФ).

Калі КД набраў ад 100 да 200 балаў – гэта рэальны аб'ект фарміравання краязнаўчага фонда.

Калі КД ніжэй за 100 балаў – гэта патэнцыяльны аб'ект фарміравання краязнаўчага фонда, экзэмплярнасць якога – мінімальная.

*ЛІТАРАТУРА*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Акулич, С.Н.* О сущности понятия "краеведческий документ" / С.Н. Акулич // Сов. библиотековедение. – 1990. – №4. – С. 4 – 53.
2. *Криворотенко, С.Н.* Краеведческий фонд библиотек: учеб. пособие / С.Н.Криворотенко. – М.: Либерея-Бибинформ, 2005. – 94 с.
3. *Лукашов, И.Б.* Определение краеведческого качества документа / И.Б.Лукашов // Библиотековедение. – 1993. – №3. – С.67 – 75.
4. *Мамонтов, А.В.* Библиотечное краеведение : учеб. пособие. Вып. 2. Краеведческий библиотечный фонд / А.В.Мамонтов. – СПб. : Акад. культуры, 1998. – 38 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРАКТЫЧНАЯ РАБОТА
# па тэме “КАМПЛЕКТАВАННЕ КРАЯЗНАЎЧАГА ФОНДА БІБЛІЯТЭКІ”, 2 гадзіны

*Мэта:* Авалоданне методыкай адбору дакументаў у краязнаўчы фонд бібліятэкі.

*Заданне і методыка выканання: 1. К*ожны студэнт ажыццяўляе адбор дакументаў для бібліятэкі асобнага беларускага рэгіёну ці населенага пункта. Па уласнаму выбару студэнт можа ўмоўна арыентаваць адбор кніг для адной з абласных ці публічных бібліятэк, бібліятэку установ вышэйшай адукацыі і інш. Пералік бібліятэк магчыма выбраць з дапамогай БД “«Библиотеки Республики Беларусь и зарубежных стран» НББ.

2. Студэнт звяртаецца да сайтаў дзяржаўных і недзяржаўных выдавецтваў і кніжных магазінаў (гл. спіс). На сайце кожнага выдавецтва ці магазіна трэба адкрыць каталог выданняў, ці прайс ліст (спіс) новых выданняў і ў першую чаргу звярнуцца да раздзелаў, у якіх найбольш верагодна адлюстраванне краязнаўчых выданняў. Гэта раздзелы навукова-папулярных, навуковых, даведачных, дзіцячых выданняў. Іншыя раздзелы праглядаюцца ў другую чаргу. У кожным раздзеле неабходна ўважліва прагледзець знешняе афармленне выдання і бібліяграфічныя звесткі, уважліва прачытаць анатацыю. Анатацыя можа дапамагчы вызначыць тэрыторыю, аб якой ідзе гаворка, калі назва не раскрывае геаграфічнага аспекта. На сайтах некаторых выдавецтваў інфармацыю аб краязнаўчых кнігах магчыма атрымаць у раздзелах прэс-рэлізаў (напрыклад, “Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі”).

На падставе аналізу неабходна вызначыць:

- ці адпавядае змест выдання выбранай тэрыторыі і бібліятэцы,
- від выдання і якім карыстальнікам адпавядае кніга,
- у якой колькасці экзэмпляраў мэтазгодна набыць выданне для ўмоўна выбранай бібліятэкі.

3. На падставе сабранай інфармацыі рыхтуецца анатаваны спіс кніг (каля 5-7 назваў), якія можа быць аформлены ўпапяровай ці электроннай форме.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Спіс некаторых выдавецтваў

1. Выдавецтва “Адукацыя і выхаванне” (https://aiv.by/prajsy) – раздзел “Книги” (“Научная и научно-популярная литература”, “литература для широкой аудитории”).
2. Выдавецтва “Беларусь” (http://belarusbook.by/news/) – раздзелы: “Каталог”, “Новости”.
3. Выдавецтва “Мастацкая літаратура” (http://mastlit.by) – раздзел “Каталог”.
4. Выдавецтва “Пачатковая школ (http://p-shkola.by/ru/new_url_444155672a”) – раздзел “Книги и наглядные пособия”.
5. Выдавецтва Янушкевіч (https://januskevic.by) – раздзел: “Каталог”.
6. Издательский центр Гродненского государственного университета (ГрГУ) им. Я. Купалы (http://www.izdat.grsu.by/izdaniya/katalog-izdanij.html?showall=&start=4) – раздел “Издания” (“Туризм и гостепреимство и” и др.)
7. Издательство “ПОПУРРИ” (http://www.popuri.ru) – раздел “Каталог”, (“Художественно-документальная проза. Биографии. Истори”).
8. ОАО “БЕЛКНИГА” http://www.belkniga.by” – спісы кніжных магазінаў, пераход па спасылках на асартыменту кніг.

*Іншыя выдавецтвы шукаюцца самастойна.*

### *ЛІТАРАТУРА*

#### *Асноўная*


1. *Библиотечное* краеведение: терминологический словарь / сост. В.С. Крейденко, А.В. Мамонтов. – СПб., 1998. – 85с.
2. *Криворотенко, С.Н.* Краеведческий фонд библиотек : учеб. пособие / С.Н.Криворотенко. – М.: Либерея-Бибинформ, 2005. – 94 с.
3. *Мамонтов, А.В.* Библиотечное краеведение : учеб. пособие. Вып. 2. Краеведческий библиотечный фонд / А.В.Мамонтов. – СПб. : Академия культуры , 1998. – 38 с.


#### *Дадатковая*


1. *Криворотенко, С.Н.* Структурная модель краеведческого фонда библиотек / С.Н.Криворотенко // Інфармацыйныя рэсурсы бібліятэк і іх кадравае забеспячэнне: матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. – Мінск, 2000. – С.54 – 55.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Лабараторная работа
## па тэме "КРАЯЗНАЎЧЫ ДБА БІБЛІЯТЭК", 4 гадзіны

*Мэта*: азнаямленне са складам элементаў КДБА бібліятэк розных тыпаў і відаў.

*Заданне і методыка выканання*: па сайтах абласной, публічнай бібліятэкі і бібліятэкі навучальнай установы выявіць рэсурсы, якія адпавядаюць структурным элементам КДБА. Пазнаёміцца з іх складам, пошукавымі інструментамі, пісьмова выканаць дакладныя апісанні асаблівасцей гэтых рэсурсаў. Работа праводзіцца ў камп'ютарным класе.
Выкладчык размяркоўвае паміж студэнтамі наступныя варыянты :

***Варыянт 1.***

1.1 Магілёўская АБ, Пермская краявая бібліятэка (Расія), Кобрынская ЦРБ, Навуковая бібліятэка БНТУ.

1.2 Пазнаёміцца з віртуальнай службай «Скорая помощь библиографа-краеведа» Дзяржаўная навуковая бібліятэка Краснаярскага края

***Варыянт 2.***

2.1 Віцебская АБ, Алтайская краявая бібліятэка (Расія), Мінская ЦГБ імя Я. Купалы, Навуковая бібліятэка БНТУ.

2.2 Пазнаёміцца з віртуальнай службай "Спроси краеведа" Данской Дзяржаўнай публічнай бібліятэкі.

***Варыянт 3.***

3.1 Мінская АБ, Ленінградская абласная навуковая бібліятэка, Гомельская цэжнтральная гарадская бібліятэка імя А. Герцэна, Навуковая бібліятэка БНТУ.

3.2 Пазнаёміцца з віртуальнай службай "Краеведческая справочная служба" Томскай АБ им. А.С. Пушкина.

***Варыянт 4.***

7.1 Гродзенская АБ; Пінская гарадская цэнтральная бібліятэка, Дзяржаўная навуковая бібліятэка Краснаярскага края, Навуковая бібліятэка Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта.

7.2 Пазнаёміцца з віртуальнай службай "Спроси у краеведа" Ленінградскай абласной універсальнай навуковай бібліятэкі.

Пры адказе на ***першае пытанне варыянтаў*** звярнуць увагу на:

1. Рамяшчэнне элементаў КДБА на сайце бібліятэкі (наяўнасць самастойнага раздзела "Краязнаўства", размяшчэнне элементаў па раздзелах сайта, наяўнасць самастойнага сайта "Краязнаўства".
2. Пералічыць усе элементы КДБА, прадстаўленыя на сайце канкрэтнай бібліятэкі.
3. Даць характарыстыку кожнага асобнага элемента КДБА (напрыклад, краязнаўчага каталога, фактаграфічнай БД і інш.) па звестках на сайце:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- аб’екты ўліку,
- асаблівасці бібліяграфічнай характарыстыкі; індэксаванне (для каталогаў і некаторых БД)
- спалучэнне розных відаў інфармацыі (бібліяграфічнай, фактаграфічнай, паўнатэкставай)
- арганізацыя матэрыялу
- інструменты пошуку і навігацыі і іншыя
- дызайн рэсурса і іншыя даныя.

Пры адказе на ***другое пытанне варыянтаў*** звярнуць увагу на:

1. Асаблівасці функцыянавання віртуальнай даведачнай службы (ВДС)
2. Тыпалогію даведак, якія не выконваюцца ВДС і іншыя звесткі
3. Прагледзець архіў выкананых даведак, звярнуць увагу на суадносін фактаграфічных і бібліяграфічных запытаў.

*ЛІТАРАТУРА*


1. *Илюшина, И.* Интернет и электронные каталоги в информационно-библиографическом обслуживании пользователей библиотек / И. Илюшина // Бібліятэчны свет. – 2015. – № 2. – С. 26-28.
2. *Касінская, А. І.* Забеспячэнне даступнасці краязнаўчых бібліяграфічных інфармацыйных рэсурсаў абласных бібліятэк Беларусі / А. І. Касінская, Н. В. Струц // Бібліятэчнае краязнаўства: прастора вялікіх магчымасцей і перспектыў : зборнік навуковых артыкулаў / Нацыянальная бібліятэка Беларусі ; складальнік Т. В. Кузьмініч. – Мінск, 2013. – С.272-280.
3. *Ковалева А. М.* Краеведческий корпоративный ресурс “Алтайский край» / А.М. Ковалева // Научные и технические библиотеки. – 2012. – № 5. – С. 60-67.
4. *Пермский* край : энциклопедия : [Вступление] : [Электронный ресурс]: Режим доступа: http://www.gorkilib.ru/; пашыраная даведка : http://kpolibrary.ucoz.ru/blog/ehnciklopedija_permskij_kraj/2015-07-20-650.
5. *Юрик, И.В.* Система «ProБНТУ как способ популяризации научно-технического и творческого потенциала университета»: [Электронный ресурс] - Режим доступа: http://www.ekmair.ukma.edu.ua/bitstream/handle/123456789/8782/Yuryk_Systema_ProBNTU.pdf?sequence=1&isAllowed=y.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЛАБАРАТОРНАЯ РАБОТА
# па тэме “АНАЛІТЫКА-СІНТЭТЫЧНАЯ АПРАЦОЎКА КРАЯЗНАЎЧЫХ ДАКУМЕНТАЎ”, 2 гадзіны

*Мэта*: засваенне тэхналогіі аналітыка-сінтэтычнай апрацоўкі краязнаўчай літаратуры.

*Заданне і методыка выканання*: аформіць бібліяграфічныя апісанні краязнаўчых дакументаў розных відаў, падрыхтаваць рэкамендацыйную і даведачную анатацыі на краязнаўчыя дакументы, праіндэксаваць іх паводле “Тыпавой схемы класіфікацыі дакументаў для краязнаўчых каталогаў (картатэк) бібліятэк Беларусі”, вызначыць ключавыя словы і прадметныя рубрыкі.

*Выкананне:* студэнты выбіраюць для анатавання артыкулы з беларускіх часопісаў і газет, дакументы са зборнікаў і кнігі (фонд бібліятэкі). Кожны студэнт рыхтуе 2 бібліяграфічных апісанні і анатацыі, у т.л. 1 рэкамендацыйную, 1 даведачную.

Перад выкананнем работы характэрызуюцца асноўныя відавыя (функцыянальныя, змястоўна-структурныя, моўныя) асаблівасці рэкамендацыйных і даведачных анатацый. Звяртаецца ўвага на важнасць і асаблівасці адлюстравання ў анатацыях на краязнаўчую літаратуру тапанімічных звестак (назваў населеных пунктаў, адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, геаграфічных аб 'ектаў і інш., зместа падзей, часу, звестак аб асобах); ілюстрацыйнага матэрыялу (карт, планаў, партрэтаў і інш).

